Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 МАЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 86
(26199)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

У дзяржаўнай сімволіцы нашай краіны ўвасоблены прыхільнасць беларусаў да стваральнай працы і сацыяльнай справядлівасці. Таму сённяшняе свята без сумнення можна прылічыць да дат, якія аб'ядноўваюць нацыю, выяўляюць сілу духу і характар народа.

Беларускія герб і сцяг карыстаюцца заслужанай павагай у любым кутку зямнога шара.

З гэтымі выразнымі і дакладнымі сімваламі суверэнная Беларусь дабіваецца ўражальных поспехаў у эканоміцы, сацыяльнай сферы, навуцы, культуры і спорце.

Нам трэба жыць і працаваць так, каб дзеці і ўнукі маглі ганарыцца дасягнутымі перамогамі і поспехамі, а пасля дастойна прадоўжылі агульную справу ўмацавання нашай дзяржавы, прымножыўшы яе славу і магутнасць.

Ад усёй душы жадаю вам шчасця, міру і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Завяршыць рэстаўрацыю палацава-паркавага ансамбля ў Нясвіжы да мая 2010 года

Такія тэрміны Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вызначыў, наведваючы гэты архітэктурны помнік.

У 2007 годзе здадзены ў эксплуатацыю першы пускавы комплекс палацава-паркавага ансамбля, а менавіта ўязная брама, галерэі, мост, вежа.

Аляксандр Лукашэнка выказаў вялікае незадавальненне тым, што аб'ект да гэтага часу закрыты для наведвальнікаў. Ён падкрэсліў, што дзяржава можа аддаць усе грошы, прадугледжаныя на рэстаўрацыю аб'екта, непасрэдна. «Наймайце каго хочаце, хоць прыватніка. Калі падыдзеце да гэтага па-гаспадарску і эканоміце сродкі, то тымі, што застануцца, зможаце распарадзіцца ў сябе ў раёне самі», — дадаў Прэзідэнт. Па яго патрабаванні, праз тыдзень наконт гэтага павінна быць унесена ўзгодненае рашэнне губернатара Мінскай вобласці, старшыні Нясвіжскага райвыканкама і генеральнага падрадчыка. «Збярыцеся ўтраіх і прыміце рашэнне. Але да мая 2010 года тут усё павінна быць ідэальна», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама адзначыў, што неабходна больш прыцягваць прыватныя арганізацыі, якія за меншы кошт могуць якасна выканаць неабходныя работы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, неабходна з розумам падыходзіць да рэстаўрацыі гісторыка-культурных аб'ектаў. «Калі няма чаго рэстаўраваць, то і не трэба. Давайце абгародзім руіны і будзем іх у такім выглядзе паказваць турыстам», — сказаў Прэзідэнт.

У Беларусі ў бліжэйшы час неабходна аптымізаваць структуру сельскагаспадарчых арганізацый. Такое даручэнне даў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, наведваючы Нясвіжскі філіял Мінскага племпрадпрыемства.

«Я ўжо даручаў упарадкаваць структуру ў сельскай гаспадарцы. Тут нагарадзілі столькі ж, як і ў сістэме адукацыі. Неабходна разабрацца, выключыць прамежкавыя звёны, перагледзець колькасць працуючых», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што добрыя спецыялісты павінны працаваць непасрэдна на месцах.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што племянной жывёлагадоўлі павінна ўдзяляцца не менш увагі, чым вяртанню зямель у севазварот. «Трэба ўлічваць, што ў свеце племянная жывёла каштуе дорага. Развіццё племянной справы — гэта вялікая перспектыва. Таму сюды неабходна накіраваць столькі грошай, колькі спатрэбіцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. На думку Прэзідэнта, якасны генетычны матэрыял, што атрымліваецца ў Беларусі, можа экспартавацца.

Прэзідэнт адзначыў, што ў рэспубліцы не павінны ўшчамляцца правы сялян, іх інтарэсы ва ўмовах растучых сусветных цэнаў на сельскагаспадарчую прадукцыю. «Грошы ад рэалізацыі сельгаспрадукцыі не павінны асядаць у перапрацоўчых арганізацый. Перш за ўсё, іх павінны атрымліваць сяляне», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на тое, што пры вырашэнні праблемных пытанняў у сельскай гаспадарцы павінны максімальна здымацца бюракратычныя перашкоды.

Закрануўшы пытанне вяртання зямель у севазварот, Прэзідэнт сказаў, што неабходна выкарыстоўваць інтэнсіўны спосаб вядзення сельскай гаспадаркі. «Пры нашых тэхналогіях вытворчасці мы павінны атрымліваць у два разы больш прадукцыі, чым у часы Савецкага Саюза, за кошт інтэнсіўнага, а не экстэнсіўнага вядзення гаспадаркі. Ва ўмовах сусветнай канкурэнцыі, што ўсё больш узмацняецца, нам неабходна ўжо цяпер пачынаць дзейнічаць. У нас няма іншага шляху. Мы павінны апярэдзіць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар таксама дадаў, што «ў свой час шмат было скептыкаў, калі я ўзяўся за сельскую гаспадарку, але сёння вы бачыце вынік».

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Д. Мядзведзева і У. Пуціна з заняццем пасад

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева і Старшыню Урада Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна з заняццем пасад.

«Дзякуючы палітычнаму і сацыяльна-эканамічнаму курсу, што праводзіцца апошнім часам, Расія заявіла пра сябе як пра моцную дзяржаву, якая можа паслядоўна адстойваць нацыянальныя інтарэсы, забяспечваць дастойнае жыццё сваіх грамадзян. Дасягненню гэтых мэтаў будзе ў поўнай меры садзейнічаць далейшае развіццё інтэграцыйных працэсаў паміж нашымі краінамі. Рэспубліка Беларусь гатова да прадаўжэння канструктыўнага дыялога па ўсіх аспектах міждзяржаўных адносінаў. Карыстаючыся выпадкам, хачу запэўніць, што Вы заўсёды будзеце жаданым госцем на беларускай зямлі», — гаворыцца ў віншаванні, накіраваным у адрас Дзмітрыя Мядзведзева.

У віншаванні Уладзіміру Пуціну Прэзідэнт Беларусі, у прыватнасці, адзначыў: «Не сумняваюся, што Ваша стваральная дзейнасць і ў далейшым будзе служыць інтарэсам простых расіян, усямерна садзейнічаць умацаванню дзяржаўнасці і адзінства расійскага грамадства. Хацеў бы выказаць словы шчырай удзячнасці за сумесную канструктыўную работу па развіцці беларуска-расійскіх адносінаў. Сканцэнтраваўшы свае намаганні на значных пытаннях, мы ў любой сітуацыі знаходзілі ўзаемапрымальны кампраміс. Я спадзяюся на далейшае плённае супрацоўніцтва і заўсёды буду рады кожнай нашай сустрэчы».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

15 мая 2008 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу дзесятая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ ЗРОБІЦЬ УСЁ ДЗЕЛЯ ТАГО, КАБ ГЭТУ ПЕРАМОГУ НЕ ЗАБЫЛІ»

9 мая Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка традыцыйна ўзяў удзел у святочным шэсці ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, прымеркаваным да Дня Перамогі. Асаблівасцю ж сёлетняга ўрачыстага мерапрыемства стала тое, што частка ветэранаў з Кастрычніцкай плошчы ў Мінску да плошчы Перамогі перамяшчалася ў калоне на 12 аўтамабілях «УАЗ»: пасля доўгачаканай капітуляцыі фашыстаў мінула больш за шэсць дзесяткаў гадоў і ўжо нагадвае аб сабе сталы ўзрост герояў вайны.

Кіраўнік краіны ўзначальваў шэсце, у якім удзельнічала каля 6 тысяч чалавек. Пасля таго, як да манумента Перамогі былі ўскладзены вянкі і кветкі, Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да ветэранаў, суайчыннікаў і замежных гасцей з прамовай. У прыватнасці, беларускі лідар адзначыў, што Дзень Перамогі — дарагое і блізкае кожнаму свята. 63 гады таму народам Савецкага Саюза ўдалося адстаяць не толькі ўласную свабоду, але і выратаваць жыхароў Еўропы і свету ад прыгнятання і фізічнага знішчэння ў газавых камерах, канцлагерах і гета, вызваліць свет ад карычневай чумы. Прычым, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, наш народ ніколі не дзяліў гэту перамогу на сваю і чужую. «Мы заўсёды будзем помніць дапамогу саюзнікаў — краін антыгітлераўскай кааліцыі, удзельнікаў Супраціўлення, усіх, хто змагаўся з нацызмам», — заявіў Прэзідэнт.

Аднак нагадаў кіраўнік дзяржавы і пра тое, што самыя рашучыя падзеі, якія вызначылі вынік вайны, адбыліся на тэрыторыі СССР: менавіта тут гітлераўцы спатыкнуліся, а затым і павярнулі назад.

І як ужо не раз было ў гісторыі, Беларусь стала краінай, якая першай прыняла на сябе ўдар захопнікаў, «стала жывым шчытом на іх шляху, сарваўшы планы маланкавай вайны», — заўважыў Прэзідэнт. Мужна змагаючыся з ворагам, Беларусь панесла найбольшы ўрон сярод усіх савецкіх рэспублік. Дастаткова нагадаць сумна вядомы ўсім жыхарам нашай краіны факт, што падчас Вялікай Айчыннай загінуў кожны трэці беларус. Прыгадаў Прэзідэнт і тое, што больш за 800 тысяч салдат і афіцэраў з Беларусі загінулі на фронце. Фашысты знішчылі больш за 2 мільёны 200 тысяч жыхароў нашай краіны, звыш 380 тысяч выгналі ў рабства. Акупанты поўнасцю разбурылі больш за 5 тысяч населеных пунктаў, у тым ліку 209 гарадоў і пасёлкаў, 628 вёсак былі спалены дашчэнту разам з жыхарамі. «Мы ніколі не забудзем, якімі ахвярамі аплачана наша Перамога. І кожны год 9 мая будзем смуткаваць аб загінулых, памятаючы аб вайне, якая заклікае да нашага розуму», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, прапанаваўшы ўшанаваць памяць усіх герояў і мучанікаў вайны мінутай маўчання.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што паўтарэння падобных да мінулай вайны трагедый неабходна ўсімі магчымымі сродкамі не дапусціць. «На жаль, XXI стагоддзе не прынесла чалавецтву збаўлення ад вайны. Сутнасць узброеных канфліктаў радыкальна трансфармавалася, аднак ад гэтага яны не сталі менш разбуральнымі і гібельнымі», — зазначыў ён. Акрамя таго, Прэзідэнт назваў шэраг фактараў, якія здольны прывесці да ўспышкі новага сусветнага пажару. Да прыкладу, на планеце накоплены вялікія арсеналы ядзернай і іншых відаў зброі масавага знішчэння. Больш за тое, паводле яго слоў, асобныя краіны, якія ўявілі сабе, што яны звышдзяржавы, дазваляюць сабе ўмешвацца ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў, а ў якасці апошняга аргумента выкарыстоўваюць ваенную сілу. Нагадаў беларускі лідар і аб узрастаючай актыўнасці блока НАТА: «У яго шэрагі ўцягваюцца новыя члены з ліку былых сацыялістычных дзяржаў. У цэнтры Еўропы размяшчаюцца элементы амерыканскай стратэгічнай супрацьракетнай абароны». Нехта, заўважыў Прэзідэнт, спрабуе перагледзець і вынікі Другой сусветнай вайны, перакроіць карту Еўропы. Прычым, на вялікі жаль, незалежная Беларусь сёння таксама адчувае на сабе пэўны ціск з боку нядобразычліўцаў. Інакш як патлумачыць тое, што і ў дачыненні да нашай рэспублікі не раз рабіліся спробы дыктату і эканамічнага шантажу. «Але ніхто і нішто не прымусіць нас збочыць з выбранага шляху, падпарадкавацца чужой волі», — запэўніў прысутных Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт у чарговы раз падкрэсліў, што Беларусь будуе сваю палітыку на праве кожнай з дзяржаў самастойна выбіраць свой шлях развіцця, на даверы і пошуку цывілізаванай перспектывы для ўсіх народаў. Што ж датычыцца непасрэдна нашай краіны, то ў ёй забяспечаны мір, стабільнасць і бяспека. «Так будзе і надалей: Узброеныя Сілы Беларусі стаяць на варце межаў Айчыны», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Па заканчэнні ўрачыстай цырымоніі Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні журналістаў, яшчэ раз зазначыў, што Беларусь ніколі не імкнулася падзяліць перамогу ў вайне, а таму нашы людзі бясспрэчна ўдзячны саюзнікам па антыгітлераўскай кааліцыі. Разам з тым, ён выказаў надзею на тое, што ўсе будуць памятаць і аб тым, што ўсё ж такі галоўная роля ў разгроме фашызму — менавіта за савецкім народам. Гаворачы аб традыцыі святкавання Дня Перамогі і Дня Незалежнасці, Прэзідэнт падкрэсліў, што так будзе заўсёды. «Беларусь зробіць усё дзеля таго, каб гэту Перамогу не забылі, каб нікому не ўдалося перапісаць гісторыю. Мы будзем захоўваць гэты набытак», — сказаў ён. Па словах лідара краіны, беларусы паказваюць усяму свету, што працягваюць шанаваць праўду аб вайне. У гэтым напрамку, лічыць Аляксандр Лукашэнка, мы будзем рухацца і надалей. «І будзем рабіць усё магчымае, каб захаваць памяць беларускіх пакаленняў аб подзвігах тых, хто паклаў сваё жыццё на алтар Вялікай Перамогі», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У СЯРЭДЗІНЕ ТЫДНЯ РЭЗКА ПАХАЛАДАЕ

У сераду і чацвер у Беларусі рэзка пахаладае, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік сектара доўгатэрміновых прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Ларыса Санкевіч. Ноччу на большай частцы тэрыторыі рэспублікі чакаюцца замаразкі ад нуля да мінус 4 градусаў, у нізкіх месцах на глебе — да мінус 5—7. Днём тэмпература паветра не перавысіць 9—16 цяпла. У канцы тыдня тэмпература паветра пачне паступова павышацца, хоць ноччу 16 і 17 мая на поўначы краіны яшчэ захаваюцца слабыя замаразкі ад нуля да мінус 2. У нядзелю ноччу будзе ўжо 5—11 цяпла, а максімальная тэмпература днём будзе вагацца ад 14—20 цяпла на ўсходзе да плюс 21—23 на поўдні.

БЕЛАРУСКІЯ ПАМЕЖНІКІ ЗАТРЫМАЛІ РАСІЯНІНА, ЯКІ 12 ГАДОЎ ЗНАХОДЗІЎСЯ Ў МІЖНАРОДНЫМ ВЫШУКУ

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, падазроная асоба была выяўлена ў Воранаўскім раёне, у памежнай зоне. Пасля затрымання высветлілася, што гэты грамадзянін Расіі, цыган па нацыянальнасці, здзейсніў на тэрыторыі РФ шэраг злачынстваў: хуліганства, рабаўніцтва, нанёс цяжкія цялесныя пашкоджанні, у выніку якіх пацярпелы памёр. З 1996 года гэты ўцякач адшукваўся праваахоўнымі органамі. Апошнія 10 гадоў ён хаваўся ў Беларусі пад чужым прозвішчам.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

«СТРАТЫ» ПАСЛЯ СУБЯСЕДАВАННЯ СКЛАЛІ МЕНШ ЧЫМ 1 ПРАЦЭНТ

Папярэднія вынікі прайшоўшага ў беларускіх ВНУ прафесійна-псіхалагічнага субяседавання журналісту «Звязды» агучыла кансультант упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Марыя Карпенка.

Няўдача на папярэднім прафадборы спасцігла крыху менш як 140 чалавек, што складае менш чым 1 працэнт ад агульнай колькасці прэтэндэнтаў. Нагадаем, што агульная колькасць рэгістрацый склала 15 364. Праўда, знайшліся асабліва прадпрымальныя маладыя людзі, якія вырашылі «падстрахавацца» і зарэгістраваліся для праходжання субяседавання па адной групе спецыяльнасцяў два, тры і нават чатыры разы ў розных ВНУ. Некаторыя абітурыенты рэгістраваліся для праходжання прафесійна-псіхалагічнага субяседавання па розных групах спецыяльнасцяў, што не забараняецца дзеючымі Правіламі прыёму ў ВНУ. Такім чынам прайсці прафадбор планавалі 14 132 фізічныя асобы. Але 1100 чалавек на субяседаванне так і не з'явіліся.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне праводзілася адразу па чатырох групах спецыяльнасцяў, і дзе з улікам вялікага наплыву абітурыентаў давялося сфарміраваць аж 33 (!) камісіі, у выдачы рэкамендацыі было адмоўлена ўсяго 8 чалавекам. У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, дзе субяседаванне праходзілі жадаючыя паступаць на групу спецыяльнасцяў «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і права» і «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» рэкамендацыі для паступлення не змаглі атрымаць 18 чалавек, а ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на тую ж групу спецыяльнасцяў не атрымалі рэкамендацыі 16 чалавек.

Цікава, што ў Міжародным інстытуце працоўных і сацыяльных адносінаў не змаглі прайсці субяседаванне 28 чалавек.

— Некаторыя абітурыенты, напэўна, меркавалі, што стаўленне да іх у прыватнай ВНУ будзе больш лаяльнае, і атрымаць рэкамендацыю там будзе прасцей, чым у дзяржаўных ВНУ, — падзялілася сваімі думкамі з журналістам «Звязды» Марыя Карпенка. — Аднак, калі малады чалавек, у якога пытаюцца, якія газеты ён чытае, можа ўзгадаць толькі газету «З рук у рукі» і не можа назваць больш ніякіх, нават рэспубліканскіх, выданняў, напэўна, яму яшчэ рана адпраўляцца па дыплом аб вышэйшай адукацыі, а трэба паклапаціцца найперш аб развіцці свайго кругагляду.

У Міністэрства адукацыі не паступіла ніводнай скаргі ад тых, каму ў выдачы рэкамендацыі было адмоўлена. Ва ўсіх выпадках члены камісій аргументавалі ў пратаколах прычыну сваёй адмовы і тлумачылі абітурыентам сваё рашэнне. У наступным годзе тыя, каму на субяседаванні не пашанцавала, зноў змогуць яго прайсці, але ўжо з улікам сёлетняга негатыўнага вопыту.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СМЯРОТНАЯ ПАРА

У мінулую суботу ў лазні дачнага дома былі знойдзены нежывымі мужчыны 41 і 38 гадоў. Здарэнне адбылося паблізу вёскі Юхнаўка, што ў Мінскім раёне. Няшчасных знайшлі каля а паловаы шостай раніцы. Як высветлілася, непрацуючы, а таксама рабочы аднаго з прадпрыемстваў сталі ахвярамі чаду.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства незавершенного строительством садового домика и земельного участка пл. 0,0730 га в садоводческом товариществе «Ручьи» Минского р-на. Начальная цена снижена на 10 % и составляет 27 789 300 бел. руб. **Аукцион состоится 28.05.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27.05.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

Совместное общество с ограниченной ответственностью «БРИМСТОН-БЕЛ»

ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРСНЫЕ ТОРГИ

на выбор генерального подрядчика по строительству производственной базы по производству торгового холодильного оборудования на землях Администрации СЭЗ «Минск» п. Шабаны.

Получить конкурсную документацию и ознакомиться с проектом можно по адресу ул. Селицкого, 21, корп. 2 комн. 18 (4-ый этаж) в рабочие дни с 10.00 до 15.00.

Контактное лицо Крученок Игорь Владимирович
тел. 345 59 90, 344 55 92, факс 344 75 79.

Окончательный срок подачи конкурсных предложений 18.06.2008 г.

УНН 800014157

Смиловичский поселковый исполнительный комитет Червенского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов: два участка в д. Журавковичи по ул.Северная, площадью 0,1349 га и 0,1558 га, начальная цена – 4 500 000 белорусских рублей каждый; два участка в г.п. Смиловичи по ул. Солнечная, площадью 0,1450 га и 0,1502 га, начальная цена – 4 000 000 белорусских рублей каждый. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения. Залог в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за земельный участок должна быть произведена в течение 8 рабочих дней после утверждения протокола. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 17.06.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.06.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания склада (об. пл. 463,4 кв.м), расположенного: Пуховичский район, г.п. Руденск, ул. Железнодорожная, 3. Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 123 900 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка – 0,0723 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.01.2008 г. Аукцион состоится **30 мая 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29 мая 2008 г**. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by. УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства недвижимого имущества в составе: здание конторы (2-этажное кирпичное здание), об. пл. 378,0 кв.м, котел отопительный (инв. № 11-036); здание гаражей и склада, об.пл. 129,5 кв.м; здание гаража об. пл. 163,7 кв.м, расположенные по адресу: г. Молодечно, ул. Виленская, д. 24. Начальная цена – 207 241 808 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 17 июня 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 16 июня 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Филиалу «Нарцизово» ЗАО «Витебскагропродукт»

ТРЕБУЕТСЯ НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ

ГЛАВНЫЙ ЭНЕРГЕТИК

должностной оклад — 1 000 000 рублей.
Предоставляется благоустроенная трехкомнатная квартира (природный газ, центральное отопление).

На территории поселка имеется средняя школа, детский сад-ясли, торговый центр, почта, сберкасса.

Поселок расположен рядом с автомагистралью Москва — Брест, имеется остановочный пункт электропоездов направления Минск — Орша.

Телефон для справок: 8 02136 27657, т./ф. 8 02965 22821.

УНН 300561762

МАЙСКІЯ ВЯСЕЛЛІ: ЛЮБІЦЦА АЛЬБО «МАЯЦЦА»?

Народ прыдумаў, што жаніцца ў маі — усё жыццё «маяцца»

Вяскоўцы яшчэ кажуць, што добрыя людзі ў маі не жэняцца — працуюць: стары ўраджай з'елі — новых харчоў няма, затое хапае працы на полі. Ёсць нават больш суровыя папярэджанні пра страту здароўя і дзяцей. Аднак ці апраўдвае сябе ў рэальным жыцці дрэнная рэпутацыя самага прыгожага веснавога месяца?

ПАРКАЛЁВАЕ ВЯСЕЛЛЕ

...Яна стаяла на прыпынку і курчылася ад халоднага лістападаўскага ветру. Тралейбусы ўзялі і зніклі з прасторы, а тут проста цудам спыняецца аўтамабіль, з якога выходзіць прыгожы мужчына і прапануўвае свае транспартныя паслугі. І ўсё гэта галантна, нібыта як у старамоднай кінастужцы.

Шчырыя кампліменты растапілі лёд недаверу, маладыя людзі пазнаёміліся, размову працягнулі ў цёплым кафэ і больш не расставаліся. Наташа і Ігар пажаніліся год таму ў маі, цяпер у іх нарадзіўся сын Іван.

— І нічога мы не «маемся»! — запэўніла маладая маці. — Я, калі шчыра, прымхлівы чалавек, але забабону пра вяселле ў маі абсалютна не прызнаю. Усё з дакладнасцю наадварот: добра жаніцца, калі прырода расцвітае і нібыта нанова пачынаецца жыццё.

(Заканчэнне на 3-й стар.)



Прэзідэнт Беларусі павіншаваў лідараў краін СНД з нагоды Дня Перамогі

«У гісторыі нашых краін няма больш значнай падзеі, чым Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, — гаворыцца ў віншаванні прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Дзмітрыю Мядзведзеву. — У тыя суровыя гады беларусы і расіяне ў адзіным страі ўзняліся на барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, адстаялі права на жыццё для сябе і будучых пакаленняў».

У віншавальных пасланнях у адрас прэзідэнтаў Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана, Туркменістана, Узбекістана, Украіны Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ва ўдзячнай памяці патомкаў назаўсёды застанецца подзвіг бацькоў і дзядоў, якія плячо ў плячо змагаліся ў смяротнай схватцы з фашызмам. Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама накіраваў віншаванні Уладзіміру Пуціну, Сяргею Міронаву, Барысу Грызлову, Паўлу Барадзіну, Барысу Громаву, Яўгену Прымакову, Юрыю Лужкову, Сяргею Лаўрову, Патрыярху Аляксію II.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Нарматыўны тэрмін адключэння гарачай вады ў Мінску будзе перавышаны на 11 участках

Ён складзе ад 18 да 21 дня.

БЕЛТА.

Лабавое сутыкненне

Чацвёра чалавек апынуліся ў бальніцы пасля таго, як вадзіцель аўтамабіля «Хюндай» выехаў на паласу сустрэчнага руху на дарозе паблізу вёскі Мачуліна Ваўкавыскага раёна. Вадзіцель загінуў.

Ігар ГРЫШЫН.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 13.05.2008 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 137,00
1 еўра	3 291,62
1 латвійскі лат	4 717,96
1 літоўскі літ	953,32
1 чэшская крона	131,21
1 польскі злоты	971,39
1 расійскі рубель	89,67
1 украінская грыўня	445,44

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
USD	23,8328
10 UAH	47,9890
1000 BYR	11,1355
EUR	36,6715
Курс у гандлёвых кампаніях (на 12.05.2008 г.)	
USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГЗ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

У Белавежскай пушчы неабходна больш актыўна развіваць турыстычную інфраструктуру

Адпаведную задачу паставіў 11 мая Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы ў ходзе рабочай паездкі па рэгіёнах краіны дзяржаўную прыродаахоўную ўстанову «Нацыянальны парк «Белавежская пушча».

Белавежская пушча — адзін з самых буйных лясных масіваў Еўропы, які захаваўся практычна ў некранутым стане да нашага часу. Яе тэрыторыя падзелена дзяржаўнай граніцай на дзве часткі — беларускую і польскую. З беларускага боку пушча займае больш як 150 тыс.га. Цяпер пушча адноўлена ў межах 1760 года. Сёння гэта візітная картка рэспублікі і нацыянальны парк, які найбольш наведваецца іншаземцамі.

Сярэдні ўзрост насаджэнняў пушчы складае 83 гады, у той час як у цэлым у Беларусі — 51 год. У беларускай частцы пушчы знаходзяцца 18 самых старых дрэў Еўропы.

У 1992 годзе Белавежская пушча была прызнана ЮНЕСКА аб'ектам Сусветнай спадчыны чалавецтва, а ў 1993 годзе ёй быў прысвоены статус біясфернага запаведніка. У 1997 годзе Савет Еўропы прысудзіў пушчы Еўрапейскі дыплом для ахоўных прыродных тэрыторый.

Кіраўнік дзяржавы быў праінфармаваны аб выкананні раней дадзеных даручэнняў па развіцці нацыянальнага парку і экатурызму. Прэзідэнту было даложана аб мерах, што прымаюцца па захаванні фаўны і рэліктавых лясоў, выратаванню ляснога масіву ад насякомых-шкоднікаў і хваробаў драўніны. Паводле слоў генеральнага дырэктара нацыянальнага парку Мікалая Бамбізы, удалося лакалізаваць жукоў-караедаў і істотна скараціць плошчы пашкоджанага лесу.

У Белавежскай пушчы актыўна праводзяцца мерапрыемствы па аднаўленні лясных насаджэнняў, якія пацярпелі ад урагану некалькі гадоў таму.

Аляксандр Лукашэнка даручыў кіраўніку спраў Прэзідэнта Мікалаю Дамашкевічу і кіраўніцтву парку прадоўжыць работы па навядзенні парадку на тэрыторыі пушчы.

Затым Аляксандр Лукашэнка пабываў у рэзідэнцыі беларускага Дзеда Мароза. Сядзіба працуе круглы год, і тут пабывалі дзесяткі тысяч дзяцей і дарослых. Тут кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з падрыхтоўкай да святкавання 600-годдзя ўстанаўлення запаведнага рэжыму Белавежскай пушчы, якое будзе адзначацца ў 2009 годзе. Аргкамітэт па святкаванні гэтай даты ўзначальвае кіраўнік спраў Прэзідэнта Мікалай Дамашкевіч.

Планам падрыхтоўкі прадугледжваецца развіццё інфраструктуры, будаўніцтва новых аб'ектаў у пушчы, уключаючы эколага-асветны цэнтр, рэканструкцыя вальераў для жывёл, будаўніцтва і рамонт дарог. У пушчы хутка з'явяцца снежныя гарматы. Плануецца, што ў развіццё нацыянальнага парку будзе ўкладзена амаль Br70 млрд.

Аляксандр Лукашэнка прайшоў па тэрыторыі парку і пагутарыў з турыстамі з Беларусі, Расіі і Германіі.

Прэзідэнт застаўся задаволены ўбачаным. У адрозненне ад многіх краін Беларусі ўдалося захаваць свае запаведныя лясы.

Нацыянальны парк «Белавежская пушча» дэманструе стабільны рост асноўных фінансава-эканамічных паказчыкаў. У прыватнасці, растуць прыбытак і аб'ём аказаных паслуг. Назіраецца ўстойлівая дынаміка павелічэння колькасці турыстаў, якія наведваюць нацпарк: калі ў 2001 годзе ў Белавежскай пушчы пабывалі 55,3 тыс. чалавек, то ў 2007 годзе — ужо амаль 190 тыс. наведвальнікаў з 76 краін свету.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў населеных пунктах на тэрыторыі пушчы неабходна больш актыўна ствараць турыстычныя аб'екты.

Таксама Прэзідэнт закрануў тэму канчаткавага вырашэння праблем, звязаных з закупкай у насельніцтва садаводчай прадукцыі і яе перапрацоўкай. «Ужо цяпер трэба разгледзець пытанне закупкі ў насельніцтва грыбоў, яблыкаў і пры неабходнасці набыць новыя лініі па перапрацоўцы, каб максімальна забяспечыць насельніцтва сокам з уласнай садаводчай прадукцыі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў Белкаапсаюзу і ўраду трымаць пад кантролем вырашэнне гэтых пытанняў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі аб'явіла конкурс на суісканне прэмій

Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў аддзеле прэмій і стыпендый акадэміі.

У конкурсе могуць прыняць удзел вучоныя — грамадзяне Беларусі, калектывы вучоных (не больш за тры чалавекі), якія апублікавалі вынікі праведзеных даследаванняў у манаграфіях або цыклах артыкулаў у вядучых навуковых часопісах краіны. Гэта могуць быць як вучоныя з вялікім вопытам работы, так і маладыя вучоныя і студэнты.

«Вылучаная на суісканне прэміі НАН Беларусі работа павінна быць выканана і апублікавана ў асноўным на працягу апошніх пяці гадоў, — адзначылі ў акадэміі. — Дапускаецца ўключэнне ў цыкл больш ранніх, найбольш важных і тэматычна звязаных з работай публікацый. Рукапісы дысертацыйных работ на конкурс не прымаюцца».

Удзельнікі конкурсу могуць прэтэндаваць на 14 прэмій НАН Беларусі ў памеры 180 базавых велічынь кожная; 7 прэмій НАН Беларусі імя акадэміка В.Ф. Купрэвіча для маладых вучоных у памеры 60 базавых велічынь кожная; 7 прэмій НАН Беларусі імя акадэміка В.Ф. Купрэвіча для студэнтаў у памеры 40 базавых велічынь кожная.

Работы з надпісам «На суісканне прэміі НАН Беларусі 2008 года» прымаюцца да 1 кастрычніка ў Камісію па прэміях Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па адрасе: 220072, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 66, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, каб. 446. Пераможцы будуць вядомы ў лістападзе.

Конкурс на суісканне прэмій НАН Беларусі праводзіцца кожны нясцотны год. У гэтым годзе ён пазачарговы і прымеркаваны да 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якое будзе адзначацца ў снежні 2008 — студзені 2009 года.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АЗНАЁМІЎСЯ З ПРАЕКТАМІ ЗАБУДОВЫ БЕЛАРУСКАЙ СТАЛІЦЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 мая азнаёміўся з праектамі забудовы беларускай сталіцы.

У прыватнасці, увазе Прэзідэнта былі прадстаўлены праектныя прапановы адкрытага міжнароднага конкурсу на лепшую архітэктурную канцэпцыю забудовы тэрыторыі, якая прылягае да будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

На конкурс было пададзена 13 праектаў, у распрацоўцы якіх прынялі ўдзел 12 арганізацый як беларускіх, так і буйных міжнародных праектных структур з Вялікабрытаніі, Канады, Францыі, Славакіі, ЗША. Яго вынікі будуць падведзены праз тыдзень-два.

Плошча тэрыторыі, прапанаванай для забудовы, складае 34 га. Абавязковая ўмова конкурсу — стварэнне сучаснага горадабудаўнічага ансамбля ў кампазіцыйнай увязцы з комплексам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, паркавай зонай і праспектам Незалежнасці.

Беларускія праекціроўшчыкі прапанавалі стварыць у гэтым раёне Мінска асветны і забаўляльны комплекс «Каўчэг сусветных культур», асновай якога будзе кліматпарк з прыроднымі ландшафтамі ўсяго свету, а таксама будуць пабудаваны кварталы ў архітэктурных стылях розных краін.

Асноўнай ідэяй франка-славацкага праекта з'яўляецца стварэнне пешаходных вуліц і водных каналаў, па якіх можна перамяшчацца на шлюпках, лодках і гандолах.

Канцэпцыя яшчэ аднаго беларускага праекта прадугледжвае будаўніцтва комплексу ў вобразе белай лілеі, у цэнтры яго размесціцца гасцінічны комплекс.

Архітэктары з Вялікабрытаніі прадстаўляюць аблічча гэтага раёна як «Усходняга маяка Мінска», сутнасць яго заключаецца ў стварэнні трох буйных горадабудаўнічых ансамбляў, якія прамяніві ідуць ад Нацыянальнай бібліятэкі, паміж імі размесцяцца паркі.

Прэзідэнт звярнуў увагу сталічных уладаў на неабходнасць рацыянальнага выкарыстання ўсёй тэрыторыі, якая прапануецца для забудовы. «Усё павінна быць функцыянальна. Ніякіх пустых «плям» быць не павінна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Фота БЕЛТА.

Дзелячыся ўражаннямі ў цэлым ад убачанага, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што з'яўляецца прыхільнікам класіцызму. «Але тут, напэўна, павінны быць сучасныя аб'екты ў стылі хай-тэк. Пры гэтым не трэба павялічваць цану будаўніцтва залішнімі складанасцямі», — дадаў ён.

На думку Прэзідэнта, новыя збудаванні павінны не толькі ўпрыгожыць аблічча сталіцы, але і стаць своеасаблівымі ўсходнімі варотамі Мінска.

Аляксандр Лукашэнка ў размове са сталічнымі ўладамі звярнуў увагу на неабходнасць вырашэння праблемы з недахватам даступных аўтастаянак у Мінску. Прычым зрабіць гэта трэба, паводле яго слоў, у сціслыя тэрміны.

«Чаму мы сёння не ствараем стаянкі для асабістага аўтатранспарту людзей? Гэта пытанне трэба абавязкова вырашаць, неабходна разгружаць двары, прыводзіць у парадак дваровыя тэрыторыі, рабіць іх больш бяспечнымі для дзяцей», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Мы замахнуліся на буйныя праекты, а элементарныя пытанні не вырашаем. Ёсць свабодныя пляцоўкі, пустэчы, абгарадзіце іх і дайце магчымасць людзям размясціць аўтамабілі на ахоўнай стаянцы за невялікую плату. Няхай гэта будуць часовыя стаянкі, але затое зручна для людзей. Бо паркінгі хутка не пабудуеш», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што Беларусь сёння вельмі цікавая для замежных інвестараў. На разглядзе беларускага боку знаходзіцца вялікая колькасць выгадных інвестпрапаноў. Разглядаць іх, паводле слоў Прэзідэнта, неабходна без затрымкі.

«Не зацягвайце, пакуль ідзе будаўнічы бум і ёсць цікавасць — трэба выкарыстаць гэта, прымаць рашэнні і будаваць. У адваротным выпадку мы можам адштурхнуць інвестараў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да чыноўнікаў. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што трэба хутчэй праводзіць ацэнку нерухомай маёмасці, на месцы якой плануецца ўзвесці новыя аб'екты.

Прэзідэнту быў таксама прадстаўлены праект будаўніцтва новага музея Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. Аляксандр Лукашэнка адобрыў задуму архітэктараў.

Плануецца, што новы будынак размесціцца на праспекце Пераможцаў побач з паркам Перамогі. Гэта будзе будынак, большы па плошчы і маштабу, чым існуючы музей.

«Новы музей Вялікай Айчыннай вайны надзвычай неабходны. Нам трэба ўвекавечыць подзвіг народа, каб нашы дзеці помнілі гэту Перамогу», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што будаўніцтва новага музея павінна заняць не больш як два гады.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Новы аквапарк у... «Сілічах»?

Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр «Сілічы» адкрывае летні сезон. Пры гэтым, як зазначыў падчас сустрэчы з журналістамі дырэктар цэнтра Сяргей Шайко, папулярны турыстычны комплекс будзе пазіцыянаваць сябе перш-наперш як месца для сямейнага адпачынку.

Апроч «пазасезонных» паслуг гасцініц, пунктаў грамадскага харчавання, лазні, пейнтбольнага ціру і спартыўнай залы з пляцоўкамі для міні-футбола, гандбола, валейбола і вялікага тэніса, улетку наведвальнікі цэнтра змогуць скарыстацца пракатам лыжароллераў, ролікавых канькоў, горных веласіпедаў, правесці час за шашлыкамі ў абсталяваных альтанках, здзейсніць пад'ём на адну з самых высокіх вяршынь Беларусі. Не менш цікавай прапановай стане зона адпачынку «Лясное возера» — з рыбалкай, добраўпарадкаванымі пляжамі і новымі воднымі атракцыёнамі. Паводле слоў Сяргея Шайко, у летнія планы цэнтра ўваходзіць арганізацыя некалькіх маладзёжных дыскатэк з запрашэннем папулярных замежных дыджэяў, а таксама правядзенне сумесна з іншымі прадпрыемствамі Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта шэрагу цікавых імпрэзаў — у прыватнасці, Свята рыбы. Плюс да таго, цэнтр мае ператварыцца ў турыстычны аб'ект. Спецыяльна для школьнікаў тут распрацавана 1-дзённая пуцёўка, у кошт якой (389 тыс. рублёў на групу з 30 чалавек) уключана экскурсія па «Сілічах», пад'ём па канатнай дарозе і абед. Яшчэ адной адметнай навінкай сезона стане 7-дзённая пуцёўка (коштам прыкладна 480 долараў на кожнага ў групе больш за 16 чалавек) з пражываннем і харчаваннем у гарналыжным цэнтры, паездкамі ў Бярэзінскі біясферны запаведнік, санаторый «Юнацтва», у Полацк, Дудуткі, на «Лінію Сталіна», экскурсіямі па вячэрнім Мінску.

Між тым, у будучым варыянтаў летняга адпачынку ў найбуйнейшым гарналыжным цэнтры Беларусі стане больш. Як паведаміў Сяргей Шайко, у «Сілічах» мяркуецца стварыць аквапарк, прычым чакаецца, што яго будаўніцтва распачнецца ўжо ў наступным годзе.

Сяргей ГРЫБ.

Першы з'езд РГА «Белая Русь» адбудзецца ў канцы мая — пачатку чэрвеня

Аб гэтым паведаміў карэспандэнту **БЕЛТА** член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу Палаты прадстаўнікоў, намеснік старшыні РГА «Белая Русь» Аляксандр Шацько. Раней планавалася правесці першы з'езд 17 мая, аднак «пасля абласных канферэнцый у рабочую групу па распрацоўцы праграмы грамадскага аб'яднання паступіла шмат канкрэтных і абгрунтаваных прапаноў па яе дапрацоўцы...

Падрабязнасці

ПАЙШЛІ І НЕ ВЯРНУЛІСЯ

Да гэтага часу невядомы лёс больш чым 2 тысяч нашых суграмадзян, у тым ліку 69 дзяцей, якія зніклі без вестак за апошнія 7 гадоў

Згубіцца на гэтым свеце можна не толькі ў гады ваеннага ліхалецця. Нямала людзей знікае і ў мірныя часы.

Як паведаміў падчас аператыўнай нарады намеснік Генеральнага пракурора Беларусі Барыс Тарлецкі, за апошнія 7 гадоў аб'яўляліся ў вышук больш за 46 тысяч зніклых без вестак нашых суграмадзян. Пераважная большасць з іх была знойдзена, прычым жывымі. Аднак лёс больш чым 2 тысяч нашых суграмадзян, у тым ліку 69 дзяцей, да гэтага часу невядомы. Апроч таго, за памяшёны перыяд было выяўлена больш за 500 неапазнаных трупаў.

Зрэшты, у праваахоўных органаў ёсць падазрэнні, што і многія асобы, якія зніклі без вестак, сталі ахвярамі забойцаў. На сёння ўжо ўзбуджана больш за 180 крымінальных спраў па фактах забойстваў такіх людзей. Зразумела, міліцыя вядзе пошук зніклых. Але хоць чалавек — не іголка ў стозе сена, знайсці такую прапажу надзвычай цяжка. Бо, як правіла, дарослыя людзі знікаюць за межамі нашай краіны. Найчасцей гэта беларусы, якія выязджаюць на заробкі ў Расію. Напрыклад, у Гомельскай вобласці 52 працэнты ад агульнай колькасці зніклых складаюць асобы, якія падаліся шукаць лепшай долі на бяскрайнія расійскія прасторы. На Гродзеншчыне і Брэстчыне невядомы лёс адпаведна 40 працэнтаў і 34 працэнтаў такіх «гастарбайтэраў».

Яшчэ адна прычына знікнення нашых суграмадзян — п'янства. Прычым маюцца на ўвазе не толькі самі выпівохі, але і іх родныя і блізкія. Дзеці, як правіла, уцякаюць менавіта з тых сем'яў, дзе іх тэрарызуюць п'яныя бацькі. Таму, як адзначыў Барыс Тарлецкі, вельмі важнае значэнне мае прафілактыка бытавой злачыннасці. Чым лепшай будзе сітуацыя ў беларускіх сем'ях, тым менш нашых суграмадзян будуць бадзяцца па свеце і знікаць. А яшчэ, на думку намесніка Генеральнага пракурора, неабходна ўкараняць новыя спосабы вышуку зніклых без вестак.

«Калісьці мы хацелі друкаваць фотаздымкі зніклых дзяцей на пачках запалкаў, але не атрымалася. Чаму б цяпер не паспрабаваць выкарыстаць такую практыку?» — прапанаваў Барыс Тарлецкі. Ён таксама лічыць неабходным наладзіць супрацоўніцтва з вядомай расійскай тэлепраграмай «Чакай мяне», а таксама больш шырока выкарыстоўваць новыя сродкі сувязі, картатэку ДНК.

Многае залежыць і ад блізкіх зніклага чалавека. Знайсці такую прапажу міліцыі лягчэй па «гарачых слядах», звычайна пошук дае эфект на працягу трох дзён пасля знікнення. Таму чым хутчэй сваякі і знаёмыя зніклых асобаў звернуцца ў міліцыю, тым больш шанцаў будзе іх знайсці.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды земельного участка общей площадью 0,0480 га сроком на 50 лет под установку торгового павильона по продаже продовольственных товаров по ул.Стадионной в г. Марьина Горка Пуховичского района, кадастровый номер земельного участка 624450100001002626. Начальная цена предмета аукциона – 7 203 360 бел. рублей. Строения, сооружения на земельном участке отсутствуют.

Участник аукциона, ставший Победителем, обязан:

1. В течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельных участков внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить расходы, оговоренные в условиях проведения аукциона;

2. В установленный срок заключить с Пуховичским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию прав на земельный участок;

3. Приступить к занятию земельного участка не позднее шести месяцев после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него;

4. Приступить к строительству объекта после разработки и утверждения в установленном порядке строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ.

Договор аренды земельного участка заключается с победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после совершения Победителем аукциона действий, указанных в пункте 1 настоящего извещения. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». **Аукцион состоится 17.06.2008 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321.** Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 16.06.2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Абзац

■ **На 1 студзеня гэтага года шчыльнасць насельніцтва ў Мінску склала 5911 чалавек на 1 кв.км. Год таму гэты паказчык складаў 5874 чалавекі на 1 кв.км. За год насельніцтва Мінска павялічылася з 1 млн 797,5 тыс. да 1 млн 814,8 тыс. чалавек. Сярод рэгіёнаў краіны найбольш высокая шчыльнасць насельніцтва адзначаецца ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях (на 1 студзеня 2008 года яна склала 44 чалавекі на 1 кв.км). Гэты паказчык у Магілёўскай вобласці дасягнуў 39 чалавек на 1 кв.км, у Мінскай — 37, у Гомельскай — 36, у Віцебскай — 32.**

■ Больш за 800 нецвярозых вадзіцеляў затрымана на дарогах Беларусі за прайшоўшыя выхадныя. Прычым калі 8 мая — 118, то ўжо 10 мая — больш за 260. Дарэчы, 436 чалавек загінулі на дарогах Беларусі ў студзені—красавіку сёлета. Гэта прыкладна на 2,6 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд летась.

■ **Пацыент, якому першаму ў Беларусі была праведзеная аперацыя па перасадцы печані, учора выпісаны з бальніцы. Ён будзе пастаянна знаходзіцца пад наглядам урачоў.**

■ У Кастрычніцкі РАУС Магілёва звярнуўся 24-гадовы рабочы адной з камерцыйных фірмаў абласнога цэнтра і паведаміў, што па праспекце Пушкіна ў яго з хуліганскіх памкненняў невядомы стрэліў з пнеўматычнага пісталета, пасля чаго знік на аўтамашыне «Аудзі-А6». Аператыўна быў уведзены план «Перахоп», і праз 10 хвілін быў затрыманы 20-гадовы непрацуючы мясцовы жыхар, у якога адабраны пнеўматычны пісталет.

■ **Строгая забарона на спальванне саломы пасля збору і апрацоўкі ўраджаю ўведзена ў шэрагу правінцый Кітая, паведамілі мясцовыя СМІ. Абмежаванне ўводзіцца як адна з мераў забеспячэння чысціні атмасферы ў час правядзення ў Пекіне Алімпійскіх гульняў у жніўні 2008 года.**

■ Супрацоўнікі міліцыі ўзбудзілі крымінальную справу ў дачыненні да пенсіянера з Сенненскага раёна, які падазраецца ў забойстве па неасцярожнасці мясцовага прадпрымальніка. Падчас паляванне на дзікіх гусей індывідуальны прадпрымальнік 1962 года нараджэння атрымаў агнястрэльнае раненне ў галаву і памёр. Падазроны ў неасцярожным забойстве затрыманы. Абодва паляўнічыя мелі дазвол на паляванне.

■ **У сталіцы Таджыкістана адразу пасля прайшоўшага ваеннага парада з выпадку 63-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне аўтамабіль ДАІ ўрэзаўся ў натоўп гледачоў. У выніку пацярпелі 20 чалавек, пяцёра з іх шпіталізаваныя. Як мяркуецца, у аўтамабіля ВАЗ-2107, які належыць ДАІ горада, перасталі дзейнічаць тармазы.**

Поўны абзац

■ У Эстоніі буйную рагатую жывёлу абклалі падаткам за газы, якія выдзяляюцца ў працэсе жыццядзейнасці. На падставе закона аб выплатах за забруджванне навакольнага асяроддзя сяляне ўжо атрымалі рахункі з патрабаваннем аплаціць падатак за метан, які выдзяляюць каровы, паведаміў на пасяджэнні ў парламенце старшыня Народнага саюза Яанус Марандзі. Ад імя фракцыі партыі, якая выказвае інтарэсы вясковага насельніцтва, ён адрасаваў міністру навакольнага асяроддзя запыт па праблеме налічэння падаткаў на газы, што выдзяляюцца каровамі, піша газета «СЛ Ыхтулехт». У іншых краінах Еўрасаюза такога падатку няма. Парламентарыяў-народнікаў цікавіць, якім чынам налічваецца гэты падатак і як вымераць колькасць газаў, што выдзяляюцца каровамі? Між тым, па падліках міністэрства навакольнага асяроддзя, ад пагалоўя ў 58 тыс. кароў у год можна атрымаць каля 5,5 млн крон у год падатку ($500 тыс.) Кожная жывёліна, лічаць спецыялісты, выдзяляе ў год да 100 кг метану, і ў дзень з адной каровы можна сабраць падаткі прыкладна ў 30 сентаў ($ 0,03). Пры гэтым вясковыя жыхары выказваюць недаўменне: чаму падаткамі абкладзеныя менавіта каровы, якія на самай справе наогул не выдзяляюць газы, а выдаляюць іх разам з іншымі прадуктамі жыццядзейнасці, у адрозненне, напрыклад, ад коней і людзей.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АБХАЗЫ СЦВЯРДЖАЮЦЬ, ШТО Ў ПАНЯДЗЕЛАК ЗБІЛІ ЯШЧЭ ПАРУ ГРУЗІНСКІХ БЕСПІЛОТНІКАЎ

Шосты грузінскі беспілотны самалёт-разведчык збіты сіламі абхазскага ПВА над тэрыторыяй Ачамчырскага раёна Абхазіі.

Яго рэшткі ўжо сабраныя і накіраваны на экспертызу ў Сухумі. Пошукі фрагментаў сёмага збітага самалёта працягваюцца. Разам з тым, у МУС Грузіі заявілі, што гэта чарговая дэзінфармацыя, бо грузінскія беспілотныя самалёты ў апошнія дні не ажыццяўлялі ніякіх палётаў.

900 СТУДЭНТАЎ ПАХАВАНЫЯ ПАД ЗАВАЛАМІ Ў КІТАІ

Магутнае землетрасенне магнітудай у 7,8 бала адбылося на паўднёвым захадзе Кітая.

Паводле паведамленняў інфармагенцтваў, эпіцэнтр землятрасення знаходзіцца ў правінцыі Сычуань на глыбіні 29 км пад паверхняй Зямлі. Дзяржаўныя СМІ КНР паведамілі, што ў адным з гарадоў правінцыі каля 900 студэнтаў пахаваныя пад завалямі. Не ўдакладняецца, аб абвальванні якога будынка ідзе гутарка.

У СКЛАД УРАДА ПУЦІНА ЎВАЙШЛІ ПЯЦЬ НАВІЧКОЎ

У складзе кабінета міністраў Уладзіміра Пуціна з'явіліся пяцёра новых чалавек.

Міністрам энергетыкі стаў Сяргей Шматко, міністрам спорту, турызму і моладзевай палітыкі — Віталь Мутко, міністрам сувязі і камунікацый — Ігар Шчагалёў, міністрам культуры — Аляксандр Аўдзееў, а міністрам юстыцыі — Аляксандр Канавалаў.

ЛУЖКОВА НЕ ПУСЦЯЦЬ ВА ЎКРАІНУ

Служба бяспекі Украіны забараніла ўезд у краіну мэру Масквы Юрыю Лужкову ў сувязі з яго скандальнымі заявамі, зробленымі ў мінулую нядзелю ў Севастопалі на цырыманіі 225-годдзя Чарнаморскага флота РФ.

«У сувязі з тым, што грамадзянін Расіі Юрый Лужкоў не прытрымліваўся ўмоў папярэджання Службай бяспекі Украіны аб недапушчальнасці здзяйснення дзеянняў, якія наносяць шкоду нацыянальным інтэрасам Украіны і яе тэрытарыяльнай цэласнасці, Лужкову забаронены ўезд ва Украіну», — заявіла кіраўнік прэс-цэнтра СБУ Марына Астапенка. Яна таксама адзначыла, што зараз СБУ высвятляе ўсе акалічнасці «правакацыйных выказванняў Лужкова ў сувязі з магчымым дачыненнем гэтага іншаземца да адмывання «брудных грошай» ва Украіне, у прыватнасці на тэрыторыі Севастопаля».

Спорт-тайм

ГЛЕБ ПЕРАХОДЗІЦЬ У «ІНТАР»

Аляксандр Глеб пасля трох гадоў выступленняў за англійскі «Арсенал» пакідае лонданскую каманду. Гэта стала вядома пасля таго, як беларускі легіянер афіцыйна паведаміў аб сваім намеры змяніць клуб галоўнаму трэнеру «кананіраў» Арсену Венгеру. Гэта будзе італьянскі «Інтар», настаўнік якога Раберта Манчыні не хавае жадання атрымаць у сваю каманду капітана беларускай зборнай, а «чорна-сінія» гатовы прапанаваць Аляксандру куды больш салідную заработную плату, чым у «Арсенале». Згодна з артыкулам 17 рэгламенту ФІФА, Глеб за два гады да заканчэння тэрміну свайго пяцігадовага пагаднення мае права выкупіць частку кантракта, якая засталася, і быць прададзеным за фіксаваную суму, якая будзе дакладна меней за 11,2 млн фунтаў, якія заплаціў «Арсенал» у 2005 годзе нямецкаму «Штутгарту». Так што «канарам» не застаецца нічога іншага, як выставіць Глеба за ўмераны кошт, які будзе не нашмат вышэйшым за названы фіксаваны. У адваротным выпадку «Інтар» проста выкупіць за нашага суайчынніка частку яго кантракта з «Арсеналам», якая засталася. У адказ галоўны трэнер «Арсенала» Арсен Венгер паведаміў: «Мы імкнёмся ўтрымаць Глеба, хочам, каб ён заставаўся часткай нашай каманды на наступны год. Мы ўжо страцілі аднаго іграка — Мацье Фламіні — і не жадаем іншых страт».

«ВІЦЕБСК» АТРЫМАЎ ПЯТУЮ ПЕРАМОГУ

Пасля матчаў шостага тура футбольнага чэмпіянату Беларусі сярод камандаў вышэйшай лігі турнірную табліцу працягвае ўзначальваць «Віцебск». Сваю пятую перамогу падапечныя Юрыя Канаплёва атрымалі ў гасцях у «Гомеля» — 2:1. У гэтай сустрэчы ў складзе пераможцаў вызначыліся Руслан Усаў і Павел Сітко, а ў гамяльчан голам вызначыўся іх капітан Раман Васілюк. Зараз у лідара стала 16 ачкоў, а ў бліжэйшага праследвальнік сталічнага МТЗ-РІПА на 4 балы менш. Мінчане, якія гулялі ў гасцях у магілёўскага «Дняпра», перамаглі 2:1 дзякуючы двум дакладным ударам Арцёма Канцавога. Па 11 ачкоў маюць адразу дзве каманды — мінскае «Дынама» і «Смаргонь». Дынамаўцы парадавалі сваіх балельшчыкаў буйной гасцявой перамогай над аўтсайдарам першынства «Дарыдай» — 3:0, а смаргонская дружына ў сябе дома згуляла ўнічыю з чэмпіёнам барысаўскім БАТЭ — 0:0. Нічые — 1:1 зафіксаваны яшчэ ў двух матчах: «Тарпеда» (Жодзіна) — «Дынама» (Брэст) і «Нафтан» (Наваполацк) — «Шахцёр» (Салігорск). У сустрэчы навічкоў вышэйшага дывізіёна мікашэвіцкі «Граніт» з мінімальным лікам 1:0 адолеў у Брэсце магілёўскі «Савіт». Гродзенскі «Нёман» у сябе дома прымаў яшчэ аднаго навабранца элітнай кампаніі сталічны «Лакаматыў». У самым пачатку гульні вызначыўся лідар чыгуначнікаў Мікалай Швыдакоў, а гродзенцы здолелі вырваць перамогу пад занавес матча — ужо ў дададзены арбітрам час мячы забілі Дзмітрый Кавалёнак і Аляксандр Алумона.

ЖАЎНОВА ЧАКАЕ АПЕРАЦЫЯ?

Пасля перамогі над яраслаўскім «Шыннікам» 1:0 у 10-м туры чэмпіянату Расіі галоўны трэнер футбольнага клуба «Масква» Алег Блахін расцлумачыў адсутнасць варатара Юрыя Жаўнова (гуляў іншы беларускі галкіпер Антон Амельчанка). «Аказваецца, у Жаўнова два гады таму быў надрыў пярэдняй мышцы сцягна, і ўтварыўся рубец, з якім ён працягваў гуляць. Цяпер трэба рабіць аперацыю. Гэта не работа Блахіна, у якога няправільныя трэніроўкі, як многія пішуць. Гэта старая траўма».

«МЮ» — ЧЭМПІЁН АНГЛІІ

У апошнім туры чэмпіянату Англіі 2007/2008 «Манчэстар Юнайтэд» абыграў на выездзе «Уіган» і заваяваў тытул чэмпіёна Англіі. Больш за тое, галоўны праследвальнік манкуніянцаў, «Чэлсі» не здолеў перамагчы «Болтан». Каманда Гранта заваявала другое месца, трэцяе і чацвёртае, адпаведна, за «Арсеналам» і «Ліверпулем». Пакідаюць прэм'ер-лігу «Рэдзінг», «Бірмінгем» і «Дэрбі Каунці».

ДЗЕСЯТКА НАМІНАНТАЎ НА GOLDEN FOOT

Сталі вядомыя імёны ігракоў, якія прэтэндуюць на Golden Foot-2008 — прэмію футбалістам за выдатную кар'еру ў футболе. Спецыяльнае журы вызначыла 10 намінантаў: Дэвід Бекхэм («Лос-Анджэлес Гэлаксі», зборная Англіі), Джанлуіджы Буфон («Ювентус», зборная Італіі), Фабіо Канавара («Рэал», зборная Італіі), Луіш Фігу («Інтэр», зборная Партугаліі), Раян Гігз («Манчэстар Юнайтэд», зборная Уэльса), Ц'еры Анры («Барселона», зборная Францыі), Рауль («Рэал», зборная Іспаніі), Раберта Карлас («Фенербахчэ», зборная Бразіліі), Франчэска Тоці («Рома», зборная Італіі), Давід Трэзэге («Ювентус», зборная Францыі). У мінулым гэтай узнагароды былі ўдастоены Раберта Баджо (2003 год), Павел Недвед (2004), Андрэй Шаўчэнка (2005), Раналда (2006) і Аляксандра дель П'ера (2007).

УНП 300063038

ИЗВЕЩЕНИЕ
об открытом аукционе на право заключения договора аренды земельного участка
ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА — Верхнедвинский районный исполнительный комитет

Месторасположение земельного участка, кадастровый номер участка, арендодатель	Ограничения в использовании участка	Площадь земельного участка, га	Срок аренды, лет	Назначение участка	Условия продажи	Начальная цена объекта, руб. / сумма задатка, руб.
г. Верхнедвинск, ул. Ленинградская в районе магазина «Князёўна», кадастровый номер 221005010000101905 Арендодатель – Верхнедвинский районный исполнительный комитет	на площадь 0,0060 га - водоохранная зона водного объекта (река Западная Двина) вне прибрежных полос	0,0060	5	для размещения объекта розничной торговли	осуществление в 2-х месячный срок после принятия решения райисполкома о передаче в аренду земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; в течение 6 месяцев со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию участка в соответствии с целью его предоставления.	58415 / 5800

1. Аукцион состоится 18 июня 2008 г. в 15 часов в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний).

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности, индивидуальные предприниматели и граждане. Участнику необходимо подать заявление и подписать установленной формы соглашение с Верхнедвинским райисполкомом.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; гражданином представляются – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о госрегистрации индивидуального предпринимателя; представителем

Генадзь Нявыглас:

«Якасць сацыяльных паслуг у глыбінцы паступальна павышаецца»

Напярэдадні свята Перамогі ў Валожыне пасля рэканструкцыі адкрыўся кінатэатр «Юнацтва».

Як заўважыў на ўрачыстай цырымоніі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Генадзь Нявыглас, дзяржава настойліва імкнецца да таго, каб кожны чалавек, незалежна ад месца жыхарства, адчуваў сябе камфортна, мог скарыстацца ўсёй належнай інфраструктурай, як і жыхар сталіцы, абласных цэнтраў. І для гэтага ўжо шмат зроблена: беларускія гарады і вёскі набываюць новы выгляд. Як лічыць Генадзь Нявыглас, якасць сацыяльных паслуг у глыбінцы паступальна павышаецца.

За апошнія гады, напэўна, ва ўсёй рэспубліцы не было ўзведзена такога аб'екта, як у Валожыне. Паводле слоў старшыні Мінскага аблвыканкама Леаніда Крупца, на рэканструкцыю «Юнацтва» (які мае найноўшае абсталяванне) выдаткаваны значныя сродкі. У абноўленым кінатэатры адбылося абласное свята журналістыкі і паліграфіі, дзе па выніках штогадовага спаборніцтва былі адзначаны лепшыя. Першае месца сярод раёнак заняла «Працоўная слава» — цэнтральнае выданне Валожыншчыны. У якасці ўзнагароджання рэдакцыя таксама атрымала новенькую «Волгу».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

МАЙСКІЯ ВЯСЕЛЛІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ПЕРАМОГА І ВЯСЕЛЛЕ

— Я асабіста ведаю 5 сямейных пар, якія жаніліся 13 мая і дажылі да залатых і брыльянтавых вяселляў, — адразу рэагуе на слова «май» начальнік аддзела ЗАГС Магілёўскага гарвыканкама Алена Казлова. — Уяўляеце сабе? Не толькі ў маі, а яшчэ і 13-га! Таму скажу ўсім: усё залежыць не ад месяца і даты, а ад людзей, які вырашылі стварыць сям'ю!

Яе бацькі пажаніліся 9 мая 1948 года і шчасліва пражылі разам больш за 50 гадоў. Для іх Дзень Перамогі быў сімвалічным, а майскае вяселле пад квітнеючымі дрэвамі засталося выдатным успамінам на ўсё жыццё. Шчаслівае жыццё жанчыны і мужчыны, якія кахалі і паважалі адно аднаго.

— Проста цяпер людзі мала верацъ у каханне! — лічыць Алена. — Адным трэба ўзяць шлюб 08.08.08, каб забяспечыць вечныя пачуцці. Іншыя патрабуюць жаніцьбу ў жніўні, каб абавязкова быў дабрабыт. А трэцім, каб перакананаць усіх, што яны не горшыя, патрабуецца рэгістрацыя ў залатой зале а 14-й гадзіне — такая новая магілёўская мода. Але зусім не знешнія атрыбуты, а толькі каханне можа выратаваць свет і людзей. Усё астатняе прыходзіць і сыходзіць.

ВЯСЕЛЬНЫ ЦОТ

— А вы колькі кветак дорыце маладым на вяселлі? — сустрэла нечаканым пытаннем загадчыца Музея этнаграфіі ў Магілёве Святлана Рыбакова.

— Як і ўсё — няцотную колькасць.

— Але гэта няправільна з пункту гледжання народных традыцый, — патлумачыла Рыбакова. — Парная колькасць кветак дорыцца ў пару. Каб маладыя былі парай — патрэбен цот. А нябожчыку наадварот: каб ён не шукаў пару, на могілкі трэба несці лішку кветак.

Магілёўскія знаўцы народных абрадаў гавораць, што цот і лішка — гэта традыцыя, якая склалася ў беларускай культуры ў спрадвечныя часіны. Але за час савецкай улады, калі народнымі звычаямі грэбавалі, бо камуністы стваралі новую савецкую абраднасць, з'явіліся культурныя перакруты, калі сэнс абраду губляўся і ўсё пераварочвалася з ног на галаву. Да іх ліку, у пэўнай ступені, адносяцца і майскія вяселлі.

— Май беларусы называлі і траўнем, але ўвогуле «маяцца» — гэта паняцце з сучаснага жыцця, — упэўнена старшы навуковы супрацоўнік Магілёўскага музея этнаграфіі Жана Клімуць. — Нашы продкі ўспрымалі жыццё як лёс, долю. Жыццё ніколі не было лёгкім, але яны не маяліся, а жылі. А паводле традыцый, якія нарадзіліся яшчэ да рэвалюцыянства, жаніцца можна была ў любую пару года і ў любы дзень.

Этнографы расказваюць, што ў беларускіх вёсках за мінулымі часамі жаніліся і ў маі. Выбар даты залежаў ад жыццёвых абставінаў. Бедная сям'я, якой тэрмінова патрабаваліся яшчэ адны рабочыя рукі, прымала да сябе дзяўчыну перад пасяўной альбо жнівом.

Хто быў багацейшы і лічыў, што шчодрае застолле будзе спрыяць заможнаму жыццю маладых, гуляў вяселле ўвосень. І да нашых дзён дайшла традыцыя жаніцца пасля заканчэння ўсіх палявых работ — на Пакроў, які пакрывае ваду лёдам, а дзяўчыну чапцом, сімвалам замужняй жанчыны.

ВЯСЕЛЬНЫЯ СЕЗОНЫ

Часіны змяніліся, сёння пануе іншы лад жыцця, які нараджае новыя традыцыі. Прычым часам вельмі дзіўныя: царкоўнае вянчанне «на ўсё жыццё» спакойна спалучаецца са шлюбным кантрактам, дзе абгаворваецца развод.

Сёння ёсць дзве асноўныя прычыны, якія кіруюць шлюбным графікам у ЗАГСах: пустыя месцы ў ім — рэлігійныя пасты і май.

Цяпер у Магілёве за ўвесь май жэніцца прыкладна столькі пар, колькі за адзін week-end у жніўні. Выключэннем стаў бадай што сёлетні май, бо на яго прыпала Красная горка. Руская праваслаўная традыцыя жаніцца ў першую нядзелю ад Вялікадня мае ўплыў і на Магілёўшчыне.

Яшчэ 15—20 гадоў таму, сведчаць супрацоўніцы Магілёўскага Палаца шлюбаў, усе месяцы ў шлюбным сэнсе былі прыкладна аднолькавымі. Майскія забабоны — гэта, як ні дзіўна, здабыткі сучаснага дасведчанага часу.

— Хоць, напэўна, я ведаю, карананаваныя і знакамітыя асобы ў замежжы жэняцца менавіта ў маі, — зазначае Алена Казлова. — Бо ўвесну расцвітаюць прырода, душа і цела чалавека.

Статыстыка разводаў не пацвярджае майскія перасцярогі. Можна і пасля цалкам «паліткарэктнага» жніўеньскага вяселля «прамаяцца» і хутка разысціся.

— Маяцца трэба пры выбары жаніха альбо нявесты, — раіць Святлана Рыбакова. — А калі ўжо выбраў, тады трэба не пра забабоны меркаваць, а прыласці высілкі, каб стварыць і захаваць сваю сям'ю.

ЗОРКІ І ВЯСЕЛЛЕ

Меркаванні сучасных астролагаў наконт майскіх вяселляў падзяляюцца. Адны гавораць, што майскія шлюбы нічым не лепшыя і не горшыя за іншыя. Праўда, папярэджваюць: калі ўсё ж верыце ў забабоны — лепш не жаніцца ў маі, каб потым не думалася. Бо, вядома ж, у сямейным жыцці хапае складанасцяў, якія тлумачацца далёка не толькі зоркамі.

Іншыя астролагі папярэджваюць пра сур'ёзныя нябесныя супрацьпаказанні менавіта ў маі. Па іх словах, мір і згода ў маладой сям'і можа сапраўды пахіснуцца ад неспрыяльных зорных уплываў. І толькі вялікае каханне можа іх пераадолець.

Ёсць звесткі, што ад вяселляў у маі засцерагалі яшчэ Авідзій і Плутарх. Звычайна самым страшэнным прыкладам нешчаслівага майскага шлюбу называюць вяселле Марыі Сцюарт і яе фаварыта Босуэла ў XVI стагоддзі, дзе ўсё скончылася не толькі разводам, але і пакараннем каралевы смерцю.

Аднак, з іншага боку, існуе яшчэ незлічоная колькасць прыкладаў, калі людзі, якія жаніліся ў маі, не «маяліся», не мучыліся і не мардаваліся. А жылі шчаслива.

ЗАЛАТОЕ ВЯСЕЛЛЕ

На паўвекавы юбілей сумеснага жыцця магіляўчанін Аляксандр Мітрафанавіч Пуставойт набыў новыя заручальныя пярсцёнкі і напісаў жонцы верш: «... Узгадаем, як сады цвілі, калі я вёў цябе па вуліцы, маю нявесту. Не вёў, а крылы радасці і шчасця нас няслі!»

У 1957 годзе маладую настаўніцу размеркавалі ў школку ва ўкраінскім сяле. Клапатлівыя сяброўкі папярэджвалі Тоню, каб асцерагалася дзяўчына першага хлопца на той вёсцы — маўляў, надта прыгожы і надта актыўны. Аднак на першых жа танцах яны сталі ў пару, і неўзабаве пажаніліся.

— Наша першая шлюбная ноч прайшла ў амбары! — радасна ўзгадвае Пуставойт. — Я быў з беднай сям'і: малодшы з пяці дзяцей, бацьку забілі на вайне, а хату разбурыла бомба. Вось і прывёў нявесту ў амбар, ды ў тую ноч мой самародны ложак зламаўся! Затое ёсць пра што расказаць унукам!

— У нас вяселле было наладжана ў строгай адпаведнасці з народнымі традыцыямі, — вяртаецца да сур'ёзнай размовы Антаніна Якаўлеўна. — І вяселле ў маі ім не супярэчыла. У вёсцы толькі сачылі, каб не быў пост. Мне падаецца, што ўсе забабоны наконт мая — абсалютная лухта! Усё залежыць ад пачуццяў сужэнцаў, цярплівасці і ўзаемаразумення.

ВЯСЕЛЬНАЯ ЭКАНОМІЯ

Алена Казлова паказвае фотаздымак: яна з мужам у дзень вяселля, прыгожая маладая пара. Жанчына расказвае, як у савецкі час дэфіцытаў удалося прыбрацца да вяселля: жаніху выпадкова набылі строй у краме на раёне, а сваю сукенку і вэлюм нявеста з сяброўкамі рыхтавала з усіх даступных тканін і матэрыялаў.

Алена выходзіла замуж у жніўні, пасля завяршэння студэнцкай практыкі. Сем'ям маладых канец лета пасаваў для вяселля і ў сэнсе харчовых запасаў: свае бульба, агуркі і таматы значна аблягчалі фінансавы цяжар.

— А цяпер гэта не актуальна, — сцвярджае загадчыца ЗАГСа. — І не толькі таму, што агуркі ды таматы ёсць на паліцах круглы год. А таму, што цяпер таннае вяселле ніхто не робіць. Калі паставяць на стол бульбу з агароднінай, хто гэта будзе есці? Цяпер некалькі змен вытанчаных страў у прыстойнай рэстарацыі — неабходны мінімум.

Цяпер дэфіцытаў няма — былі б толькі грошы. Строі, картэжы, забавы і застолле разам каштуюць дзесяткі мільёнаў рублёў. Але як гэта ні дзіўна, зэканоміць можна якраз у маі.

Магіляўчане Алена і Аляксей падзяліліся сваім вопытам:

— Пажаніцца ў маі значна лягчэй! Графік у ЗАГСе свабодны, можна спакойна выбраць тамаду і фотамайстра. Выбраць не з таго, што засталося, а што пасуе менавіта табе. Ажыятажнага попыту на вясельныя паслугі няма, таму абсалютна рэальна ў маі атрымаць значныя скідкі.

САПРАЎДНАЕ ВЯСЕЛЛЕ

Новае непрымхлівае пакаленне, верагодна, пазбавіцца ад майскіх вясельных забабонаў.

— Мы з мужам наконт гэтага «маяцца ў маі» абсалютна не парымся! — весела паведаміла студэнтка Кацярына, якая выйшла замуж 4 мая. — Бацькі маёй сяброўкі пажаніліся ў маі: яны да таго ж несумяшчальныя па знаках Задыяка і кітайскім календары, але жывуць 25 гадоў абсалютна бесканфліктна.

Кацярына пайшла яшчэ далей: яна не проста выйшла замуж у маі, ды яшчэ і ў высакосны год, але і нават у басаножках, што паводле нейкіх традыцый лічыцца абсалютным жахам для нявесты. Дзяўчына паабяцала, што насуперак усяму яе сямейнае жыццё будзе цалкам шчаслівым.

...Прыгожая белая сукенка як у казачнай Папялушкі ў фінале казкі, прэстыжныя аўтамабілі, паўсотні запрошаных гасцей і вяселле 3 мая — пра гэта марыла Таццяна. Усё спраўдзілася. Яна сустрэла Міхаіла на набярэжнай Дняпра ў Магілёве: сяброўка пазнаёміла яе з братам, які аказаўся тым самым суджаным.

— Муж называе глупствам майскія падазрэнні, а мне вельмі падабаецца вясна і лічба 3, — паведаміла шчаслівая маладая. — Але і гэта ўсё па вялікім рахунку не мае значэння. Таму што як наканавана лёсам — так і будзе.

Супрацоўніцы ЗАГСа ўпэўненыя, што чалавек, які бярэ шлюб, павінен разумець, што вяселле — гэта не спектакль, а крок у новае жыццё.

— Патрэбна ўпэўненасць, што ён альбо яна гатовыя для таго, каб стварыць сям'ю, — раіць Алена Казлова. — Каб было жаданне жыць разам і мець дзяцей. І тады якая розніца, дзе і калі жаніцца. Як бы гэта пафасна ні гучала, трэба дзяліць гора і радасці, і ўсё будзе добра.

Ілона ІВАНОВА.

Памяці князя Астрожскага...

Увёсцы Тарасава, што пад Мінскам, прайшло першае з шэрагу ўрачыстых мерапрыемстваў у гонар 400-годдзя памяці князя Канстанціна (Васіля) Астрожскага, славутага асветніка, дзяржаўнага і царкоўнага дзеяча.

Вёска калісьці належала слыннаму роду Астрожскіх — аднаму з найбольш знакамітых і багатых, які даў шмат славутых імёнаў на вайсковай, дзяржаўнай і духоўнай ніве.

Князь Канстанцін (у хрышчэнні Васіль) найбольш выразна праявіў духоўную місію роду Астрожскіх — адказнага перад Богам і Айчынай за лёс Царквы і свайго народа.

Вёска Тарасава гасцінна сустрэла ўдзельнікаў і гасцей урачыстых мерапрыемстваў — праваслаўных паломнікаў, вернікаў з розных куткоў Беларусі, замежных дыпламатаў. Пасля набажэнства адбылося асвячэнне Звона ў гонар 400-годдзя памяці (самага вялікага на Міншчыне) і адкрыццё памятнай дошкі.

Побач з храмам была закладзена алея ў гонар князя Канстанціна (Васіля) Астрожскага.

НА ЗДЫМКАХ: у час урачыстасцяў каля вясковага храма.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

СТАЛЯРОЎ І КУЛІК

Жыхар вёскі Ніжні Церабяжоў узвёў тры помнікі ахвярам вайны. Першы ён стварыў яшчэ ў шостым класе, уражаны гісторыяй гібелі савецкага воіна.

У 1944 годзе, падчас ваенных дзеянняў, у вёсцы Ніжні Церабяжоў Столінскага раёна быў схоплены і закатаваны малады воін малодшы лейтэнант Чырвонай Арміі Рыгор Сталяроў. Ніякія катаванні не прымусілі воіна здацца ў палон альбо выдаць месца дыслакацыі перадавых часцей. На целе юнака гітлераўцы выразалі пяціканцовую зорку... Гэтую гісторыю Павел Кулік пачуў ад бабулі, якая была сведкай тых жудасных падзей. Шасцікласнік, не валодаючы якімі-небудзь навыкамі ў мастацкай скульптуры і не ведаючы, як выглядаў невядомы воін, тым не менш узяўся ўласнаручна стварыць помнік герою на ганаровым некропалі каля вясковай царквы. Пазней знайшліся родныя Сталярова, і на стэле пад скульптурным бюстам з'явіўся медальён з фотаздымкам.

Адзін з дзядоў Паўла Куліка — Андрэй Іванавіч Кулік таксама не вярнуўся з вайны. Як і дзесяткі іншых старэйшых аднавяскоўцаў. У гонар іх самадзейны мастак і майстар стварыў скульптурную кампазіцыю і ўсталяваў яе каля вясковага клуба. А потым на скрыжаванні перад вёскай разам з бацькам узвёў абеліск у гонар разведчыкаў Чырвонай Арміі.

Мне ўсё ж удалося ўгаварыць гэтага незвычайнага жыхара Ніжніх Церабяжоў адкласці на некалькі хвілін працу, каб зрабіць фота ля першага і лепшага яго твора. Усе помнікі працы Паўла Паўлавіча Куліка добра захаваліся, як і належыць, яны дагледжаныя і ўпарадкаваныя. А ў вёску і дагэтуль прыходзяць цёплыя лісты ад родных разведчыка Сталярова.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

Плата — толькі за рэзерваванне дадатковых месцаў на могілках. Калі прымуць рашэнне

Жыхарка адной з вёсак Камянкоўскага сельскага Савета Уздзенскага раёна (прозвішча і дакладны адрас у рэдакцыі ёсць) паведаміла, што нядаўна ў населеных пунктах прайшлі сходы, на якіх, у прыватнасці, ішла гаворка аб магчымым увядзенні платы за месцы на вясковых могілках.

— Гаварылі, што для мясцовых жыхароў адно месца будзе каштаваць 35 тысяч рублёў — адну мінімалку. А для іншагародніх — тры мінімалкі, або 105 тысяч. Грошы пойдуць на добраўпарадкаванне. Але я і так згодна аддаць гэтыя грошы на памянёныя мэты, думаю, і іншыя аднавяскоўцы не адмовяцца. Навошта ж вось так? — гаварыла заяўніца.

Як паведаміў рэдакцыі старшыня раённага Савета дэпутатаў Міхаіл Лапатко, у раёне налічваецца 65 могілкаў. На тэрыторыі некаторых сельскіх Саветаў размешчана па 9 могілкаў. Усе іх патрэбна добраўпарадкаваць: паставіць новыя агароджы, пафарбаваць іх, прыбраць аварыйныя дрэвы, як мінімум двойчы за год вывезці смецце. Зразумела, усё гэта патрабуе вялікіх выдаткаў, а сродкаў у бюджэце не хапае.

— На мэты добраўпарадкавання сельскім Саветам на ўвесь год выдзелена па 1—2 мільёны рублёў, прычым за гэтыя сродкі неабходна навесці парадак не толькі на адных могілках, але і ў саміх населеных пунктах, — сказаў Міхаіл Міхайлавіч.

Пэўным чынам вырашыць гэтую праблему дапамагло б увядзенне платы за рэзерваванне месцаў на сельскіх могілках.

— Я падкрэслю, што пытанне пакуль толькі разглядаецца і вельмі глыбока вывучаецца. Хоць у якасці станоўчых прыкладаў можна прывесці той жа Мінск, Заслаўе, Бараўлянскі сельскі Савет. Ніхто пакуль ніякіх канкрэтных расцэнак не ўводзіў, людзей проста праінфармавалі, патлумачылі сітуацыю. Пытанне можа быць разгледжана на чарговай сесіі раённага Савета дэпутатаў у канцы чэрвеня, калі, зразумела, будзе ўнесена ў яе парадак і папярэдне юрыдычна граматна сфармулявана. А канкрэтныя расцэнкі ўвогуле — па выніках станоўчага рашэння сесіі — павінен прымаць аддзел цэнаў Мінаблвыканкама, — патлумачыў далей Міхаіл Лапатко. — Але ўзнятую праблему трэба разглядаць усебакова, што мы, дарэчы, і робім. Па-першае, зноў жа асабліва падкрэслю, згодна з Законам «Аб пахаванні», першае месца на могілках прадастаўляецца бясплатна. Аднак многія імкнуцца зарэзерваваць побач яшчэ некалькі месцаў. Расцэнкі на такую паслугу ў сталіцы даволі высокія. Адсюль вынікае «па-другое». Тыя ж мінчане ў масавым парадку вязуць родных на сельскія могілкі ў прыгарад, у тым ліку і ў наш раён. Больш за тое, рэзервуюць — абцягваюць шпагатам, дротам — побач яшчэ тры, чатыры, пяць, шэсць, а часам і яшчэ больш месцаў. Выходзіць, што на могілках 25—30 працэнтаў месцаў пустуюць, але ж у цэлым такія могілкі ўсё роўна трэба абслугоўваць, добраўпарадкоўваць. А як мы ўжо казалі вышэй, грошай у бюджэце недастаткова. З гэтай мэтай і прапрацоўваецца на перспектыву пытанне аб увядзенні платы за рэзерваванне дадатковых месцаў на могілках. Зазначу, што дапамога ад дзяржавы на пахаванне чалавека складае 800 тысяч рублёў. Гэтай сумы хапае і на заказ катафалка, вянкі, падрыхтоўку магілы і на жалобны стол. Думаю, калі гэта неабходна, людзі з памянёнай сумы змогуць выдаткаваць і нейкую частку за рэзерваванне дадатковых месцаў на могілках. Але азначаная праблема пакуль знаходзіцца на стадыі разгляду.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЯЛІКАЕ ПЕРАМЯШЧЭННЕ

Прыкладна 175 млн чалавек — 3 працэнты насельніцтва свету — жывуць па-за межамі краіны паходжання. Паводле некаторых ацэнак, гэта колькасць значна вырасце да 2050 года.

Як адзначае дырэктар Бюро тэхнічнай падтрымкі Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) для Еўропы і Сярэдняй Азіі Ален Мушыру, міжнародная міграцыя набывае ўсё большае значэнне. Мадэлі міграцыі ў розных краінах — розныя, паколькі яны звязаны з асноўным пытаннем у галіне міграцыйных працэсаў — працоўнай занятасцю.

У апошнія гады каля 70 працэнтаў эмігрантаў з краін СНД пераехалі ў іншыя краіны Садружнасці, астатнія выехалі на пастаяннае пражыванне ў трэція краіны. У Расіі, напрыклад, эміграцыя ў далёкае замежжа склала каля паловы патоку, у Беларусі і ва Ўкраіне — амаль 40 працэнтаў.

Паводле даных Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь, колькасць мігрантаў, якія прыбылі ў нашу краіну ў мінулым годзе, перавысіла 14 тысяч чалавек. 12,5 тысячы з іх ліку прыехалі з краін СНД і Балтыі. Адначасова пакінулі летась межы рэспублікі каля 9,5 тысячы мігрантаў.

Штогод у рэгіёне краін Садружнасці мільёны чалавек бяруць удзел у працоўнай міграцыі. Эканамічны эфект ад яе ў выглядзе грашовых пераводаў дасягае значных аб'ёмаў. Напрыклад, толькі ўлічаныя пераводы з-за мяжы ў 2006 годзе склалі ў Малдове і Таджыкістане звыш 36 працэнтаў ВУП.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Хакей. Чэмпіянат свету-2008

ГУД БАЙ, КАНАДА...

2008 WORLD CHAMPIONSHIP CANADA Halifax Québec City

2008 CHAMPIONNAT MONDIAL CANADA Halifax Ville de Québec

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Канады

На жаль, менавіта так вымушана была сказаць нацыянальная зборная Беларусі па хакеі, развітаўшыся з 72-м чэмпіянатам свету на стадыі чвэрцьфінальных матчаў. Афіцыйнае афармленне выбывання з топ-турніру адбылося ўчора позна ўвечары па канадскім часе, у Беларусі было ўжо каля 5 гадзін раніцы сённяшняга дня, калі падначаленыя Курта Фрэйзера правялі заключную сустрэчу кваліфікацыйнага раўнда супраць каманды Даніі.

Асабіста ў мяне няма сумненняў, што паядынак завершыцца перамогай беларусаў. І ўпэўненасць такая звязана не толькі з набыццём заліковых ачкоў у вочных паядынках супраць грандаў сусветнага хакею — расіян і чэхаў, але і з прысутнасцю неабходнага маральнага духу і багатага хакейнага вопыту.

Выйгрыш у заключным матчы папярэдняга раўнда над французамі (3:1) стаў у нейкай ступені пралогам да адкрыцця новай старонкі ў гісторыі айчыннага хакею. На пасляматчавай прэс-канферэнцыі словы настаўніка нашай каманды Курта Фрэйзера, што «нам неабходна выйграваць у расіян і чэхаў», здаваліся прафанацыяй. Бо яшчэ свежымі былі ў памяці гульні мінулагодняга сусветнага першынства ў Маскве і Мыцішчах, дзе беларусы змаглі прабіцца ў кваліфікацыю дзякуючы перамозе над аўстрыйцамі — 5:2. Астатнія гульні з чэхамі, амерыканцамі, канадцамі, славакамі і немцамі былі прайграныя.

Цікава, што па графіку трэніроўка нашай каманды, якая папярэднічала гульні з расіянамі, значылася якраз за камандай Вячаслава Быкава. Таму сведкамі мяркуемай тактыкі і стратэгіі братоўславян былі дзесяткі прадстаўнікоў СМІ з абодвух бакоў. Сярод зацікаўленых асобаў, якія ўважліва сачылі за цяперашнімі расійскімі зоркамі НХЛ Аляксандрам Авечкіным, Сяргеем Фёдаравым, Максімам Афінагенавым і іншымі хакеістамі, быў прэзідэнт Расійскай федэрацыі хакея Уладзіслаў Трацяк. «Слабо нашым камандам міравую «распісаць» у Дзень Перамогі?», — не без жарту звярнуўся я да трохразовага алімпійскага чэмпіёна. «Пакуль не буду каментаваць, — сказаў славуты ў мінулым галкіпер савецкай зборнай, — ды і ведаю, як з беларусамі можна дамовіцца пасля Санкт-Пецярбурга» — з намёкам на баявы настрой сваіх землякоў падкрэсліў Трацяк...

Дзіўная рэч — памяць. Прайшло роўна 8 гадоў з той пары, як 7 мая 2000 года зборная Беларусі на 64-м чэмпіянаце свету ў горадзе на Няве ў кваліфікацыйным раўндзе перайграла расіян з лікам 1:0, а нашы ўсходнія суседзі забыць гэта ніяк не могуць.

У другой палове дня, менш чым за суткі да адказнай гульні, настаўнік беларускай зборнай Курт Фрэйзер вывез сваіх падначаленых на прагулку ў стары горад Квебека, дзе размешчана шмат сувенірных лавак і можна бясконца любавацца шыкоўнымі архітэктурнымі ансамблямі сталіцы аднайменнай правінцыі. Відавочна, што такі ход амерыканскага трэнера не зусім ўспрымаецца славянскім менталітэтам, згодна з якім ігракі нацыянальнай зборнай у такі момант павінны сядзець на базе і нікуды не высоўвацца. А тут — поўная свабода, якая, на дзіва, не ідзе ў разрэз з правіламі паводзінаў прафесійных хакеістаў, дзе дзейнічае прынцып: кожны сам каваль свайго шчасця... Не бяруся сцвярджаць, што перадвячорні выезд «у людзі» натхніў беларусаў на заўтрашні подзвіг з расіянамі, але тое, што многія адчулі дадатковы прыліў адрэналіну ў кроў — бясспрэчна. Напрыклад, форварда «Манрэаль канадзіенс» Міхаіла Грабоўскага, якога суправаджалі бацька і дзед, на вулачках Квебек-Сіці неаднаразова абступалі дзеці, якія ведалі ў твар беларускага легіянера, і прасілі аўтограф. Адмовіць юным хакейным докам было немагчыма.

9 Мая, як дзень Перамогі, на канадскай зямлі не памечаны чырвоным колерам, хоць у гады вайны цэлы канадскі корпус удзельнічаў у фарсіраванні праліва Ла-Манш... Для кожнага ж славяніна — гэта свята ў душы. Ужо з раніцы беларускія і расійскія журналісты ў прэс-цэнтры Лядовага палаца Colisee Pepsi абменьваліся віншаваннямі. На вечар невялікая беларуская «дыяспара» ў складзе журналістаў-газетчыкаў, тэлевізійнікаў і найбольш адданых балельшчыкаў дамовіліся арганізаваць сумесны збор пры любым раскладзе матча Беларусь — Расія, і пад беларускае сала з «франтавымі» ста грамамі адзначыць свята.

Дарэчы, за некалькі гадзін да пачатку гульні ў Інтэрнэце з"явілася інфармацыя для тых, хто цікавіцца букмекерскімі стаўкамі на вынік матча. Стаўкі на Расію былі крышачку большымі. У сувязі з гэтым, відаць, кошт світара форварда «Вашынгтон Кэпіталз» Аляксандра Авечкіна ў сувенірных лаўках фае Лядовага палаца рэзка ўзрасла на 100 пунктаў — да 225 канадскіх долараў. У той час, як на аналагічную амуніцыю з сімволікай Беларусі, Швецыі, Чэхіі і іншых камандаў цана вагалася ў межах 140 долараў. Рынак ёсць рынак: прапановы фарміруюць попыт.

Пэўна, што пра матч беларусаў і расіян узору а-ля Канада ўжо шмат сказана-перасказана. Мужная і адчайная гульня беларусаў выклікала павагу ва ўсяго журналісцкага корпусу, які працуе ў прэс-цэнтры, у тым ліку і канадскіх журналістаў. У ранішнім выпуску штодзённай газеты «le Solei» сярод шэрагу спартыўна-хакейных навін шмат месца было аддадзена вынікам славянскага дэрбі, якое, як вядома, было выиграна расіянамі толькі па серыі булітаў. Дарэчы, па выніках гэтай сустрэчы галоўны трэнер беларусаў Курт Фрэйзер адзначыў, што «зборная Расіі падарыла нам багаты вопыт», які ў далейшым яго падначаленыя абавязкова скарыстаюць на сваю карысць. Настаўнік расіян Вячаслаў Быкаў падкрэсліў, што недацэнкі гульні сапернікаў не было. Адбітак на матч, паводле яго слоў, налажыў той факт, што многія ігракі добра ведаюць адзін аднаго. Пры гэтым абодва настаўнікі камандаў заявілі, што незадаволены вынікам сустрэчы. Таму спадар Фрэйзер без залішняй дыпламатычнасці заявіў, што «цяпер нам трэба перамагаць Чэхію».

Не ведаю, наколькі яго ўпэўненасць збіла з панталыку падначаленых Алоіса Адамчыка, але ж гульня прайшла практычна па сцэнарыю папярэдняй. У каторы раз можна шкадаваць, што нас «засуджваюць», калі суддзі залічваюць галы, забітыя сапернікамі ў нашы вароты нагой. Спачатку гэта быў швейцарац Юліян Шпрунгер, цяпер чэх Томаш Ралінек. Дарэчы, пасля матча Беларусь — Чэхія, які завяршыўся перамогай апошніх зноў па серыі булітаў, беларуская каманда падала пратэст у аргкамітэт чэмпіянату. Праўда, як паказвае практыка, такія апеляцыі застаюцца незадаволенымі ці будуць мець мінімальны эфект ад магчымага выніку. У любым выпадку перагульвання матча не будзе.

На пасляматчавай прэс-канферэнцыі Курт Фрэйзер адзначыў, што каманда Беларусі з кожным днём усё больш прыбаўляе. Калі б НХЛаўцы змаглі прыехаць на камандны збор тыднем раней, сказаў амерыканскі трэнер, то зборная Беларусі была б яшчэ больш згулянай і выступіла б больш паспяхова. Цяпер, паводле слоў Фрэйзера, беларусы будуць гуляць толькі на перамогу з Даніяй, бо ад колькасці набраных ачкоў у кваліфікацыйным раўндзе будзе залежаць пуцёўка на Алімпійскія гульні ў канадскі Ванкувер-2010. Без адбору на зімовыя Алімпійскія гульні аўтаматычна трапляюць 9 камандаў з 12. Дык вось на сёння беларусы займаюць у бягучым рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі хакея якраз запаветнае 9-е месца. Праўда, у спіну нам дыхаюць латышы і немцы. Таму ад іх вочнай сустрэчы, якая адбылася таксама ўчора позна ўвечары па канадскім часе ў Галіфаксе, вельмі шмат будзе залежаць для падначаленых Курта Фрэйзера.

У мікст-зоне, дзе журналісты могуць сустрэцца з хакеістамі згодна з папярэдняй заяўкай, якая запаўняецца падчас матча, пасля гульні Беларусь — Чэхія нашых было шмат: Міхаіл Грабоўскі, Руслан Салей, браты Касціцыны, галкіпер Віталь Коваль, які цяпер абараняе колеры гродзенскага «Нёмана». Надзейную гульню беларускага вартавога варот ужо паспелі прыкмеціць. Праўда, афіцыйных прапаноў наконт змены клуба, сказаў Коваль, яму пакуль не паступала. Да таго ж у яго з гродзенскім клубам яшчэ на год дзейнічае кантракт. Можна не сумнявацца, што стаўкі на Коваля яшчэ вырастуць, як, напрыклад, на расіяніна Аляксандра Авечкіна. На ўчарашні дзень яго фірмовая майка за 225 долараў ужо у многіх сувенірных лаўках была распрададзена. Праўда, гэты цэннік — не самы дарагі на хакейным сяле ў Квебеку. Майка канадскага форварда Дэні Хітлі з «Атавы Сенатарз» вывешана за 250 канадскіх долараў. Праўда, гэты тавар пакуль не ў модзе, паколькі гаспадары чэмпіянату свету-2008 праводзяць свой першы адрэзак, прычым вельмі ўпэўнена, у Галіфаксе.

Вельмі хацелася, каб узроўню папулярнасці канадцаў Дэні Хітлі, Сідні Кросбі, Рыка Нэша, Эрыка Стаала, які напярэдадні забіў чатыры галы ў вароты зборнай Германіі, дасягнулі і нашы НХЛаўцы. Магчыма, так яно і будзе. Бо тут, у Квебеку, на Міхаіла Грабоўскага наладзіў сапраўдную псіхалагічную атаку прэзідэнт хакейнага клуба «Дынама» (Масква) Міхаіл Галаўкоў з выгаднай прапановай пераехаць з Манрэаля ў белакаменную. Не менш ахвотнікаў і да братоў Касціцыных. Не дзіўна, што пасля матча з чэхамі ў мікст-зоне Сяргей і Андрэй доўгі час былі ў цэнтры ўвагі перад фотааб`ектывамі многіх рэпарцёраў. Яны падпісвалі хакейную майку юнаму беларускаму хлопчыку Матэо-Яўгену, якога прывезла на матч з Манрэаля сямейная пара Наталі і Дональд Дзеб`ен. Яшчэ ў 2004 годзе гэтая кандская сям`я ўсынавіла з гомельскага дзіцячага дома-інтэрната паўтарагадовага Яўгена, хворага на туберкулёз. У Манрэалі юнага беларуса вылечылі і прывілі любоў да хакея. Праўда, цяпер у яго двайное я — Матэо-Яўген і з'яўляецца ён прыхільнікам Андрэя і Сяргея Касціцыных. Адметна, што новыя тата і мама расказваюць малому пра Беларусь і збіраюцца навучыць яго роднай мове.

У Квебеку практычна ўсе размаўляюць на французскай мове. У сувязі з гэтым на прэс-канферэнцыях узнікаюць часам нестандартныя сітуацыі. Напрыклад, чэшскі трэнер расказвае прысутным журналістам, у тым ліку расіянам і беларусам, на роднай чэшскай мове. Адразу ідзе пераклад на французскую. А вось перакладчыкаў з французскай на англійскую, каб потым перакласці на рускую мову, няма. Прыйшлося толькі здагадвацца, як спадар Аloіс Адамчык ацэньвае сітуацыю, калі яго падначаленыя забілі гол у вароты беларусаў нагой. Па-французску пачаў сваю прамову і галоўны трэнер расіян Вячаслаў Быкаў. Праўда, калі аказалася, што ў зале для прэс-канферэнцыі практычна ўсе журналісты з Расіі і Беларусі, то ўсталявалася мёртвая цішыня, якая ў хуткім часе змянілася гучным смехам. Што называецца, вучыце замежныя мовы, спадарства.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
г. Квебек

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПАВЫСІЦЬ ПРЭСТЫЖ МОВЫ Ў НАШЫМ ГРАМАДСТВЕ

З першых вуснаў

У Палаце прадстаўнікоў спецыяльна створанай рабочай групай падрыхтаваны да разгляду ў другім чытанні праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Зараз дакумент знаходзіцца на ўзгадненні ў Адміністрацыі Прэзідэнта нашай краіны. Ёсць усе падставы лічыць, што на бягучай сесіі ў другім чытанні ён будзе прыняты.

Нагадаю, што да гэтага часу ў рэспубліцы выкарыстоўваюцца два варыянты правапісу: масава — так званая «наркомаўка» і нязначна — «клясычны правапіс Тарашкевіча». Вялікай бяды ў гэтым, магчыма, і не было б, калі б праблемы адзінства арфаграфічных норм не набылі палітычнае адценне. Мікраскапічная па колькасці, апазіцыйна настроеная частка насельніцтва, нягледзячы на непараўнальна большую колькасць людзей, выкарыстоўваючых афіцыйны правапіс, пачала выказваць патрабаванне вярнуцца да дарэформенай арфаграфіі, прычым пад лозунгам «хто не з намі, той — не сапраўдны беларус, вораг». У выніку насельніцтва пачало баяцца роднай беларускай мовы! Больш таго, існаванне двух варыянтаў арфаграфіі стала не толькі перашкаджаць развіццю беларускай мовы, памяншаць колькасць жадаючых вывучаць яе і размаўляць на ёй, але і штучна стварыла ўмовы для бессэнсоўнай барацьбы паміж беларусамі з-за напісання таго ці іншага слова. Вось асноўная прычына зацвярджэння новых правіл у форме закона. Унармаванасць дзяржаўнай мовы, захаванне адзінства арфаграфічных норм маюць важнае дзяржаўнае і палітычнае значэнне, бо, забяспечваючы стабільнасць у сферы моўнай камунікацыі, спрыяюць спакою і згодзе ў нашым грамадстве. І яшчэ, беларускі правапіс пабудаваны на фанетычным прынцыпе і вельмі адчувальны да змен у моўнай практыцы, таму незалежна ад жадання асобных людзей удасканальваўся раней і будзе перыядычна ўдасканальвацца ў будучыні.

Думаю, што ў чытачоў выклічуць пэўную цікавасць некаторыя вытрымкі са сценаграмы Нарады ЦК КП(б)Б па пытанні аб папраўках і ўдакладненнях у беларускім правапісе, якая адбылася ў Мінску ў далёкім сакавіку 1940 года: «У тым, што правапіс не на вышыні патрабаванняў, мы не сумняваемся ўсе таму, што кожны дзень на практыцы гэта адчуваецца ў працы школ, у працы нашых выдавецкіх устаноў і ўсіх адукаваных людзей... У нашым правапісе ёсць момант, калі напісанае не знаходзіць адлюстравання ў жывой мове... Правапіс таксама павінен быць лёгкім з пункту гледжання засваення... Мы разумеем, што беларуская і руская мовы маюць многа агульнага і там, дзе ёсць агульнае, трэба яго захаваць, а не ігнараваць, але стрыгчы беларускі правапіс пад рускі было б няправільна і ненавукова... Нам здаецца, што гэтыя рэформы вельмі непадрыхтаваныя, скараспелыя. Яны каштуюць дзяржаве мільёны грошай: гэта звязана з перавыданнем усіх падручнікаў. А ў выніку людзі, якія вучыліся па іншых правілах, застаюцца неадукаванымі. Таму трэба вельмі асцярожна падысці да гэтай рэформы...» На гэтай нарадзе прысутнічаў і прымаў актыўны ўдзел у абмеркаванні правапісу і наш знакаміты Якуб Колас: «Што такое арфаграфія? Гэта проста ўмоўныя, у значнай ступені, нормы, якія заснаваныя на аснове жывой мовы, прынятыя і зацвярджаныя для агульнага карыстання ў практычным нашым жыцці... Чуеш часам перадачы з Мінска і мову так каверкаюць, што хочацца ад злосці кулаком па радыё стукнуць, хоць радыё вельмі харошае і яно тут ні пры чым...»

Быццам і не аддзяляюць нас больш чым паўстагоддзя ад падзей таго часу...

Тыя ж пытанні, тыя ж праблемы і прапановы, але ўжо ў наш час на працягу года абмяркоўваліся і рашаліся сумесна навукоўцамі і намі, дэпутатамі.

Па нашаму агульнаму меркаванню, падрыхтаваная новая рэдакцыя «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» з'яўляецца найбольш аптымальнай у сучасных умовах і адпавядае патрабаванням сучаснай моўнай практыкі. Унесеныя ў «старыя» правілы змены і ўдакладненні не кранулі асноўныя палажэнні і прынцыпы пісьмовай беларускай мовы. Яны накіраваны на ўніфікацыю сучаснага беларускага правапісу і змяншэнне колькасці выключэнняў.

Змены ў новай рэдакцыі ў асноўным звяліся да наступнага:

— удакладнены многія фармулёўкі правіл у адпаведнасці з сучасным узроўнем лінгвістычнай навукі;

— дзеля зручнасці засваення правілы па-новаму згрупаваны;

— пашыраны прынцып «акання» ў словах іншамоўнага паходжання;

— унесены змены ў напісанне складанаскарочаных слоў. Пасля ўступлення закона ў дзеянне будзем пісаць «прафкам», «гаркам», «газпрам» замест «гарком», «прафком», «гарком» (бо выкарыстоўваем слова «камітэт», а не «комітэт»);

— пашыраецца напісанне «ў» у словах іншамоўнага паходжання: («каля ўніверсітэта» замест «каля універсітэта» і г.д.);

— уніфікавана напісанне прыметнікаў на -ск(і), утвораных ад уласных назваў: любанскі, цяньшанскі (раней пісалі любанскі без мяккага знака, а цяньшанскі — з мяккім);

— на радасць школьнікам значна спрошчаны перанос слоў. Фактычна будзе дазволены свабодны перанос са спалучэннем зычных паміж галоснымі, што поўнасцю ўзгадняецца з сучаснай практыкай выдання друкаванай прадукцыі. Калі ў сярэдзіне слова паміж галоснымі маецца спалучэнне зычных, то пераносіцца на наступны радок або ўсё гэта спалучэнне, або любая яго частка. Можна пераносіць: ся-стра, сяс-тра, сяст-ра; во-стры, вос-тры, вост-ры; пту-шка, птушка; кро-пля, кроп-ля і г.д. Нельга толькі пры пераносе пакідаць або пераносіць на наступны радок адну літару; разбіваць пераносам спалучэнні літар дж і дз, калі яны абазначаюць адзін гук; аддзяляць ад папярэдняй галоснай літары й і ў; аддзяляць мяккі знак (ь) і апостраф ад папярэдняй зычнай. Можна: буль-ба, бур'-ян, нельга: проль-ба, мыш-'як;

— як знак асобай павагі з вялікай літары будуць пачынацца ўсе словы ў назвах дзяржаўных і нацыянальных, ваенных і культурных рэліквій: Сцяг Перамогі, Крыж Еўфрасінні Полацкай, Курган Славы, Вострая Слёза, Помнік Перамогі, а ў высокім стылістычным ужыванні таксама такія агульныя назвы, як Радзіма, Айчына, Бацькаўшчына, Чалавек, Маці;

— упарадкавана напісанне вялікай і малой літары ў назвах органаў улады, арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, а таксама ў назвах асоб па пасадах, званнях, тытулах: Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь (Мінэканомікі), Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Міжнародны алімпійскі камітэт, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Герой Беларусі;

— уведзены новы параграф «Вялікая і малая літары ў назвах асоб, звязаных з рэлігіямі, назвах міфалагічных і казачных герояў». З вялікай літары будуць пачынацца: назвы найвышэйшых божастваў у рэлігійных культах, а таксама ўсе словы ў словазлучэннях, якія ўтрымліваюць гэтыя назвы: «Бог», «Усявышні», «Святая Тройца»; прыметнікі, утвораныя ад слова Бог: Божы (Боскі) суд, Божая (Боская) міласць; асабовыя імёны (і ўсе словы ў састаўных асабовых назвах, акрамя агульных назваў) заснавальнікаў рэлігійных вучэнняў, а таксама біблейскіх асоб (апосталаў, прарокаў, святых і інш.): Ісус Хрыстос, Буда, Брахма, Святы Павел; імёны легендарных і міфічных асоб, язычніцкіх багоў: Антэй, Зеўс, Тытан, Венера, Джбог, Пярун, Каін, Цмок, але як агульныя назвы: пярун — удар грому, цмок — змей, тытан — волат; уласныя назвы ўяўных і казачных істот, герояў літаратурных твораў: Чырвоная Шапачка, Калабок, Баба Яга, Пегас, Буцэфал, Атлант, але як агульныя назвы: баба-яга — агідная старая, буцэфал — стары конь, атлант — у архітэктуры; агульныя назвы істот, а таксама з'яў і прадметаў, калі яны персаніфікуюцца, выступаюць у ролі імёнаў герояў літаратурных твораў (у казках, байках і інш.): Ліса (Ліска), Заяц (Зайка), Каза-дзераза, Коцік-варкоцік, Варона, Праўда, Крыўда, Смерць і інш;

— у словах «дзевяты», «дзесяты», «семнаццаць», «васемнаццаць» літара «е» будзе заменена на «я»;

— са «старых» Правіл выключана частка раздзелаў, якія не мелі адносін да арфаграфіі і пунктуацыі (галосныя ў некаторых ненаціскных канчатках назоўнікаў, некаторых канчатках прыметнікаў, займеннікаў, лічэбнікаў і ў ненаціскных асабовых канчатках дзеясловаў);

— шматлікія састарэлыя прыклады да асобных пунктаў правіл заменены на больш сучасныя. Можна нават сказаць, што правілы сталі больш патрыятычнымі і мірнымі, у адрозненне ад ранейшых «ваенізаваных» і «палітызаваных». У іх змесце з'явіліся тыповыя беларускія геаграфічныя і гістарычныя найменні: Лысая гара (найвышэйшы геаграфічны пункт Беларусі), Мінскае мора, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, Картуз-Бяроза, Панямонне і інш.; прозвішчы знакамітых людзей Беларусі: Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька, Іван Дамінікавіч Луцэвіч (Янка Купала), Алаіза Пашкевіч (Цётка) і інш.; беларускія прамысловыя і іншыя вырабы: трактар «Беларус», тэлевізар «Гарызонт»; дзяржаўныя ўзнагароды: ордэн Айчыны I (II, III) ступені, ордэн Маці, ордэн Пашаны, ордэн Францыска Скарыны; назвы дзяржаўных, традыцыйных і рэлігійных святаў: Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі), Дзень беларускай навукі, Дзень ведаў, Радаўніца, Вялікдзень, Каляды, Купалле, Дабравешчанне і шмат іншага, адметнага для нашай краіны.

Закон павінен будзе выконвацца ўсімі, аб чым сведчыць адпаведны запіс, зроблены ў ім. Аднак тым, хто займаецца бізнесам, як і наогул усім беларусам, не патрэбна баяцца ўвядзення новых правіл, бо дадатковых трат ніхто з іх не панясе. Пры неабходнасці замену пячатак, штампаў, бланкаў дакументаў, шыльд і да таго падобных рэчаў плануецца правадзіць па меры іх зношвання.

Наконт газеты «Наша ніва», часопіса «Археа» і інтэрнэтнай Выкіпедыі, якія беспадстаўна лічаць сябе «культурным сымбалем і жывой традыцыяй беларусаў». Па-першае, тыраж азначаных выданняў вельмі ж нязначны, каб рабіць нейкія выключэнні і з-за іх уносіць разнабой у правапіс ці захоўваць два яго варыянты. А па-другое, уявіце сабе наступную сітуацыю: стварэцца, напрыклад, закон аб правапарушэннях і адказнасці за іх. І вось законатворцы запісваюць: усе грамадзяне краіны павінны весці сябе прыстойна, у іншым выпадку іх чакае пакаранне. А потым дадаюць: але асобным грамадзянам дазваляецца рабіць правапарушэнні. Гэта будзе закон?.. Мабыць не, хутчэй пародыя на яго. Так мы мяркуем. Закон пішацца для ўсіх і павінен выконвацца ўсімі. Таму пасля ўступлення яго ў сілу ўсе арганізацыі, дзяржаўныя ці прыватныя, усе грамадзяне краіны ці асобы без грамадзянства, замежныя грамадзяне, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, пры выкарыстанні пісьмовай беларускай мовы павінны кіравацца Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, зацверджанымі Законам.

Іяшчэ, наша камісія з'яўляецца самай мірнай і не разглядае законы аб нейкіх пакараннях. Мы працуем над заканадаўствам у галіне адукацыі, культуры і навукі. Пытаннямі «за што, каму і колькі» займаюцца іншыя. Наогул, тэхнічна сам закон складаецца з адной толькі старонкі, на якой запісана аб зацвярджэнні Правіл, аб неабходнасці карыстацца Правіламі пры ўжыванні пісьмовай беларускай мовы і аб тэрміне ўступлення дадзенага закону ў сілу (1 верасня 2010 года). На гэта ў першую чаргу скіроўвалася ўвага дэпутатаў, як законатворцаў. А вось непасрэдна змест саміх правіл распрацаваны іншымі людзьмі — вучонымі: дактарамі і кандыдатамі навук з Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, БДУ, Нацыянальнага інстытута адукацыі, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. І гэта правільна, бо напісанне той ці іншай літары, пастаноўка косак ці нейкія іншыя спецыфічныя дэталі ў першую чаргу — прэрагатыва спецыялістаў. Тым не менш, у кожнага дэпутата хапала адукацыі, каб паставіць пытанне, калі нешта не зразумела, ці ўнесці свае прапановы, калі ў нейкіх месцах спрэчкі паміж вучонымі не спыняліся.

І сапраўды, часам узнікалі такія пытанні, якія патрабавалі вывучэння замежнага вопыту ці ведання меркавання іншых арганізацый, якім прыходзіцца выкарыстоўваць беларускую мову. Да прыкладу, зараз усім вядомы японскі горад будзем запісваць як «Токіа» (раней — «Токіо»). Але, як вядома, у красавіку 2006 года ў Вене (Аўстрыя) працавала 23-я сесія Групы экспертаў ААН па геаграфічных найменнях, якая заклікала ўсе краіны да больш дакладнага выкарыстання геаграфічных найменняў. Сапраўды, тут ёсць адна тонкасць. Адна справа — транслітарацыя літар «лацініцы» літарамі беларускага алфавіту ці наадварот, і зусім іншая — транслітарацыя японскіх іерогліфаў. Адзінага меркавання сярод вучоных не было. Намі была прынята да ўвагі міжнародная практыка: любая ўласная назва ў падаўляючай большасці выпадкаў валодае нацыянальнамоўнай прыналежнасцю. З другога боку, з такімі праблемамі часта сустракаюцца дыпламатычныя ўстановы. Адказ на наш запыт у Міністэрства замежных спраў быў наступны: «Змяненне правіл беларускай арфаграфіі не адаб'ецца на выкананні Рэспублікай Беларусь абавязкаў па міждзяржаўных, міжурадавых дагаворах, а таксама па іншых дагаворах і не паўплывае на палітычны імідж нашай дзяржавы на міжнародным арэне». Запэўніла нас і Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, чыя дзейнасць таксама непасрэдна звязана з выкарыстаннем беларускай мовы, у тым, што ўвядзенне новага правапісу і на яе дзейнасці не адаб'ецца.

Дарэчы, у самым пачатку працы рабочай групы над праектам «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» было дамоўлена, што калі па нейкіх новаўвядзеннях будуць процілеглыя, узаемавыключаючыя меркаванні, то за аснову будзем браць правілы 1959 года ці шукаць разумны кампраміс. І мы прытрымліваліся такой дамоўленасці. Так, каб паменшыць колькасць выключэнняў і пашырыць прынцып «акання», прапанавалася заканадаўча замацаваць напісанне літары «о» толькі пад націскам. Але ж узнікла вельмі шмат супярэчнасцей, асабліва ў словах іншамоўнага паходжання, складаных словах, навуковых тэрмінах. Часам нават змяняўся першапачатковы сэнс слоў: звыклы мотакрос станавіўся матакросам, манголазнаўства — мангалазнаўствам, матаразборка (зборка матора) — матараборкай (разборкай мата), Пітэр — Пітарам і інш. Таму ненаціскныя фіналі -эль, -эр ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання будуць перадавацца, як і раней, нязменна (вуліца Ландэра, планета Юпітэр, рака Одэр і інш.). А вось у астатніх выпадках яны пяройдуць у -аль, -ар (камп'ютар, прынтар, менеджар і г.д.). Калі ёсць выразны пабочны націск у першай частцы складанага слова, то ў ёй захоўваецца літара о: мовазнаўства, электронвольт (прапанавалася: мавазнаўства, электранвольт). У невыразных выпадках напісанне падобных слоў будзем вызначаць па слоўніку.

У складанаскарочаных словах, першая частка якіх заканчваецца на зычны, прапанавалася замест і пісаць ы: гарынспектар, кантрыдэя, педынстытут. Выпрацаваны кампрамісны варыянт: пасля прэфіксоідаў (звыш-, між-, пан-, супер-, транс-, контр-), а таксама ў складанаскарочаных словах, першая частка якіх заканчваецца на цвёрды зычны, літара і захоўваецца. Таму будзем па-ранейшаму пісаць: гарінспектар, контрідэя, педінстытут і інш.

Адзначу, што ў камісію за час працы над праектам закона паступіла шмат прапаноў, многія з якіх знайшлі адлюстраванне ў яго змесце. Але ж не ўсе. Цяжка пагадзіцца, а тым болей ясна патлумачыць, чаму патрэбна прымаць змены накшталт: пісаць камандовачны замест звыклага і зразумелага камандзіровачны, ці цэзь замест цэзій, прэзід замест прэзідыум, або пры скарачэнні слоў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт ператвараць у БдзУ. (Дарэчы, калі імя або імя па бацьку пачынаюцца з дыграфа Дз, то ініцыялам будзе выступаць толькі літара Д: Дзмітрый Дзмітрыевіч — Д.Д.). Беларуская мова сапраўды «мяккая», але навошта ж «перасольваць», амаль усюды ўстаўляючы мяккі знак. Напрыклад: сьцяг, сьнег, разьядноўвацца, сьвяціцца, прасьпект.

Нашы ўласныя прапановы таксама не ўсе прайшлі. Не атрымалася пакуль усе словы ў назвах Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пачынаць з вялікай літары, бо, па меркаванню юрыстаў, будзе супярэчанне з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Канечне, распрацаваныя правілы ў новай рэдакцыі не знялі ўсе праблемы беларускага правапісу. Так, сучасная моўная практыка мае патрэбу ў больш строгім вызначэнні правапісу канчаткаў часцін мовы (яблык ці яблыкаў, з закону ці з закона, шмат народу, але творчасць народа і г.д.), але ж у правілах не знойдзем такой інфармацыі, бо гэта праблема не арфаграфіі і тым больш не пунктуацыі. Мабыць, патрэбна ў будучым стварыць асобны «твор».

І ўсё ж мы спадзяёмся, што падрыхтаваны намі закон стане сведчаннем дзяржаўнага рэгулявання ў сферы моўнай палітыкі і практыкі, будзе садзейнічаць стабілізацыі арфаграфічных норм беларускай пісьмовай мовы, забяспечыць адзіны моўны рэжым у школьнай адукацыі, адзінства роднай мовы ў друкаваных беларускамоўных выданнях, што ў выніку павысіць яе прэстыж у нашым грамадстве.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу
Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Ёсць меркаванне

НЕЙТРАЛЬНАЯ ПАЛАСА,

або погляд старонняга назіральніка на школьную рэформу

Вось ужо 10 гадоў з пераменным поспехам ідзе спрэчка дзвюх партый у адукацыі, якім шляхам трэба ісці нашай сярэдняй школе. Адзін бок адстойвае 11-гадовую школу, другі — 12-годку. Большасць жа насельніцтва Беларусі знаходзіцца на нейтральнай паласе, і прытрымліваецца старой класічнай школьнай праграмы. Нават той школьнай праграмы, якая дасталася нам у спадчыну ад Савецкага Саюза.

Як вы мяркуеце, чаму ў Савецкім Саюзе быў дасягнуты высокі ўзровень падрыхтоўкі ў школах? Таму што ў яе аснову была пакладзена сістэма падрыхтоўкі гімназістаў да 1917 года. Бальшавікі гэту сістэму не зламалі, а, наадварот, узялі на ўзбраенне, што дало ім магчымасць перамагчы і пабудаваць індустрыяльна развітую дзяржаву з высокім узроўнем ведаў навучэнцаў у школах і ВНУ краіны. Хачу вярнуць чытачоў у 50—60-я гады XX стагоддзя, калі амерыканцы ўпершыню зацікавіліся, чаму Савецкі Саюз абагнаў іх у асваенні космасу, развіцці навукі і тэхнікі... Высветлілася, што ўзровень адукацыі савецкай школы быў на парадак вышэйшы, чым амерыканскай. Дык чаму, скажыце, мы павінны адыходзіць ад класічнай школы і размываць яе пад выглядам 12-гадовай рэформы, беручы на ўзбраенне амерыканскія ўзоры і тэсты?

Асабіста я перакананы, што падрастаючае пакаленне павінна развівацца рознабакова, і не трэба яшчэ ў школе дзяліць вучняў на будучых інжынераў, юрыстаў, токараў і ўрачоў. На мой погляд, у школе павінна быць 75—80 працэнтаў выкладчыкаў-мужчын. Гэта мера дазволіць павысіць узровень адукацыі і дысцыпліны ў школе. Але для прыцягнення ў навучальныя ўстановы педагогаў-мужчын трэба распрацаваць дзяржаўную стратэгію.

Выкажу яшчэ адно меркаванне старонняга назіральніка. Неабходна прывесці ўсе школы, гімназіі і ліцэі да адной дзяржаўнай роўніцы: школы або гімназіі. Мне больш даспадобы перайменаваць усе школы ў гімназіі, і тым самым зняць штучны падзел на элітарнасць адных і ўшчэрбнасць у назве іншых. Сярэдняя школа павінна быць аднароднай па сваёй вучэбнай праграме, з адзінай дзяржаўнай адукацыйнай праграмай як у Мінску, так і ў Століне. А што мы назіраем на практыцы? Прыём у гімназіі і ліцэі адбываецца на конкурснай аснове. Са звычайных школ забіраюць і адсейваюць адораных вучняў, тым самым зніжаюць узровень агульнай паспяховасці і адбіваюць жаданне вучыцца ў іншых. На каго, скажыце, ім раўняцца? Яны адчуваюць сябе людзьмі другога гатунку. Разам з тым у вучня за 11 гадоў вучобы бываюць перыяды ўзлётаў і падзенняў.

Прывяду асабісты прыклад. У 4-м класе мы сапернічалі ў вучобе з маім аднакласнікам. На адным тыдні яго і мой дзённікі былі выстаўлены на школьнай вітрыне паспяховасці: у мяне за тыдзень 28 «пяцёрак», а ў яго — 26. У хуткім часе бацькоў сябра перавялі ў іншы горад. У мяне ў дзённіку з'явіліся «тройкі» і «чацвёркі», а школу я скончыў сераднячком. Затое пазней дзве ВНУ я скончыў з чырвонымі дыпломамі, таму што ў мяне зноў з'явіліся стымулы да вучобы.

Выкладчык павінен даваць штуршок і накіроўваць вучня па дарозе ведаў. А на практыцы ён заняты рознымі справаздачамі і праверкамі. Раней у гарана ішлі працаваць метадысты, выкладчыкі, якія працавалі прадметнікамі і завучамі ў школе па 15—20 гадоў і маглі многаму навучыць школьнага настаўніка, а цяпер там працуюць людзі, далёкія ад рэальных праблем і патрэбаў вучняў і школы.

Дазвольце выказацца мне яшчэ па адным пытанні. Часта бывае сорамна глядзець па тэлевізары розныя «інтэлектуальныя шоў», дзе 25—30-гадовыя людзі не могуць даць адказ на элементарныя пытанні. Пры гэтым яны прадстаўляюцца менеджарамі, эканамістамі, выкладчыкамі замежных моў і г.д. Атрымліваецца, што развіты і адукаваны яны аднабакова, кожны ў сваёй сферы. Дарэчы, 12-гадовая школа робіць акцэнт якраз на навучанне па адным—двух прадметах. Цікава, адкуль такая методыка? А гэта, між іншым, амерыканская школа, вучань якой не ведае, дзе знаходзіцца Арктыка і Антарктыка, ды і наогул не цікавіцца нічым за межамі Амерыкі. Гэта, дарэчы, не датычыцца выпускнікоў элітарных школ, дзе ўзялі на ўзбраенне нашу савецкую школу (дакладней, яе методыку і праграмы навучання).

Хачу звярнуць увагу на яшчэ адзін важны аспект з жыцця школы. Пазакласнае чытанне літаратуры практычна знікла з практыкі школ. А што ў рэальным жыцці? У школьнай або гарадской бібліятэцы ў картцы старшакласніка 7—8 прачытаных з горам папалам кніг па школьнай праграме. Прычым наведваюць бібліятэкі не больш як 20 працэнтаў школьнікаў. Цалкам падтрымліваю думку навукоўцаў Рубінава і Мясніковіча па 11-гадовай школе, разам з тым прапаноўваю для вучняў 7—11 класаў распрацаваць на 5 гадоў абавязковы спіс літаратуры для самастойнага прачытання з 350—400 кніг. Гэтыя кнігі павінны дапоўніць і сістэматызаваць веды вучня па літаратуры, гісторыі, геаграфіі, хіміі, матэматыцы, астраноміі, біялогіі, педагогіцы, псіхалогіі, медыцыне, фантастыцы, рэлігіі і г.д. Вынікам іх прачытання павінен стаць экзамен-субяседаванне ў канцы навучання ў сценах сярэдняй школы і на ўступных экзаменах у ВНУ.

Ёсць у школе і яшчэ адзін важны бок жыцця. Не трэба забываць, што вучань павінен быць фізічна развіты і здаровы. Таму ні ў якім разе нельга змяншаць у школьнай праграме гадзіны па фізічнай культуры і занятках спортам. Клапаціцца аб здароўі падрастаючага пакалення трэба яшчэ ў школьных сценах.

Уладзімір КСЁНЗ.

г. Ліда.

Ці належыць даплата за вучоную ступень сумяшчальніку?

Пытальнік

З пачатку гэтага года дзейнічае новы парадак устанаўлення даплат за вучоныя ступені і званні. У сувязі з гэтым хацелася б даведацца, ці можа даплата за вучоную ступень і званне быць прызначана выкладчыку-сумяшчальніку? А таксама ці могуць быць установлены такія даплаты ў прыватных установах адукацыі? Як і за кошт якіх сродкаў?

Я.Ш., *г. Мінск.*

Як патлумачыў намеснік старшыні ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі Раман Дапіра, згодна з пунктам 3 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб устанаўленні даплат за вучоныя ступені і званні», даплаты за вучоныя ступені і званні выкладчыкам-сумяшчальнікам выплачваюцца па месцы працы (службы) прапарцыянальна фактычна адпрацаванаму часу ці аб'ёму выкананых работ. Такім чынам адмова ў прызначэнні выкладчыку даплаты за вучоныя ступені і званні за фактычна адпрацаваны час ці аб'ём выкананых работ у арганізацыі адукацыі, дзе ён працуе па сумяшчальніцтву, па прычыне прызначэння такой даплаты па асноўным месцы працы супярэчыць Указу і пагаршае ўмовы аплаты працы работнікаў у параўнанні з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Зыходзячы з таго, што Указ устанаўлівае даплаты за вучоныя ступені і званні, а таксама парадак іх прызначэння адпаведным катэгорыям педагагічных работнікаў выключна дзяржаўных арганізацый адукацыі, прыватныя ўстановы адукацыі могуць самастойна ўстанаўліваць памеры і парадак прызначэння аналагічных даплат. У адпаведнасці з артыкулам 63 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь формы, сістэмы і памеры аплаты працы работнікаў, у тым ліку і дадатковыя выплаты стымулюючага і кампенсуючага характару, устанаўліваюцца наймальнікам на падставе калектыўнага дагавора, пагаднення і працоўнага дагавора, г.зн. за кошт уласных сродкаў. Такім чынам, рашэнне аб памерах і парадку прызначэння даплат за вучоныя ступені і званні можа быць прынята шляхам унясення змяненняў і дапаўненняў у калектыўны дагавор і (ці) працоўныя дагаворы (кантракты) з адпаведнымі работнікамі.

Гужавы караван

Цэлы караван украінскіх гужавых павозак затрымалі беларускія памежнікі ў Пінскім раёне.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, грамадзяне суседняй дзяржавы на 5 вазах падпольнымі дарогамі нелегальна перавозілі адзенне, дызельнае паліва і спіртныя напоі. Усяго ў кантрабандыстаў канфіскавана 39 валізаў з адзеннем, 71 бутэлька гарэлкі і 180 літраў саляркі. Дарэчы, на гэтым жа ўчастку граніцы быў затрыманы яшчэ адзін украінскі кантрабандыст, які пераплыў нашу мяжу на маторнай лодцы. Падчас агляду плывучага сродку ў ім былі знойдзены дывыны і дзіцячыя веласіпеды.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ПЧАЛІНАЯ ТЭРАПІЯ — натуральнае выздараўленне

Прамая лінія

На пытанні чытачоў адказвае загадчыца неўралагічнага аддзялення Медыцынскага цэнтра Мінскага трактарнага завода, кандыдат медыцынскіх навук Святлана РОЎДА.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 30 красавіка і 8 мая.)

☎ — З Вілейкі тэлефануе Соф'я Іванаўна. Якія могуць быць пабочныя эфекты пры лячэнні метадам апітэрапіі?

— Пабочныя эфекты могуць быць звязаны як з асаблівасцямі стану хворага, так і з няправільнай методыкай правядзення працэдуры, напрыклад, з хуткім нарошчваннем дозы яду, перавышэннем лячэбнай дозы пры дадзенай паталогіі, няправільным спалучэннем кропак. Праяўляцца яны могуць рознымі вегетатыўнымі рэакцыямі, таксічнымі і алергічнымі станамі, пагаршэннем стану па асноўным ці спадарожных захворваннях.

☎ — Сяргей з Клецка. Колькі часу цягнецца курс лячэння апітэрапіяй?

— Ёсць розныя курсы — у залежнасці ад паталогіі: кароткія, доўгія, падтрымліваючыя. Напрыклад, пры захворваннях перыферычнай нервовай сістэмы правадзяцца сярэднія або кароткія курсы — 12—15 сеансаў праз дзень. Лячэнне займае каля 1,5 месяца. Калі гэта рэўматычная паталогія, то часам робіцца да 500 пчолаўджаленняў, і лячэнне зацягваецца на 2—3 месяцы. Пры такім захворванні, як рассеяны склероз, курсы кароткія і малымі дозамі.

☎ — Андрэй Філіпавіч звоніць з Жыткавіцкага раёна. У мяне астэахандроз шыйнага аддзела пазваночніка, пастаянны моцны боль у шыі, аддае на вочы, галаву, баляць рукі па начах, стаіць шум у вушах, трашчыць шыя. У раёне ўрачы дапамагчы не могуць. Прымаў розныя лекі. Апошнімі былі найз і дыклафенак. Не дапамагаюць. Гімнастыка таксама не дапамагае. Ці можа быць, што я больш узмацняю сваю хваробу вярчальнымі рухамі пазваночніка, сціраю храсток паміж пазванкамі?

— Сапраўды, вельмі часта пацыенты робяць вярчальныя рухі, якія не дапамагаюць, а часам абвастраюць працэс і могуць прыводзіць да ўскладненняў. Вам бы я параіла звярнуцца да інструктара па лячэбнай фізкультуры, які пакажа правільныя практыкаванні. Дарэчы, стан яшчэ залежыць і ад узросту. У людзей сталага веку ўжо некалькі зменены сасуды. Вярчальныя рухі могуць правакаваць спазм пазваночнай артэрыі, якая праходзіць у канале жорсткага аддзела пазваночніка. Ад гэтага і можа быць шум у вушах, галаўныя болі, праблемы з вачамі.

☎ — Званю з Рагачоўскага раёна, завуць Святлана Міхайлаўна. 13 лютага я ўдарыла плячо. Пачала балець рука ва ўсіх суставах, ажно да самых пальцаў. Рабіла ўколы з дыклафенакам, розныя мазі спрабавала, сродкі народнай медыцыны выкарыстоўвала. Нічога не дапамагае. Як быць?

— Паколькі была траўма, неабходна зрабіць рэнтгенаграму, выключыць посттраўматычныя змяненні ў суставе з пашкоджаннем касцей. Калі гэтага няма, у наяўнасці або ўдар, які баліць вельмі доўга, або абвастрэнне на фоне траўмы астэахандрозу з такімі неўралагічнымі праявамі. З нетрадыцыйных метадаў лячэння можна парэкамендаваць пчолаўджаленне і прымяненне прадуктаў пчалярства.

☎ — Званю са Стоўбцаў. Анатоль, мне 54 гады. Ёсць болі ў пятачнай частцы, перыядычныя, моцныя. Што параіце, як лячыць?

— Хутчэй за ўсё, у вас ідзе нейрадыстрафічны працэс мяккіх тканак вакол пятачнай косці. Магчыма, ёсць і шып. Каб удакладніць прычыну, трэба зрабіць здымак ступні, непасрэдна пятачнай косці. З метадаў лячэння эфектыўныя апітэрапія, лазератэрапія, правадзяцца доўгія паўторныя курсы. Можна выкарыстоўваць ультрагук, гразевыя аплікацыі. Прымяняецца разам з гэтым і стандартнае медыкаментознае лячэнне, якое ўключае нестэроідныя супрацьзапаленчыя сродкі, прэпараты, якія паляпшаюць мікрацыркуляцыю, хондрапратэктары.

☎ — Званю з Глыбокага, завуць Валянціна. У маёй сястры дыягназ — цыроз печані. А яшчэ ў яе вельмі баляць суставы. Ці можна пры цырозе прымаць радонавыя ванны, каб палегчыць боль у суставах?

— Гэта павінен вырашаць урач-фізіятэрапеўт, які будзе прызначаць такое лячэнне. Бо цыроз печані бывае рознай ступені выражанасці, і функцыя гэтага органа можа быць у рознай ступені парушана, і дозы радону могуць быць розныя. У кожным канкрэтным выпадку вырашае доктар.

☎ — Тэлефануе Людміла Васільеўна з Бялыніцкага раёна. У мужа падагра. Акрамя таго, ёсць кардыялагічныя праблемы. Кардыёлаг выпісала яму энап. А ў інструкцыі да прэпарату сказана, што пры падагры яго прымяняць нельга. Ці мела рацыю доктар, выпісваючы энап?

— Калі ў інструкцыі сказана «нельга», значыць не трэба яго прымаць. Цяпер вельмі шмат розных добрых гіпатэнзіўных прэпаратаў. І трэба падабраць прэпарат, які не супрацьпаказаны вашаму мужу.

☎ — Зоя Іванаўна з Навапалацка. У мяне поліартрыт рукі, пратаўшчэнне на ўсіх 10 пальцах. Яшчэ вельмі баліць калена. У гарадской паліклініцы няма рэўматолага. Абследавалася ў тэрапеўтаў, зрабілі здымак, падазраюць, што гэта поліартрыт калена. Ці можна прыехаць да вас на кансультацыю, каб больш дакладна даведацца па дыягназе?

— На кансультацыю трэба ехаць не да мяне, бо я неўролаг, а да рэўматолага, разам з ім удакладніць дыягназ. А потым, калі гэта будзе паказана, запрашаем да нас на апітэрапію.

Прамую лінію правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

У Еўропе гэтых птушак няма. У нас, баюся, таксама не будзе

Пішу вам з вёскі з Ушаччыны пра тое, што было ў нас раней, ёсць цяпер і што, баюся, будзе. Прычым — паўсюль.

Дык вось. Вёска наша з усіх бакоў акружана лесам. Таму даўней (асабліва ў гэту пару) выйдзеш на ганак, а з месца крануцца не

СЕРАДА, 14 МАЯ

5.25, 15.55 Серыял «Тайны следства».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 4.50 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00 Навіны.
7.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам!
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05 Серыял «Доктар Жывага». 1-я серыя.
10.05, 16.50 Серыял «Родныя людзі».
11.00, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.15 Камедыя «Кур'ер».
13.45 «Нябачны фронт».
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25, 4.55 Серыял «Вось так!».
19.35 Зямельнае пытанне.
19.55, 0.00, 2.10 Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу.
22.15 Панарама.
23.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3».
23.50 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.25, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 Серыял «Таццянін дзень».
10.00 Серыял «Мая цудоўная няня».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.40, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Людзі ў чорным».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.05 Серыял «Дачка садоўніка».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10, 5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Фаварыт».
22.15 Серыял «Разведчыкі. Вайна пасля вайны».
23.45 Тэорыя неверагоднасці.
0.35 Прафесійны бокс. Лепшыя баі.
1.35 Маст. фільм «Музыкант».
3.25 Серыял «Сабачая справа».
4.15 Серыял «Маё жыццё і я».

6.45, 14.25 Мультсерыял «Звычайны Норман».
7.10 «Ранішняя падзарадка».
8.10, 15.55 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.45, 18.50 Серыял «Золата Троі».
9.40 У гэты дзень.
9.45, 16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.35 Гаспадар.
11.00, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
12.00 Дак. фільм «Смяротныя танцы пад вадой».
12.55 Сезон у дачы.
13.25 «ПРАсоўванне+».
13.55 Анекдот. LAD.
14.45 Пазакласная гадзіна.
14.55 Клуб былых жонак.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Усё аб бяспецы.
19.30 Калыханка.
19.55 Хакей. Чэмпіянат свету. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
22.15 «Цудоўная сямёрка».
23.00 Мастацкая гімнастыка. Этап Кубка свету «BelSwiss-Bank».
0.35 Казанова.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 Серыял «Афрамасквіч 2».
9.00, 20.50 Серыял «Салдаты 14».
10.00 «Гарачы лёд».
10.40 «Аўтапанарама».
11.00, 15.30, 23.00 «Крутыя рабяты».
11.10 Серыял «Рэбека».
12.00, 18.25 Серыял «Танга ўтраіх».
12.50, 13.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
13.00 «Рэпарцёр СТБ».
14.40 Серыял «Студэнты 2».
15.40 «Прыватныя гісторыі».
17.30 «Званая вячэра».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 «Скардзіцца дазволена».
22.00 «Мінск і мінчане».
22.55 «СТБ-спорт».
23.10 Серыял «Баец. Нараджэнне легенды».
0.05 «Закон і крымінал».
0.10 «Рэактыўны бокс».
0.40 «Дэтэктыўныя гісторыі».
1.30 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

5.00, 6.15, 7.00, 1.00 Сядружнасць live.
5.30, 14.30 Серыял «ОБЖ».
6.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Сядружнасці.
6.45 «Удачная пакупка».
7.30 «Агульны інтарэс».
8.00, 18.45 Серыял «Дзеці Ванюхіна».
9.15, 20.00 «Спрэчная тэрыторыя».
10.15 «Дзень пасла».
10.30 Серыял «Дзікі месяц».
11.30, 0.30 Дак. серыял «Следчыя і экстрасэнсы».
12.15 Студыя 60х90.
12.25, 22.25 Маст. фільм «Блакітныя дарогі».
14.15 Вучым англійскую.
15.25, 0.05 Дак. серыял «Жывёлы на здымачнай пляцоўцы».
15.50 Планета VISION прадстаўляе...
16.25, 1.30 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.25, 2.30 «Лепшае з Джэнтльмен-шоў».
18.25 «Акцэнты».
19.45 «...Без вестак?» «17.900.000».
21.25 Серыял «Чорны спіс».

7.00, 18.15, 23.25 «Навіны кіно».
7.10, 10.55, 21.05, 23.35 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Каханне злое».
9.00 «К-відэа» для дзяцей.
9.30 «Адшукваецца адпачынак».
9.45 Серыял «Служба расследаванняў».
11.00 Маст. фільм «Шакалад».
12.45 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 Серыял «Авадзень».
18.20 Серыял «Справядлівая справа».
19.10 «К-гульні».
19.15 «Хіт-парад тэлечата».
19.40 Серыял «Служба расследаванняў».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10 Маст. фільм «Анёл».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.00 «Узарваць ката. Аперацыя «Адплата».
9.50 Серыял «Дзве сястры».
10.45 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 19.20 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45 Серыял «Смерць шпіёнам».
12.55 Серыял «Чужыя тайны».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 Суд ідзе.
15.50 Серыял «Рамэо і Джульета».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.50 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.45 Серыял «Дзве сястры».
20.50 Добрай ночы, малыя!
21.00 Серыял «Смерць шпіёнам».
22.05 Серыял «Закон і парадак».
23.10 «Весткі+».
23.30 «Голадамор-1933. Нявывучаныя ўрокі».

7.00 «Добрай раніцы, Расія!».
10.00, 17.25, 0.25 Серыял «Гонка за шчасцем».
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».
11.30 «Зорныя гады «Ленфільма».
12.10, 20.30, 3.45 Серыял «Калі яе зусім не чакаеш».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Маст. фільм «Целаахоўнік».
15.00 Мультфільм.
15.15 «Дзеці з прабіркі».
16.30 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.45, 0.10, 6.40 Весткі—спорт.
16.55, 5.40 «Хто там...».
19.45, 1.55 Серыял «Мачаха».
21.15, 4.50 «Іван Лапікаў. Балада пра акцёра...»
22.00 Весткі—Санкт-Пецярбург.
22.20 «Рамантыка раманса».
23.05, 4.30 Весткі+.
23.20, 2.40 Навіны культуры.
23.40, 6.10 «Начны палёт».

6.00 Сёння раніцай.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.00, 19.45 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў-8».
10.20 «Пакой адпачынку» з Людмілай Нарусавай.
10.50 «Галоўная дарога».
11.15 Серыял «Сышчык-4».
13.35 Серыял «У.Е.»
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
21.00 Серыял «Смерць шпіёнам».
22.05 Серыял «Закон і парадак».
23.10 «Весткі+».
23.30 Голадамор-1933. Нявывучаныя ўрокі».
23.50 ФІЛЬМ ДНЯ

«ДЗЕ ХАВАЕЦЦА ПРАЎДА» (КАНАДА — ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ — ЗША, 2005 г.)

Гісторыя пра ўладу, сэкс, каханне і шоў-бізнэс.
Рэжысёр: Атам Эгаян. **У ролях** — Кевін Бэйкан, Колін Ферт, Элісан Ломан.

16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
20.55 Серыял «Пагоня за анёлам».
22.30 Баявік «Сармат».
23.35 Серыял «Стаўка на жыццё».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30 Падзеі.
7.45, 10.15, 2.10 Пятроўка, 38.
7.55, 10.45, 13.45 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.00 Маст. фільм.
9.35 Серыял «Залатая цешча».
10.05 «Рэпарцёр».
10.50 Маст. фільм.
12.25 Маст. фільм.
13.50 Дзень бусла.
14.10 «Чарадзейная палачка». Мультфільм.
14.30 Маст. фільм.
15.30 Новая «Часінка».
16.55 «Рэзананс».
17.15 Сялянская застава.
17.45 Маст. фільм.
18.55 «Маскоўскія профі». Кухары.
20.00 Маст. фільм.
21.50 «Справа прынцыпу».
22.45 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.15 «Выратуйце за мяне».
0.05 Маст. фільм.
2.25 Маст. фільм.
4.20 Мультпарад.

9.30 Экстрэмальны спорт.
10.00, 16.00, 1.00 Веласпорт. «Тур Італіі».
11.15 Футбол. На шляху да «Еўра-2008».
11.30 Футбол. Кубак УЕФА. Паўфінал.
14.00, 18.30, 19.15 Тэніс. Турнір WTA.
19.00 Футбол. Еўрагалы.
20.00, 0.25 Выбранае па серадах.
20.10, 22.40 Конны спорт.
22.10 Пола.
22.45 Гольф.
0.20 Яхт-клуб.
0.30 Марафон па пяску.

ЧАЦВЕР, 15 МАЯ

5.30, 15.55 Серыял «Тайны следства».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 1.20 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам!
8.35 Зямельнае пытанне.
9.05 «Вайна і мір у агародзе». Дак. фільм.
10.00, 16.55 Серыял «Родныя людзі».
11.00, 17.50 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.15 Драма «Дзень поўні».
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25, 1.40 Серыял «Вось так!».
19.30 Сфера інтарэсаў.
19.55 Серыял «Доктар Жывага».
21.00 Панарама.
21.45, 2.10 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2».
22.45 «У інтарэсах нацыянальнай бяспекі». «Служым закону паўстагоддзя».
23.10 Хакей. Чэмпіянат свету. 1/4 фіналу. У перапынку — Навіны.
1.30 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.25, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 «Таццянін дзень». Серыял.
10.00 Серыял «Мая цудоўная няня».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.40, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Людзі ў чорным».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.05 Серыял «Дачка садоўніка».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10, 5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Фаварыт».
22.15 Серыял «Разведчыкі. Вайна пасля вайны».
23.45 «Адваротны адлік». «Эдзі Рознер».
0.25 Дэтэктыў «Агата».
2.05 «Алігарх з НКУС».

6.45, 14.05 Мультсерыял «Звычайны Норман».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.10, 16.00 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.45, 18.50 Серыял «Золата Троі».
9.35 У гэты дзень.
9.40, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
10.30 «Іншыя». «Работа над памылкамі».
11.05 Хакей. Чэмпіянат свету.
13.15 «Спорт, спорт, спорт...» Павел Доўгаль.
13.45 Анекдот. LAD.
14.30 «Цудоўны сад». Мультфільм.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.05 «Космаполітэн».
16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.35 Навіны культуры.
20.00 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.25 Нянька спяшаецца на дапамогу.
22.25 Шок-О-ЛАД.
23.25 Проста праграма.
0.10 Хакей. НХЛ. Плей-оф. Матч тыдня.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 «Афрамасквіч 2». Серыял.
9.00, 20.50 «Салдаты 14». Серыял.
10.00 «Рэактыўны бокс».
10.40 «Скардзіцца дазволена».
11.00, 15.30, 23.00 «Крутыя рабяты».
11.10 «Рэбека». Серыял. Заключная серыя.
12.00, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
12.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
13.00 «Добры дзень, доктар!».
13.50 «Паспець усё».
14.40 «Студэнты 2». Серыял.
15.40 «Фантастычныя гісторыі».
17.30 «Званая вячэра».
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 «Аўтапанарама».
22.00 «Асабісты інтарэс».
23.10 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
0.05 «Закон і крымінал».
0.10 «Сталкер».
0.40 «Сакрэтныя гісторыі».
1.30 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 7.05, 1.30 Садружнасць live.
5.30 Дак. серыял «Следчыя і экстрасэнсы».
6.05 «Вучым англійскую».
6.20, 14.20 «Кулагін і партнёры».
6.45, 7.35 Мультсерыял «Сцюардэса і кіраўнік».
7.00 Добрай раніцы, Расія!
8.45, 18.50 Серыял «Золата Троі».
9.35 У гэты дзень.
9.40, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
10.30 «Іншыя». «Работа над памылкамі».
11.05 Хакей. Чэмпіянат свету.
13.15 «Спорт, спорт, спорт...» Павел Доўгаль.
13.45 Анекдот. LAD.
14.30 «Цудоўны сад». Мультфільм.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.05 «Космаполітэн».
16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.35 Навіны культуры.
20.00 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.25 Нянька спяшаецца на дапамогу.
22.25 Шок-О-ЛАД.
23.25 Проста праграма.
0.10 Хакей. НХЛ. Плей-оф. Матч тыдня.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 «Афрамасквіч 2». Серыял.
9.00, 20.50 «Салдаты 14». Серыял.
10.00 «Рэактыўны бокс».
10.40 «Скардзіцца дазволена».
11.00, 15.30, 23.00 «Крутыя рабяты».
11.10 «Рэбека». Серыял. Заключная серыя.
12.00, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
12.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
13.00 «Добры дзень, доктар!».
13.50 «Паспець усё».
14.40 «Студэнты 2». Серыял.
15.40 «Фантастычныя гісторыі».
17.30 «Званая вячэра».
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 «Аўтапанарама».
22.00 «Асабісты інтарэс».
23.10 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
0.05 «Закон і крымінал».
0.10 «Сталкер».
0.40 «Сакрэтныя гісторыі».
1.30 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 7.05, 1.30 Садружнасць live.
5.30 Дак. серыял «Следчыя і экстрасэнсы».
6.05 «Вучым англійскую».
6.20, 14.20 «Кулагін і партнёры».
6.45, 14.55 Суд ідзе.
7.00 Добрай раніцы, Расія!
8.45, 18.50 Серыял «Золата Троі».
9.35 У гэты дзень.
9.40, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
10.30 «Іншыя». «Работа над памылкамі».
11.05 Хакей. Чэмпіянат свету.
13.15 «Спорт, спорт, спорт...» Павел Доўгаль.
13.45 Анекдот. LAD.
14.30 «Цудоўны сад». Мультфільм.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.05 «Космаполітэн».
16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
18.35 Навіны культуры.
20.00 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.25 Нянька спяшаецца на дапамогу.
22.25 Шок-О-ЛАД.
23.25 Проста праграма.
0.10 Хакей. НХЛ. Плей-оф. Матч тыдня.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 «Афрамасквіч 2». Серыял.
9.00, 20.50 «Салдаты 14». Серыял.
10.00 «Рэактыўны бокс».
10.40 «Скардзіцца дазволена».
11.00, 15.30, 23.00 «Крутыя рабяты».
11.10 «Рэбека». Серыял. Заключная серыя.
12.00, 18.25 «Танга ўтраіх». Серыял.
12.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
13.00 «Добры дзень, доктар!».
13.50 «Паспець усё».
14.40 «Студэнты 2». Серыял.
15.40 «Фантастычныя гісторыі».
17.30 «Званая вячэра».
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 «Аўтапанарама».
22.00 «Асабісты інтарэс».
23.10 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
0.05 «Закон і крымінал».
0.10 «Сталкер».
0.40 «Сакрэтныя гісторыі».
1.30 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 7.05, 1.30 Садружнасць live.
5.30 Дак. серыял «Следчыя і экстрасэнсы».
6.05 «Вучым англійскую».
6.20, 14.05 Мультсерыял «Кліфард».
6.45 «Цік-так».
7.30, 19.35 «Рандэву з зоркай».
8.05 Дак. серыял «Эліта грамадства».
9.05, 17.05 Серыял «Каханне як каханне».
10.05 Серыял «Дзікі месяц».
11.05 Серыял «Дзеці Ванюхіна».
12.05, 22.25 Маст. фільм «Белы караван».
14.30 Серыял «ОБЖ».
15.20 «Студыя 60х90».
15.25 Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
16.05, 0.25 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
18.20 «...Без вестак?» «Вузкі мосцік над прорвай цынізму і абыякавасці».
18.35 «Слава за хвіліну».
20.05 Канцэрт.
21.20 Серыял «Чорны спіс».
2.00 «Бушыдо — шлях воіна».

7.00, 10.50, 19.35 «Навіны кіно».
7.10, 10.55, 23.35 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Паветраныя замкі».
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30 «К-відэа» для дзяцей.
9.50 Серыял «Служба расследаванняў».
11.00 Маст. фільм «Адрас невядомы».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 Серыял «Шклянка вады».
18.15 «К-гульні».
18.20 Музычная праграма .
19.40 Серыял «Служба расследаванняў».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Зялёны дом».
21.20 «Героі коміксаў на экране».
23.10 «Хіт-парад тэлечата».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.00 «Мой сярэбраны шар. Віктар Паўлаў». Вядучы — Віталь Вульф.
9.50 Серыял «Дзве сястры».
10.45 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 19.25 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45 Серыял «Смерць шпіёнам».
12.45 «У Гарадку».
12.55 Серыял «Чужыя тайны».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 Суд ідзе.
15.50 Серыял «Рамэо і Джульета».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
18.50 Весткі—Беларусь.
19.50 «Юрмала».
20.50 Добрай ночы, малыя!
21.00 Маст. фільм «Паліцэйскія».
23.10 Маст. фільм «Горад прывідаў».

7.00 «Добрай раніцы, Расія!»
10.00, 17.25, 0.25 Серыял «Гонка за шчасцем».
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».
11.30 «Эпізоды». Галіна Канавалава.
12.10 Серыял «Калі яе зусім не чакаеш».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35, 5.25 Камедыя «Здравия желаю!»
14.50 Мультфільмы.
15.15, 1.55 «Мой сярэбраны шар. Ражэ Вадзім».
16.30 Весткі—Паўночны Каўказ.
16.45, 0.10 Весткі—спорт.
16.55 «Пятае вымярэнне».
19.50, 3.45 «Крывое люстэрка. Тэатр Яўгена Петрасяна».
21.25 Маст. фільм «Мелкі чорт».
23.10 «Вечар успамінаў пра Алега Шэйнцыса ў тэатральным цэнтры «На Страстным».
2.40 Навіны культуры.

6.00 Сёння раніцай.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
9.00 Серыял «Вуліца разбітых ліхтароў-8».
10.20 «Перамогшыя смерць».
10.50 «Авіятары».
11.15 Серыял «Сышчыкі-4».
13.35 Серыял «У.Е.»
15.30 «Агляд. Выратавальнікі».
16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.45 «Следства вялі...»
20.50 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
21.15 Маст. фільм «Шпіёнскія гульні: неафіцыйная версія».
23.15 Трылер «Імперыя ваўкоў».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30 Падзеі.
7.45, 10.15, 1.55 Пятроўка, 38.
7.55 Маст. фільм.
9.45 Маст. фільм.
10.45, 13.45 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
10.50 Маст. фільм.
12.25 Маст. фільм.
13.50 Небяспечная зона.
14.30 Маст. фільм.
15.30 Новая «Часінка».
16.55 Дзелавая Масква.
17.15 Нашы любімыя жывёлы.
17.45 Маст. фільм.
18.55 «У цэнтры ўвагі».
20.00 Пра жонку, пра цешчу, пра бландзінку...» Канцэрт.
21.45 Ток-шоў «Народ хоча ведаць».
22.50 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.20 Маст. фільм.
2.15 Маст. фільм.
3.15 Маст. фільм.
5.00 Мультфільмы.

9.30 Марафон па пяску.
10.00, 23.30 «Ралі Італіі».
10.30 Аўтаспорт.
11.00, 16.00 Веласпорт. «Тур Італіі».
11.45 Легенды «Ралан Гарос».
12.45 Алімпійскія гульні. «Місія—Пекін».
13.00 Тэніс. Турнір WTA.
18.30 Вось гэта дзіва!!!
18.45 Футбол. На шляху да «Еўра-2008».
19.00, 0.00 Футбол. Еўрагалы.
19.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17). Фінал.
21.30 Самыя дужыя людзі планеты.
22.30 Покер.
0.30 Экстрэмальны спорт.
1.00 Футбол. Кубак УЕФА. Фінал.

12.10 ФІЛЬМ ДНЯ

«ВЕРШНІК ПА ІМЕНІ СМЕРЦЬ» (РАСІЯ, 2004 г.)

1904 год. Галоўная мэта тэрарыстаў — Вялікі князь Сяргей Аляксандравіч. Замах рыхтуюць члены так званай «Баявой арганізацыі».
Рэжысёр: Карэн Шахназараў. **У ролях** — Андрэй Панін, Арцём Сямакін, Ксенія Рапапорт.

Дзякуй!

Калі з вамі станецца бяда...

Год пачаўся ў мяне цяжкавата, перанесла досыць складаную аперацыю. Але цяпер пачуваюся ўжо добра і хачу праз газету выказаць шчырую падзяку загадчыку хірургічнага аддзялення 11-й бальніцы Валянціну Мядфодзьевічу Краўчанку — за яго залатыя рукі, за яго чулае сэрца, за выхаванне персаналу.

Калі з вамі, крый Бог, станецца нейкая бяда, калі лёс прывядзе вас у гэта аддзяленне, урачы, медсёстры зробяць усё, каб вам не гэтак балела, каб было добра і зручна, каб вы хутчэй адчулі сябе здаравейшымі.

А таму — нізкі паклон хірургу Ірыне Аляксандраўне Будкевіч, анестэзіёлагу Ноне Севяр'янаўне Бігваве, медсёстрам Таццяне Пятроўне Валахановіч, Валянціне Пятроўне Варэнік, Алене Іванаўне Ліхадзіеўскай, Галіне Уладзіміраўне Курылёнак, санітарцы Людміле Антонаўне Казлоўскай!

Вельмі хочацца, каб іх сумленная самаадданая праца адзначалася не толькі маральным, але і матэрыяльным заахвочваннем.

Яўгенія Радзівонаўна САЎКО, г. Мінск.

ПЯТНІЦА, 16 МАЯ

5.20, 15.40 Серыял «Тайны следства».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 19.35 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.10 Навіны.
7.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 19.55 Серыял «Доктар Жывага».
10.00 Серыял «Родныя людзі».
11.00, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.10 Дэтэктыў «Вершнік па імені Смерць».
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.50 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 ЕўраФэст. Дзень за днём.
16.45 «Жыццё як жыццё». «Я пакахала чужога мужа».
21.00 Панарама.
21.45 Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
22.40 Фігуры.
23.20 Дзень спорту.
23.30 Усе стыхіі.
23.55 Хакей. Чэмпіянат свету. Паўфінал. Прамая трансляцыя.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 0.40, 3.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 Серыял «Таццянін дзень».
10.00 Серыял «Мая цудоўная няня».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 0.55, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Людзі ў чорным».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.05 Серыял «Дачка садоўніка».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Фаварыт».
22.15 Серыял «Разведчыкі. Вайна пасля вайны».
23.45 Тэорыя неверагоднасці.
0.35 Прафесійны бокс. Лепшыя баі.
1.35 Маст. фільм «Музыкант».
3.25 Серыял «Сабачая справа».
4.15 Серыял «Маё жыццё і я».

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 Серыял «Афрамасквіч 2».
9.00 Серыял «Салдаты 14».
10.00 «Новыя падарожжы дылетанта».
10.40 «Аўтапанарама».
11.00, 15.30 «Крутыя рабяты».
11.10 «Жыццё працягваецца». Тэленавела.
12.00, 18.25 Серыял «Танга ўтраіх».
12.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
13.00 «Асабісты інтарэс».
13.50 «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».
14.40 Серыял «Студэнты 2».
15.40 «Я — вандроўнік».
16.00 «Ёсць кантакт».
17.30 «Званая вячэра».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 Камедыя «Мой лепшы сябар».
22.55 «СТБ-спорт».
23.00 «Відзьма-нявідзьма».
23.40 Баявік «Рускі кілер».
1.15 «Па поўнай праграме».
1.45 Маст. фільм «К-19».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 7.05, 1.30 Садружнасць live.
5.30 «Жаночы часопіс».
6.05 «Вучым англійскую».
6.20, 14.05 Мультсерыял «Кліфард».
6.45 «Цік-так».
7.30, 19.35 «Рандэву з зоркай».
8.05 Дак. серыял «Эліта грамадства».
9.05, 17.05 Серыял «Каханне як каханне».
10.05 Серыял «Дзікі месяц».
11.05 Серыял «Дзеці Ванюхіна».
12.05, 22.25 Маст. фільм «Белы караван».
14.30 Серыял «ОБЖ».
15.20 «Студыя 60х90».
15.25 Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
16.05, 0.25 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
18.20 «...Без вестак?» «Вузкі мосцік над прорвай цынізму і абыякавасці».
18.35 «Слава за хвіліну».
20.05 Канцэрт.
21.20 Серыял «Чорны спіс».
2.00 «Бушыдо — шлях воіна».

7.00, 10.50, 19.35 «Навіны кіно».
7.10, 10.55, 23.35 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Паветраныя замкі».
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30 «К-відэа» для дзяцей.
9.50 Серыял «Служба расследаванняў».
11.00 Маст. фільм «Адрас невядомы».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 Серыял «Шклянка вады».
18.15 «К-гульні».
18.20 Музычная праграма .
19.40 Серыял «Служба расследаванняў».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Зялёны дом».
21.20 «Героі коміксаў на экране».
23.10 «Хіт-парад тэлечата».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.00 «Мой сярэбраны шар. Віктар Паўлаў». Вядучы — Віталь Вульф.
9.50 Серыял «Дзве сястры».
10.45 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 19.25 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45 Серыял «Смерць шпіёнам».
12.45 «У Гарадку».
**12.55 Серыял «

Вось які наш Карагод!

Ёсць яшчэ каму вадзіць «Карагод» у вёсках Пагост і Хільчыцы Жыткавіцкага раёна. Сёлета ў дзень святога Юр'я (6 мая) старажытны земляробчы абрад зноў вывеў «Карагоды» на жытнія палі, на вуліцы, да людзей: каб не проста жадаць — несці ў сем'і згоду, дабрабыт, гаспадарам — багаты ўраджай. «Дзе Карагод ходзіць, там жыта родзіць, а дзе не бывае, там — палягае...» — спяваюць і танчаць вясёлыя карагоднікі, несучы ўпрыгожаны кветкамі і ахутаны чырвонаю хусткаю сімвал сонца, хлеба і роду — Карагод. Дарэчы, абраду «Карагод» вёскі Пагост нададзены статус помніка нематэрыяльнай культуры, і ён узяты пад ахову ЮНЕСКА. Гэта вялікі гонар і абавязак — захаваць абрад для нашчадкаў, зрабіць яго часткаю жыцця, жывою традыцыяй. І прызнанне ўнікальнасці «Карагода» і самабытнасці яго захавальнікаў — простых і шчырых вяскоўцаў — хлебаробаў, настаўнікаў, працаўнікоў культуры. Гэтыя фотаздымкі зроблены ў вёсках Пагост і Хільчыцы, яны пераконваюць, якая сапраўды багатая тураўская зямля.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Эксклюзіў

Эвалюцыю халодная зброя праходзіла разам з чалавецтвам...

...адпавядаючы вельмі часта зусім не мірным мэтам

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 8 мая.)

І ў СССР, і ў Германіі была шырока прадстаўлена парадная зброя — шаблі, корцікі, кінжалы. У СССР, да прыкладу, корцікі з адпаведнай сімволікай меліся і для сухапутных войскаў, і для авіяцыі, і для флоту *(здымак 4)*.

Сяргей Лапароў дэманструе адзін з будучых экспанатаў — трафейны нямецкі марскі корцік *(здымак 5)*.

Існуе легенда, што калі ў Германіі ў пачатку XX стагоддзя ў процівагу Брытаніі пачаў стварацца флот «адкрытага мора», крэйсер «Варяг» наведаў кайзер Вільгельм II. І яму так спадабаліся корцікі ў рускіх афіцэраў, што ён аддаў загад іх скапіраваць. Дарэчы, у музей гэты ўзор быў перададзены беларускай мытняй, якая сярод іншых затрымала яго на мяжы.

У немцаў увогуле ўсе ваенныя і ваенізаваныя фарміраванні мелі ўласную парадную халодную зброю. Я разглядаю нож Германскага Чырвонага Крыжа *(здымак 6)*: са свастыкай,

але з цалкам спілаваным наканечнікам, адзін бок ляза цалкам затуплены, другі — у вялікіх зазубрынах. Ім не тое што параніць нельга, увогуле нічога карыснага нават у бытавых мэтах не зрабіць. Ён усім сваім выглядам нібы дэманструе: медык не можа забіць. А калі ўдумацца, прыгадаць? Колькі цынізму, блюзнерскага пафасу і ў самім гэтым нажы, і ўвогуле ва ўсёй сітуацыі...

А вось кінжалы элітных нямецкіх падраздзяленняў *(здымак 7)* з-за сваёй выдатнай якасці заўсёды былі жаданым трафеем як у франтавікоў, так і партызан.

ШАШКІ, ШАБЛІ І... КАТАНА

Я бяру з дазволу Сяргея Аляксандравіча ў рукі чарговы экспанат — шашку. Гэты традыцыйны від каўказскай зброі быў шырока распаўюджаны ў Рускай імператарскай арміі яшчэ ў XIX стагоддзі. Галоўнае вонкавае адрозненне ад шаблі — адсутнасць гарды (перакрыжаванне паміж рукаяткай і ўласна выгнутым клінком). У Чырвонай Арміі на ўзбраенні кавалерыйскіх часцей былі абодва віды гэтай халоднай зброі *(здымак 8)*.

— Да пачатку Другой сусветнай вайны кавалерыя заставалася адным з асноўных родаў войска ва ўсіх арміях свету. Ды і артылерыя да сярэдняга калібра ўключна была пераважна на коннай цязе, — тлумачыць зноў Сяргей Лапароў.

Спрабую ў паветры зрабіць некалькі рухаў шашкай. Нязручна, ды і, адчуваецца, каб добра ёй памахаць, патрэбна падрыхтоўка.

— Раней для кавалерыстаў было спецыяльнае практыкаванне: высечка лазы або трыснягу, — гаворыць мой гід. — Затое ў руках падрыхтаванага чалавека гэта была грозная зброя: на хаду, выкарыстоўваючы вышыню і энергію руху каня, кавалерыст рассякаў праціўніка літаральна напалову.

Цікава, што і шашкамі, і шаблямі ў Чырвонай Арміі ўзнагароджваліся вышэйшыя военачальнікі, прычым гэты дастаткова спецыфічны від халоднай зброі мог быць уручаны прадстаўніку любога роду войскаў, нават які не меў дачынення да кавалерыі.

Тым часам Сяргей Лапароў дэманструе мне яшчэ адзін вельмі рэдкі прадмет — японскі меч катана *(здымак 9)*. Як мяркуецца, гэта зброя

вытворчасці XIX стагоддзя. Быў узяты ў якасці трафея пасля разгрому Квантунскай арміі ў 1945 годзе, нейкі час належаў аднаму з савецкіх генералаў — Б.А. Пачыкоўскаму.

— Я чытаў, што падчас баёў амерыканцаў з японцамі, калі справа даходзіла да рукапашных, японскія афіцэры сваімі самурайскімі мячамі літаральна рассякалі на часткі зброю праціўнікаў, якой тыя прыкрываліся ад удараў: вінтоўкі, пісталет-кулямёты і інш. Гэта праўда? — цікаўлюся ў спецыяліста.

— Я сапраўды сустракаў згадванне пра інструкцыю для марской пяхоты ЗША, у якой забаранялася ў бліжнім баі падстаўляць пад прамым вуглом стралковую агнястрэльную зброю пад удары японскіх мячоў. Дазвалялася гэта рабіць толькі пад вострым, каб клінок або саслізнуў, або застаўся у метале гэтай зброі. Праўда, я думаю, што такая моц была характэрнай толькі для старажытных родавых самурайскіх мячоў, якія выраблялися па адмысловых тэхналогіях тых часоў. Наш меч — гэта ўнтэр-афіцэрскі клінок, радавы ў сэнсе памянёных вышэй уласцівасцяў, аднак рэдкі для нашай краіны як па факце наяўнасці, так і гісторыі, — адказаў Сяргей Лапароў.

* * *

Газетная плошча, на жаль, не дазваляе расказаць пра ўсе экспанаты — для гэтага лепш самому наведаць унікальную выстаўку.

Акрамя агляду ўласна экспазіцыі халоднай зброі, тут можна будзе пастраляць у электронным ціры, сфатаграфавацца на памяць у ваеннай форме перыяду Вялікай Айчыннай вайны і са зброяй таго часу ў руках, прагледзець на плазменым экране ваенную кінахроніку, праз інфакіёск атрымаць дадатковыя матэрыялы пра халодную зброю.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НЯДЗЕЛЯ, 18 МАЯ

6.50 Меладрама «Крыш».
8.25 Альманах падарожжаў.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.05, 12.10, 15.30, 19.15, 23.25 Еўрабачанне. Бялград-2008.
9.10 Арсенал.
9.40 Серыял «Залатая цешча».
10.20 Культурныя людзі.
10.55 Nota Bene.
11.25 У свеце матораў.
12.15 Меладрама «Амерыканская дачка».
14.05 «Беларускае памор'е».
14.30 «Нябачны фронт».
15.10 Навіны рэгіёна.
15.35 Усе стыхіі.
16.10 КВЗ. 1/8 фіналу Еўралігі.
18.15 Суперлато.
19.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэасапліс.
19.55 Хакей. Чэмпіянат свету. Фінал. Прамая трансляцыя.
22.15 Панарама тыдня з Юрыем Пракопавым.
23.35 Вось дык шоў!

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь.
9.20 Серыял «Сябры».
9.55 «Бесталковыя нататкі».
10.15, 5.05 Пакуль усе дома.
11.05 Фазэнда.
11.40 «Раніцняя пошта».
12.30 «Разумніцы і разумнікі».
13.05 «Надзвычайныя прыгоды мушкецёраў». Мультфільм.
14.30 Маст. фільм «Давай пажэнімся».
16.10, 3.10 Навіны спорту.
16.20 «Міжнародная панарама».
16.40 Камедыя «Фараоны і Роберсаны».
18.30 «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.35 Маст. фільм «Саюз без сэксу».
23.45 «Камедзі Клаб».
0.20 Драма «Нідзе ў Афрыцы».
3.15 Меладрама «Чорная вуаль».

7.40 Звон.
8.05 Мір вашаму дому.
8.15 Бухта капітанаў.
9.00 Наша пяцёрачка.
10.05 Несвоечасова.
10.35 Школа рамонту.
11.35 Клуб былых жонак.
12.45 «Лабірынты: таямніца воўчынскай крыпты».
13.15 ПРАсоўванне+.
13.30 Слова пісьменніка.
14.05 Святло далёкай зоркі. Аляксандр Ісачоў.
14.35 «Азёрная адысея». Возера Свіцязь.
15.10 «Страсці па культуры».
15.50 Серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
17.55 Футбол. Кубак Беларусі. Фінал. Прамая трансляцыя.
20.05 Анекдот. LAD.
20.30 Тэлебарометр.
20.50 Правы чалавека.
21.05 Меладрама «Двайное прозвішча».
23.00 Мастацкая гімнастыка. Этап Кубку свету «BelSwiss-Bank».
0.35 Баскетбол. НБА. Матч плей-оф.

6.00 «Клуб «Белы папугай».
6.40 Казка «Акадэмія пана Кляксы».
8.00 «Трое зверху-2». Серыял.
8.55, 19.00 «Аўтапанарама».
9.25 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.20 «Вялікае снеданне».
11.00 «Добры дзень, доктар!»
11.30 «Турысты». Серыял.
12.25 Маст. фільм «Дажывём да панядзелка».
14.15 «Горад дзяцінства».
14.30 «Ecce homo».
15.00 «Культурнае жыццё».
15.30 «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Рэтраманія».
17.50 «Далёкія сваякі».
18.10 «Чуткі. Скандалы. Сенсацыі. Расследаванні».
19.30 «Тыдзень».
20.30 Маст. фільм «Містыфікацыя».
22.30 «Спартыўны тыдзень».
23.00 «Прафесійны бокс».
0.00 «Па поўнай праграме».
0.35 «Мяне завуць Эрл». Серыял.

5.00 «Любімыя акцёры».
5.10, 12.20 Камедыя «Сварка ў Лукашах».
6.45 Дак. серыял «Згубленыя светы».
7.45, 14.05 Мультсерыял «Кароль малпаў».
8.15 «Мільён пытанняў аб прыродзе».
8.30 Серыял «Славуты Джэт Джэксан».
9.00 «Паэзія Арменіі».
9.15 «Рэспубліка сёння».
9.30 «Суседзі».
9.45 «Тэрыторыя KG».
10.00 «Даведнік».
10.30 «Тайны забытых перамог». «Перамога над часам».
11.00 «Ведаем рускую».
12.00 «Навіны Садружнасці».
12.10 «Любімыя акцёры».
14.30 Серыял для дзяцей «Славуты Джэт Джэксан».
15.00 «Без палітыкі».
15.20 «Студыя 60х90».
15.25 «Супраць мафіі».
16.00 Серыял «Фердынанд Цудоўны».
17.00 «У нашу гавань заходзілі караблі...»
18.00 Маст. фільм «Прадаецца дэтэктар хлусні».
20.00 «Разам».
20.55 Маст. фільм «2009: сцёртая памяць».
23.00 «Паўночнікі».
23.30 Серыял «Горац-3».
0.30 «Кома».
1.15 Маст. фільм «Прадаецца дэтэктар хлусні».

9.00, 16.55 «К-гульні».
9.05, 23.30 «Метэапрагноз».
9.10 «Адшукваецца адпачынак».
9.30 «Мультпарад».
9.50, 21.00, 23.25 «Навіны кіно».
10.00 «Мой любімы гадаванец».
10.15 Маст. фільм «Добры немец».
12.00 Майстры кіно. Кевін Костнер.
14.30 «Жыццё, поўнае радасці».
15.00 «К-відэа для дзяцей».
15.20 Фільм для дзяцей.
17.00 Маст. фільм «Вірус у раю».
19.00 Маст. фільм «Пракляцце Нефрытавага Скарпіёна».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Зялёны дом».
21.20 Маст. фільм «Іспанка».

7.00, 11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
7.10 Маст. фільм «Замах на ГОЭЛРО».
8.30 Мультфільмы.
9.00 «Студыя «Здароўе».
9.35 «Смехапанарама».
10.05 «Сто да аднаго».
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 «Старажытныя адкрыцці». Дак. серыял.
13.25 «Відавочнае — неверагоднае».
14.20 Маст. фільм «Паляванне на адзінарога».
15.55 Весткі. Дзяжурная часць.
16.25 «Сумленны дэтэктыў».
17.00 «Танцы з Зоркамі». Сезон-2008.
20.00 «Спецыяльны карэспандэнт».
20.35 Камедыя «Чорны рыцар».
22.30 Трылер «Закінуты дом».

7.00, 10.00, 13.00 Весткі.
7.10 Весткі—Масква.
7.20 Маст. фільм «Мар'яна».
8.30 Мультфільмы.
8.45 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
9.30 «Падарожжы музыканта».
10.10 Весткі—Масква. Тыдзень у горадзе.
10.50, 1.00 Серыял «Семнаццаць імгненняў вясны».
12.05 Мультфільмы.
12.20 «Сам сабе рэжысёр».
13.15 Серыял «Свая каманда».
14.05 Мультфільмы.
14.20 «Зборная Расіі».
14.50 «Гарадок».
15.15 «Здабытак рэспублікі».
15.30 «Музычныя тэатры Расіі».
16.10 «Больш, чым каханне».
16.50 «Тым часам».
17.45 «Сумленны дэтэктыў».
18.15, 2.15 Серыял «Пуцейцы».
19.00, 3.00 Весткі тыдня.
20.05, 4.00 «Спецыяльны карэспандэнт».
20.30, 4.30 «Лінія жыцця». Міхаіл Ражкоў.
21.25, 5.25 Маст. фільм «Эгаіст».
23.05 «Смяяцца дазваляецца».

7.35 «Дзікі свет» з Цімафеем Бажэнавым.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.15 «Іх норавы».
8.50 «Усё адразу!».
9.25 «Ядзім дома!».
10.25 «Quattroruote».
10.55 «Авіятары».
11.25 Камедыя «Афрыканец».
13.25 «Крамлёўскія дзеці».
14.15 Маст. фільм «Злодзей».
16.25 «Барацьба за ўласнасць».
17.00 Серыял «Адвакат».
19.00 Сёння. Падагульняючая праграма.
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.40 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
21.25 «Галоўны герой».
22.35 «Нядзельны вечар».
23.45 «Футбольная ноч».
0.15 Трылер «Забойца душы».

4.50 Маст. фільм.

6.25 Фактар жыцця.
6.50 Дзённік падарожніка.
7.20 Сялянская застава.
8.00 Маст. фільм.
8.45 «21 кабінет».
9.15 «Рэальныя гісторыі». Вечная маладосць.
9.50 «Дэтэктыўныя гісторыі». Нязваны госць.
10.30, 23.00 Падзеі.
10.40 Маст. фільм.
12.10 «Запрашае Барыс Ноткін». Любоў Талкаліна.
12.40 «Фабрыка думкі». Ідэя для Расіі.
13.30 Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
14.00, 15.15 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
14.25 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Закон аб лёгкіх паводзінах».
15.20 Маст. фільм.
17.00 Маст. фільм.
19.00 Маст. фільм.
20.00 «У цэнтры падзей».
21.00 Маст. фільм.
23.15 Чэмпіянат свету па аўтагонках у класе кузаўных аўтамабіляў у Валенсіі.
0.20 Маст. фільм.
2.50 Маст. фільм.
4.40 «Чароўная палачка». Мультфільм.

9.30 Экстрэмальны спорт.
10.00, 0.30, 2.00 «Ралі Італіі».
10.30, 16.00 Аўтаспорт.
11.00 Мотагонкі. Гран-пры Францыі.
17.30 Веласпорт. «Тур Італіі».
18.30 Тэніс. Турнір WTA.
20.00 Пляжны футбол. Кубак свету.
21.00 Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў.
23.00 Бокс. А. Абрахам (Германія) — Э. Аяла (ЗША).
0.00 Мотаспорт па выхадных.
1.00 Пляжны валейбол. Сусветны тур.
У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!

0.15 ФІЛЬМ ДНЯ

«ЗАБОЙЦА ДУШЫ» (НІДЭРЛАНДЫ, 2001 г.)

Берк бярэцца сам высачыць забойцу каханай дзяўчыны. З гэтага моманту ён уступае ў небяспечную гульню, паступова даведваючыся аб навакольным жыцці тое, што нават не хацеў бы ведаць.

Рэжысёр: Лоўрэнс Малкін. **У ролях** — Скіт Ульрых, Крысці Свенсан, Дэрэк дэ Лінт.

СЕРАДА, 14 МАЯ
3.00, 21.20 Трагікамедыя «Шалёны сабака і Глорыя».
4.40 Баявік «Твар са шрамам».
7.30 Драма «Хлопчыкі».
9.10 Баявік «У каўбояў прынята так».
11.00 Трагікамедыя «Страціць розум ад кахання».
13.00 Камедыя «Зорная ноч».
15.00 Камедыя «Таямнічыя людзі».
17.00 Трылер «Цень страху».
18.30 Баявік «Гладыятар».
ЧАЦВЕР, 15 МАЯ
3.00 Баявік «Двайны фарсаж».
4.50 Баявік «Гладыятар».
7.40 Камедыя «Зорная ноч».
9.30 Камедыя «Таямнічыя людзі».
11.30 Трылер «Цень страху».
13.00 Драма «Краіна ўзгоркаў і далін».
15.00 Трылер «Арлы юрыспрудэнцыі».
16.50 Драма «Клуб «Снеданне».
18.30 Драма «Народжаны чацвёртага ліпеня».
21.00 Баявік «Двайны фарсаж».
ПЯТНІЦА, 16 МАЯ
3.00, 21.00 Трылер «Чорная дзірка: хронікі Рыдзіка».
4.50 Драма «Народжаны чацвёртага ліпеня».
7.10 Драма «Краіна ўзгоркаў і далін».
9.10 Трылер «Арлы юрыспрудэнцыі».
11.00 Драма «Клуб «Снеданне».
13.00 Камедыя «Гаспадыня дома».
15.00 Камедыя «Удар па воротах 2: Разбіваючы лёд».
17.00 Камедыя «Эд з тэлевізара».
19.00 Камедыя «Пацалунак на ўдачу».
СУБОТА, 17 МАЯ
3.00, 20.50 Дэтэктыў «Перакладчыца».
5.30 Камедыя «Пацалунак на ўдачу».
7.00 Камедыя «Гаспадыня дома».
9.00 Камедыя «Удар па воротах 2: Разбіваючы лёд».
11.00 Камедыя «Эд з тэлевізара».
13.00 Камедыя «Ілгун, ілгун».
15.00 Камедыя «К-911».
17.00 Драма «Імператарскі клуб».
19.00 Камедыя «Узломшчыкі сэрцаў».
НЯДЗЕЛЯ, 18 МАЯ
3.00, 21.00 Баявік «Меркурый у небяспецы».
5.00 Камедыя «Узломшчыкі сэрцаў».
7.00 Камедыя «Ілгун, ілгун».
9.00 Камедыя «К-911».
11.00 Драма «Імператарскі клуб».
12.50 Камедыя «Проста сябры».
14.30 Драма «З Афрыкі».
17.10 Баявік «Шпіёнскія гульні».
19.30 Фантастыка «13-ы раён».

СЕРАДА, 14 МАЯ
7.00, 14.45 «Нараджэнне аўтамабіля».
7.25, 15.10 «Наперагонкі з часам».
8.20, 12.55 Заезды.
9.15, 18.00, 5.40 «Як гэта працуе».
10.10, 16.05, 2.00 «Трукачы».
10.40, 16.35, 2.25 Вялізныя машыны.
11.05, 20.00 Разбуральнікі легенд.
12.00 Ствары матацыкл.
13.50, 6.05 Гіганцкія будоўлі.
17.00, 4.45 «Мітусня з «жуком».
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
21.00 Брудная работка.
22.00, 2.55 За мяжой магчымага.
23.00 «Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі».
0.00 Крыміналісты.
1.00 Сцэнарый катастрофы.
ЧАЦВЕР, 15 МАЯ
7.00, 14.45 «Нараджэнне аўтамабіля».
7.25, 15.10 «Наперагонкі з часам».
8.20, 12.55 Заезды.
9.15, 18.00, 5.40 «Як гэта працуе».
10.10, 16.05, 2.00 «Трукачы».
10.40, 16.35, 2.25 Вялізныя машыны.
11.05, 20.00 Разбуральнікі легенд.
12.00 «Мітусня з «жуком».
13.50, 6.05 Гіганцкія будоўлі.
17.00, 4.45 «Круты цюнінг».
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
21.00 Брудная работка.
22.00, 2.55 На месцы злачынства.
23.00 Доктар Дж.: медыцынскае расследаванне.
0.00 Крыміналісты.
1.00 Сцэнарый катастрофы.
ПЯТНІЦА, 16 МАЯ
7.00, 14.45 «Нараджэнне аўтамабіля».
7.25, 15.10 Войны на звалцы.
8.20, 12.55 Заезды.
9.15, 18.00, 5.40 «Як гэта працуе».
10.10, 16.05, 2.00 «Трукачы».
10.40, 16.35, 2.25 Вялізныя машыны.
11.05, 20.00 Разбуральнікі легенд.
12.00 «Круты цюнінг».
13.50, 6.05 Гіганцкія будоўлі.
17.00, 4.45 «Пятая перадача».
18.00, 5.40 «З чаго гэта зроблена?»
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
21.00, 2.55 Брудная работка.
22.00 «Місія: неверагодная!»
23.00 Амерыканскія калымагі.
0.00 Выжыць любой цаной.
1.00 Сцэнарый катастрофы.
СУБОТА, 17 МАЯ
7.00, 13.50, 3.50 Крушэнне авіяносца.
7.55, 14.45 Мегабудоўлі.
8.50, 15.40 «З чаго гэта зроблена?»
9.45, 16.35, 4.45 У свеце машын.
10.10, 18.00 Зброя будучыні.
11.05, 19.00 «Місія: неверагодная!»
12.00 Махінатары.
12.55 «Пятая перадача».
17.00, 2.55 «Мітусня з «жуком».
20.00 Амерыканскія калымагі.
21.00, 5.10 За кулісамі сусветнага чэмпіянату па ралі.
22.00, 6.05 Амерыканскі чопер.
23.00 Стварэнне хотродаў.
0.00 Самыя крутыя ў свеце хлопцы.
1.00 Эверэст: за мяжой магчымага. Зона смерці.
2.00 «Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі».
НЯДЗЕЛЯ, 18 МАЯ
7.00, 13.50 Нафтавыя вышкі.
7.55, 14.45, 3.50 Гіганцкія будоўлі.
8.50, 16.35, 4.45 Неверагодная хуткасць.
9.15 Заўзятыя рыбакі.
9.45 Рыбакі ў джунглях.
10.10 Звярыныя баталіі.
11.05, 2.00 Выжыць любой цаной.
12.00, 2.55 Смяротны ўлоў.
12.55 «Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі».
15.40 «Як гэта працуе».
17.00 «Круты цюнінг».
18.00, 5.10 Стварэнне хотродаў.
19.00 За кулісамі сусветнага чэмпіянату па ралі.
20.00 Амерыканскі чопер.
21.00, 6.05 Разбуральнікі легенд.
22.00 Зброя будучыні.
23.00 Смяротная зона.
0.00 Доктар Дж.: медыцынскае расследаванне.
1.00 На месцы злачынства.

СЕРАДА, 14 МАЯ
9.00, 17.00, 1.00 Драма «Сёстры Бронтэ».
11.00, 19.00, 3.00 Драма «Фабіо Мантале: Смяротныя гульні».
12.35, 20.35, 4.35 Драма «Леанарда» (3-я серыя).
13.30, 21.30, 5.30 Меладрама «Казус Белы».
15.35, 23.35, 7.35 Камедыя «Мёртвая прыгажуня».
9.00, 17.00, 1.00 «Прыгоды Фіцкаральдо».
11.35, 19.35, 3.35 Камедыя «Сямён: гісторыя кахання».
13.05, 21.05. 5.05 Драма «Леанарда» (4-я серыя»).
14.00, 22.00, 6.00 Трылер «Рыхард Зорге».
ПЯТНІЦА, 16 МАЯ
9.00, 17.00, 1.00 Меладрама «Каруначніца».
10.50, 18.50, 2.50 Драма «Маё жыццё».
12.50, 20.50, 4.50 Драма «Леанарда» (5-я серыя).
13.45, 21.45, 5.45 Камедыя «На мяжы дазволенага».
15.20, 23.20, 7.20 Драма «Тэсэракт».
СУБОТА, 17 МАЯ
9.00, 17.00, 1.00 Драма «Валадар мух».
10.35, 18.35, 2.35 Камедыя «Вар'яцкае ражство».
12.15, 20.15, 4.15 Драма «Смерць Марыо Рычы».
14.00, 22.00, 6.00 Драма «Валянцін».
15.25, 23.25, 7.25 Прыгоды «Сэкс дзеля выжывання».
НЯДЗЕЛЯ, 18 МАЯ
9.00, 17.00, 1.00 Драма «Крах Гласа».
10.35, 18.35, 2.35 Драма «Чацвяртак».
12.05, 20.05, 4.05 Камедыя «Круты жырдзяй».
13.40, 21.40, 5.40 Камедыя «Вада».
15.20, 23.20, 7.20 Драма «Запрашэнне».

Інфарм-укол

ВЫПІЎКА: ЖАДАННЕ ЁСЦЬ, МАГЧЫМАСЦІ НЯМА

Паводле слоў доктара Шонфельда з Сан-Францыска, алкаголь — гэта прыклад наркотыку, які шырока выкарыстоўваецца людзьмі, якія, у сваю чаргу, не задумваюцца над тым, што гэта наркотык. Ва ўмераных дозах памянёны наркотык мае добры заспакаяльны эфект. Аднак у вялікіх дозах ён запавольвае і падаўляе рэфлексы.

Ужыванне моцных лікёраў ці вялікай колькасці піва або віна спустошвае запасы фоліевай кіслаты, вітамінаў групы В. Сімптомы недахопу фоліевай кіслаты — раздражняльнасць, забыўлівасць, слабасць, стомленасць, расстройства кішэчніка, галаўны боль, пачашчанае сэрцабіццё, хуткая змена настрою і, што самае важнае, паніжаная сэксуальная энергія.

Пасля ўжывання алкаголю ў арганізме пачынаюць спустошвацца і запасы цынку. А гэты мікраэлемент неабходны для адэкватнай сэксуальнай рэакцыі: «Выпіўка спрыяе жаданню, але пазбаўляе магчымасці».

Зместкі аб уздзеянні алкаголю на жанчын даволі супярэчлівыя. Паводле адных даных, у пітушчых жанчын назіраюцца сэксуальныя расстройствы, а паводле іншых — у некаторых жанчын алкаголь узмацняе пачуццё сэксуальнасці. Палёгка перадменструальнага напружання — яшчэ адна карысць, якую алкаголь прыносіць жанчынам. Выпіўка, прызнаная эфектыўным мачагонным сродкам, аблягчае дыскамфорт ад галаўнога болю, раздражняльнасці, можа здымаць спазмы да ці пасля пачатку менструацыі.

Даследаванне паказала:

*у жанчын утрыманне алкаголю ў крыві пастаянна аказваецца вышэйшым, чым у мужчын;

*жанчыны засвойваюць алкаголь хутчэй за мужчын;

*у жанчын алкаголь у крыві захоўваецца даўжэй, чым у мужчын.

Амерыканскія вучоныя неяк устанавілі, што дастаткова адной ці двух грунтоўных выпівак падчас цяжарнасці — і ненароджанаму дзіцяці будзе прычынена неверагодная шкода.

Тэлесеткі

«АДЧАЙНЫЯ ХАТНІЯ ГАСПАДЫНІ» ВЯРТАЮЦЦА

На Першым канале з **12 мая** пачаўся паказ трэцяга сезона тэлесерыяла **«Адчайныя хатнія гаспадыні»** (ЗША, 2004—2005).

Дарэчы, сацыяльныя даследаванні паказалі нечаканы вынік: першапачаткова серыял быў арыентаваны на жаночую частку аўдыторыі, аднак у хуткім часе стаў карыстацца поспехам і ў мужчын. Магчыма, такая папулярнасць абумоўлена незвычайным жанрам «Адчайных хатніх гаспадынь». Дакладней, змяшэннем гэтых самых жанраў. У сюжэце ёсць многа смешных эпізодаў — але гэта не камедыя, ёсць класічныя прыёмы тэленавелаў — але гэта не «мыльная опера», ёсць незвычайныя падзеі — але гэта не фантастыка, ёсць нават некалькі злачынстваў, але яны не ператвараюць фільм у паліцэйскую драму. Як у жыцці на жаночыя плечы кладзецца мноства самых разнастайных клопатаў, бедаў і радасцяў...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Прамая лінія

СЕМ РАЗОЎ ПАДУМАЙ — АДЗІН РАЗ ЗРАБІ

На пытанні чытачоў адказваюць загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук Іван Іванавіч КРУК і старшы выкладчык гэтай кафедры Аксана Веніямінаўна КАТОВІЧ

(Працяг.
Пачатак у нумары за 8 мая.)

☎— Вам тэлефануе Жана Сцяпанаўна з Мінска. Мой муж нарадзіўся 2 верасня 1957 года. Але яго зарэгістравалі толькі 7 студзеня 1958 года, што і ўказана ў пашпарце. У дзяцінстве яго дзень нараджэння адзначаўся ў верасні. А потым, калі атрымаў пашпарт, сталі адзначаць у студзені. Ці правільна гэта?

— Калі ён нарадзіўся ў верасні 57-га года, дык пры чым тут студзень 58-га? Нават калі гэта і запісана ў пашпарце. Нараджаецца чалавек не па дакументах, а ў той момант, калі яго «пусцілі» ў гэты свет. Дзень нараджэння — гэта вельмі важны момант у жыцці. Наступнымі па статусе ідуць імяніны — дзень хрышчэння. А ўсе афіцыйныя запісы — гэта ўжо зусім іншае, хоць і яны таксама пэўным чынам уплываюць на ход і лад жыцця чалавека…

Зразумейце нас правільна — ёсць законы прыроды, законы Космасу, якім мы — складовая частка гэтага свету — у абавязковым парадку падпарадкоўваемся. На людзей уплываюць і Сонца, і Месяц — мы ўсе дзеці гэтых свяціл. Таму калі ваш муж вераснёўскі, восеньскі, то стаць зімовым ён ніяк не зможа. Ды і радуйцеся, што вераснёўскі — значыць, павінен быць заможным чалавекам. Восеньскія дзеці — гэта ў будучым заможныя людзі. І, да таго ж, вельмі ўважаныя.

— Дзякуй вам вялікі! І за кнігу «Залатыя правілы народнай культуры» асабліва дзякуй — яна стала ў нас настольнай.

— Дзякуй і вам, вельмі прыемна.

☎— Мяне завуць Вера, тэлефаную з Навагрудскага раёна. Нас з мужам у царкве запісалі хроснымі немаўляці. Але мой муж падчас хрышчэння знаходзіўся ў царкве, а я не змагла там прысутнічаць. Ці можна мяне лічыць хроснай маці?

— Той, хто не быў у храме, хто не трымаў дзіцятка перад алтаром — які ж ён хросны? Давайце сабе ўявім, што ў храме запісана, быццам вы там узялі шлюб, павянчаліся. А насамрэч вы там не былі. Дык што, венчаныя вы? Запісаць можна ўсё што заўгодна. Але як можна лічыцца хроснай маці, калі вы не былі ў храме, калі не выконвалі абрад, калі не бачылі, як пастрыгалі дзіцятка, як яго мірапамазалі, як яго апускалі ў купель?.. І самае галоўнае — вы не трымалі яго на руках! Што тут можна сказаць?

— А муж мой лічыцца хросным?

— Ён — так, бо падчас хрышчэння знаходзіўся ў храме. А вы — не, і не бярыце на сябе больш, чым можаце ўзяць. І ўвогуле муж і жонка не павінны хрысціць адно дзіця. Хросныя бацькі — гэта перш за ўсё духоўная еднасць!

— Дзякуй, што патлумачылі!

☎— Дзень добры! Віктар Васільевіч турбуе з Жыткавіцкага раёна. Скажыце, калі чалавек памёр, праз які час трэба ставіць агароджу вакол магілкі?

— Праз год, або бліжэй да гадавіны.

— А раней нельга?

— А калі памёр ваш сваяк?

— У студзені. І мы хацелі паставіць ужо агароджу…

— Не, да Радаўніцы яе адназначна ставіць нельга.

— І яшчэ… Ён быў самагубцам, а да такіх царква не надта літасцівая…

— Такая праблема паўстае вельмі часта. Але ёсць на працягу года адзін дзень — гэта субота перад Тройцай — калі спакон веку нашы продкі паміналі «задушных», заўчасных памерлых, тых, хто скончыў жыццё самагубствам. Вось да гэтага часу ўжо і можна будзе паступова пачынаць афармляць прастору вакол магілы так, як вы плануеце.

☎— Тэлефануе Ірына Іванаўна з Нясвіжскага раёна. У нас памёр тата, хутка будзе 40 дзён. Ці можна нам асвячаць усё веліконадае?

— Не, нельга!

— А ці можам мы раманта-ваць сваю кватэру ў гэтым годзе — тата там не жыў, ён жыў асобна?

— У сваёй кватэры можна праводзіць рамонт, калі ласка.

— А яшчэ — мы саджалі дзяцей за памінальны стол…

— Дзяцей не садзяць разам з дарослымі за памінальны стол. Для іх накрываюць асобны стол, пажадана — у асобным памяшканні. І не даюць ім есці жалобную куццю, якую ядуць дарослыя — проста кормяць дзяцей звычайным абедам.

— А як гэту сітуацыю цяпер выправіць?

— Ніяк — што зроблена, тое зроблена. Вы крыху скарацілі век гэтым дзеткам.

☎— Мяне завуць Іна, тэлефаную з Мінска. У вашай кнізе «Залатыя правілы народнай культуры» падрабязна напісана, як праводзіць уваходзіны ў новы дом. А калі засяляешся ў кватэру, дзе да гэтага ўжо жылі нейкія людзі — што трэба рабіць? Якімі правіламі карыстацца?

— Ад гэтага статус самога жытла не мяняецца — для вас яно ўсё роўна «новае». Я не ведаю вашай сітуацыі, але добра было б, каб людзі, якія выязджалі з гэтай кватэры, вымылі б за сабой падлогу. Ёсць такая магчымасць?

— Не. Мы купілі кватэру пасля таго, як гаспадары ўжо з'ехалі.

— Значыць, трэба ўзяць вады, вымыць усю кватэру, а пасля вынесці і выліць гэту ваду і выкінуць тое, чым вы мылі падлогу і ў чым была вада. Зразумелі? Вы зробіце ўсё тое, што павінны былі зрабіць тыя людзі, якія выехалі. А калі ўжо будзеце засяляцца, рабіце ўсё так, быццам гэта — новая кватэра. Па-першае, трэба выбраць добры дзень, каб на небе быў маладзік, малады Месяц... Было б нядрэнна, каб напярэдадні ў сваім ранейшым доме вы зварылі кашу — салодкай ці салёнай, няма розніцы... Прыйдзіце ў гэты новы дом, пасадзіце сваю сям'ю за стол, з'ешце гэту кашу і пажадайце сабе шчасця! І яшчэ адзін момант: трэба, каб перад тым, як будзеце ўваходзіць у новым дом, у вас у кішэнях ляжала крыху жыта і крыху дробных грошай. Увайшлі — кінье іх на падлогу, і жыта, і грошыкі, зрабіце «засеўкі». Няхай паляжаць, пакуль вы пасядзіце за сталом і з'ясце кашу. З гэтага дня дом будзе лічыцца вашым незалежна ад таго, застаняцеся вы там начаваць ці не.

— І яшчэ пытанне. Ці важна, каб браты ў сям'і жаніліся па старшынству?

— Так, хацелася б. У адваротным выпадку малодшы «перакрывае» дарогу да шлюбу старэйшаму.

Святлана БАРЫСЕНКА, Наталля КАРПЕНКА.
(Працяг будзе.)

На слыху

К і В сядзелі на траве, З упала... што прапала?

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь паставіў кропку ў спрэчцы вакол таварнага знака «КВЗ». Аб гэтым старшня праўлення МГА «Беларускі КВЗ» Андрэй Мукавозчык расказаў на мінулым тыдні падчас сустрэчы з журналістамі.

Нагадаем, спрэчка з расійскім тэлевізійным творчым аб'яднаннем «АМіК» наконт таго, ці з'яўляюцца тры літары таварным знакам і ў чыёй уласнасці ён знаходзіцца, ідзе з зімы гэтага года. Фармальнай нагодай для «высвятлення адносінаў» паслужыла праграма «Вось дык шоў», якая выходзіць у Беларусі на Першым канале. Удзел у ёй бяруць некаторыя гульцы камандаў КВЗ, што «засвяціліся» ў афіцыйных лігах Міжнароднага саюза КВЗ. А гэта, паводле новай рэдакцыі ўказа старшыні МС КВЗ Аляксандра Маслякова, забаронена рабіць без спецыяльнага дазволу, які выдаецца ў кожным канкрэтным выпадку. (Што адметна — ніводнага такога дазволу ніводная беларуская каманда не атрымала.)

Расійскі бок, як сведчыць афіцыйная перапіска, запатрабаваў ад беларусаў «спыніць выкарыстанне таварнага знака «КВЗ» у любым выглядзе і ў любой форме», пісьмова пацвердзіць гэта і не выкарыстоўваць брэнд у далейшым без узгаднення. У сваю чаргу, беларусы ў спробах высветліць, каму належыць таварны знак «КВЗ», звярнуліся ў Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці, а там і ў Вярхоўны Суд Беларусі. 23 красавіка было агучана рашэнне апошняй інстанцыі. Судовая калегія па справах інтэлектуальнай уласнасці ўстанавіла, што абазначэнне «КВЗ» увайшло ў агульны ўжытак як абазначэнне паслуг, звязаных з гульнёй КВЗ, і, улічваючы доўгі тэрмін выкарыстання рознымі людзьмі і арганізацыямі, згубіла адрозную здольнасць. Таму «абазначэнню «КВЗ» не можа быць прадастаўлена прававая ахова на імя аднаго з многіх магчымых карыстальнікаў… Абазначэнне можа свабодна выкарыстоўвацца рознымі асобамі». Такім чынам, КВЗ належыць усім і не належыць нікому. З адной істотнай агаворкай: на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі ён можа быць прадастаўлены ў выключнае карыстанне толькі аднаасобніку, які ўпершыню пачаў выкарыстоўваць яго ў Расіі. Гэта значыць, што ў Расіі ніхто, акрамя Аляксандра Маслякова, не можа ні выкарыстоўваць, ні распараджацца гэтым брэндам.

Тым не менш, у сакавіку беларусы напісалі на імя Аляксандра Маслякова ліст з просьбай праясніць сітуацыю. Для гэтага ёсць важная прычына. Сёлета падчас Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» запланавана правесці музычны фестываль камандаў КВЗ. Аднак амаль дзесяць камандаў, якія гуляюць у афіцыйных лігах пад эгідай ТТА «АМіК», паводле новых правілаў, не змогуць у ім удзельнічаць без дазволу. «Я не прыхільнік таго, каб правядзенне такога роду мерапрыемстваў ставілася пад пагрозу, бо тут ужо будуць задзейнічаныя і Першы канал, і Міністэрства культуры, і дырэкцыя фестывалю, — кіпяціцца Андрэй Мукавозчык. — З якой прычыны ўвогуле беларускія каманды павінны прасіць дазволу на тое, каб выступіць у сябе ў Беларусі, у расійскай арганізацыі? Гэта ж умяшанне ва ўнутраныя справы!». Акрамя таго, па дамоўленасці з Саюзам моладзі Пецярбурга, беларусы паспрабавалі выйсці на адзін з рэгіянальных тэлеканалаў. У эфір трапілі некалькі гульняў «Еўралігі КВЗ» (Мінск) і «Лігі «Зеніт» (Санкт-Пецярбург), на працягу гэтага года запланавана паказаць увесь сезон гульняў. Але ці ўдасца гэта зрабіць — іншае пытанне. Аказваецца, і на тэлеканал, і на расійскія каманды-ўдзельніцы аказваецца ціск з боку зацікаўленых асобаў — маўляў, гэта несапраўдны, «неафіцыйны» КВЗ, таму лепш прыкрыць яго на ўсякі выпадак.

Зрэшты, пакуль ніякага адказу, ні станоўчага, ні адмоўнага, з Масквы не атрымана, гаварыць пра развіццё сітуацыі заўчасна. «Мы плануем гуляць у КВЗ, нават калі гэта будзе няпроста», — абвяшчае член праўлення беларускага КВЗ Сяргей Сербун. Гэта значыць, што да новага тэлевізійнага сезона рыхтуецца працяг «Вось дык шоў!», а днямі ў Мінску адбыліся гульні 1/4 фіналу Еўралігі КВЗ — адкрытага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, удзел у чэмпіянаце, акрамя беларускіх камандаў, бяруць КВЗшнікі з Прыбалтыкі, Малдовы, Санкт-Пецярбурга. А на пачатку лета або ўвосень абяцала ўсё ж такі наведаць беларускую сталіцу знакамітая каманда «Павятовы горад», вясновае выступленне якой было адменена.

— Ходзяць чуткі, што «Павятовы горад» не прыехаў усё з-за тых жа забарон з Масквы? — пацікавіліся мы ў Андрэя Мукавозчыка.

— Гэта адбылося з-за недакладных фармулёвак і з нашага, і з іхняга боку. Мы размаўлялі з капітанам каманды і цяпер ужо дакладна дамовіліся аб выступленні. Наконт таго, што прыехаць ім перашкаджалі праблемы з AMiK, не было сказана ні слова.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

АНТЫСЕМІТЫЗМ: КРЫВАВАЯ ГІСТОРЫЯ ПАКУТ

Новыя падыходы ў вывучэнні гісторыі вайны прадэманстраваў унікальны беларуска-нямецкі праект па сумесным даследаванні жудаснай праўды Халакоста на тэрыторыі Беларусі

Чаму менавіта з Мінска прагучала папярэджванне Еўропе аб небяспецы сучаснага антысемітызму?

— Майго 19-гадовага сваяка, які жыве ў невялікім гарадку на поўдні Францыі, летась аднойчы вечарам сустрэлі шасцёра нецвярозых маладых мярзотнікаў. Яны накінуліся на яго з кулакамі. Білі доўга і жорстка. Але ім гэтага падалося недастаткова. Тады яго зацягнулі на кватэру і некалькі гадзін працягвалі здзекавацца. Хлопца катавалі да самай раніцы, прымушалі есці недакуркі цыгарэт... Паліцыя зараз шукае злачынцаў, а сваяк ужо больш за паўгода знаходзіцца ў бальніцы.

Гэта ўрывак з дакументальнага тэатралізаванага паказу яўрэйскага студэнцкага цэнтра «Гілель» для ўдзельнікаў міжнароднай канферэнцыі «Антысемітызм у сучаснай Еўропе». Падобныя факты, як цікава і пераканаўча паказалі мастацкімі сродкамі самадзейныя артысты, далёка не адзінкавыя ў Еўропе. У той жа Германіі штогод рэгіструюцца сотні выпадкаў праяў антысемітызму. Да чаго гэта аднойчы прывяло ў свеце пасля прыходу да ўлады Гітлера — агульнавядома.

На першы погляд ідэя правесці ў Мінску міжнародную канферэнцыю па сучасным антысемітызме здаецца небяспрэчнай. Ці гэта ў нас сёння назіраюцца масавыя праявы ксенафобіі? Ці гэта ў нас антысемітызм выклікае вялікую заклапочанасць еўрапейскай грамадскасці? Вядома, не.

Але з іншага боку, Беларусь якраз тое месца, дзе ёсць важкая нагода яшчэ раз задумацца аб прычынах узнікнення нацызму і яго катастрафічных у глабальных маштабах наступствах для чалавецтва, аб сучасных пагрозах ідэалогіі фашызму, якая дзе-нідзе ўздымае галаву ў Еўропе, як у той жа Германіі.

Нарэшце з Мінска сёння самы час нагадаць еўрапейцам, што ў Другую сусветную вайну было знішчана амаль 800 тысяч беларускіх яўрэяў. Толькі ў Мінскім гета, дарэчы, адным з самых вялікіх у тагачаснай Еўропе, утрымлівалася больш за 100 тысяч вязняў. А ўсяго ў лагерах смерці мэтанакіравана, на планавай аснове нацысцкімі катамі былі забіты і закатаваны 60 працэнтаў яўрэяў Еўропы і прыкладна 35 працэнтаў яўрэйскага насельніцтва планеты. Але ўсё ж галоўнай прычынай выбару беларускай сталіцы месцам канферэнцыі стаў юбілей, дакладней, неабходнасць падвесці вынікі вышэйзгаданага беларуска-нямецкага праекта.

Пяць гадоў таму я прысутнічаў на цырымоніі адкрыцця на тэрыторыі былога Мінскага гета міжнароднага даследчага цэнтра па вывучэнні Халакоста. Яго назвалі «Гістарычная майстэрня ў Мінску». Прызнаюся, тады мне гэты праект здаўся крыху надуманым і ў пэўным сэнсе прапагандысцкім ходам Германіі.

Але за словамі былі справы. Іх усе нават цяжка пералічыць. На рахунку майстэрні, напрыклад, адукацыйная праграма «Вайна на Беларусі: рэгіянальная гісторыя», семінары «Беларусь у Другой сусветнай вайне», архіўная практыка: «Жывыя сведкі аб вайне: праўдзівыя гісторыі жыцця», гістарычныя экскурсы «Халакост асяроддзя», «Беларуска-германскія архівалii: праблемы дакументальнай гісторыі Другой сусветнай вайны», «Гісторыя пакут: Мінскае гета 1941—1943 гг.». Пад дахам майстэрні адбыўся шэраг фотавыставак: «Час Перамогі — Час памяці», «Генацыд у Беларусі: Хатынь, Мінскае гета, Трасцянец», «Змаганне за жыццё», «Мінскае гета: апошні час з жыцця нямецкіх яўрэяў». Па ініцыятыве актыву майстэрні свет убачыла 21 выданне па гісторыі Халакоста, была створана тэматычная бібліятэка. У яе фондзе больш за тры тысячы выданняў беларускіх і замежных аўтараў, розных даведнікаў на тэму вайны.

За гады існавання майстэрні яе наведалі больш за 10 тысяч чалавек з 28 краін: Ізраіля, Германіі, Канады, ЗША, Аўстраліі, Аўстрыі, Аргенціны, Вялікабрытаніі, Японіі, Кітая і іншых. Сёння ў майстэрні часта сустракаюцца сталыя і маладыя гісторыкі, даследчыкі Беларусі і Германіі, ідуць дыскусіі і зацікаўленыя абмены інфармацыяй і думкамі, разам распрацоўваюцца новыя канкрэтныя тэмы. Вось і цяпер на юбілей прыйшлі тыя, каму дазволіла здароўе, з сотні вязняў Мінскага гета, якія засталіся жывымі.

Гістарычная майстэрня была створана ў адноўленым памяшканні цудам ацалелага аднапавярховага драўлянага дома даваеннай забудовы па вуліцы Сухая, 25 на сродкі праграмы федэральнага ўрада Германіі па прапанове Дортмундскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра. Менавіта яго прадстаўнікі ініцыявалі правядзенне ў Мінску канферэнцыі па антысемітызму. Гэта прапанова знайшла падтрымку Саюза беларускіх яўрэйскіх аб'яднанняў і ўладаў Мінска.

Цікавую інфармацыю ў час юбілейных мерапрыемстваў паведаміў старшыня агульнага сходу Дортмундскага адукацыйнага цэнтра Герберт Вальхютэр, які некалькі тыдняў таму патрапіў на беларускі след аднаго нямецкага яўрэя Фрыца Рапольта. Толькі праз дзесяцігоддзі стаў вядомы лёс гэтага чалавека. Яго жыццёвы шлях абарваўся ў час ліквідацыі карнікамі Мінскага гета. Нядаўна каля дома ў Гамбургу, дзе некалі жыла сям'я Рапольтаў, з'явілася мемарыяльная дошка. Гэта акцыя — адзін з эпізодаў нацыянальнай кампаніі ў Германіі па захаванні памяці аб ахвярах Халакоста. Такім чынам атрымаўся своеасаблівы ланцужок Гамбург—Мінск, гаворыць Г. Вальхютэр.

Адзін з важных вынікаў пяцігадовай дзейнасці гістарычнай майстэрні — гэта спісы прозвішчаў яўрэяў, якія былі дэпартаваныя з фашысцкай Германіі ў Мінск і не вярнуліся дамоў. А пра лёсы колькіх яўрэяў, вывезеных нацыстамі з Гамбурга, Брэмена, Кёльна, Аўстрыі і іншых краін акупаванай Еўропы, нічога невядома? Колькі яшчэ звёнаў такіх ланцужкоў можна аднавіць?

Таму, на думку кіраўніка Дортмундскага цэнтра Петэра Юнге-Вэнтрупа, трэба абавязкова працягваць гэты праект, заахвочваць гісторыкаў на далейшы працяг даследаванняў і асэнсавання ваенных падзей.

Я неаднойчы пераконваўся ў тым, што ў сумленных немцаў памяць аб нацысцкім мінулым айчыны цяжкім каменем ляжыць на сэрцы. Іх нават засмучае, як, напрыклад, намесніка пасла ФРГ у Беларусі Фрыда Нільсана, і тое, што на нямецкай мове аддаваліся загады па знішчэнні мільёнаў людзей. Ён нагадаў выраз: тыя немцы, якія жылі ў Германіі ў перыяд 1933—45 гадоў, ніколі не змогуць быць шчаслівымі. Праўда, удакладніў дыпламат, гэты выраз актуальны і для немцаў, якія нарадзіліся пасля вайны.

